Адным з найбольш ужываных паняццяў у сусветнай гістарычнай навуцы другой паловы XX ст. стала паняцце «сацыяльная гісторыя». Развіццё гэтага накірунку даследаванняў, а дакладней парадыгмы даследаванняў, як асобнага шляху гістарычнай навуковай думкі, новага канцэптуальнага падыходку у даследаваннях, пачынаецца яшчэ раней – з другой паловы XIX ст. Узнікненне новага напрамку было звязана з агульнымі зменамі, якія адбываліся ў еўрапейскай навуцы таго часу: агульным антрапалагічным паваротам у філасофіі, зараджэннем і развіццём сацыялогіі і псіхалогіі як асобных навук, паглыбленнем міждысцыплінарных сувязяў. Усё гэта накладала свой адбітак на навуковую гуманістыку. У той, ужо даволі адлеглы ад нас перыяд, стала відавочна, што без вывучэння сацыяльных структур, класаў, працэсаў міграцыі і ўрбанізацыі, індустрыялізацыі, немагчыма даць адказ на многія пытанні, ў тым ліку і на пытанні дамінуючай яшчэ ў той час у навуковым дыскурсе палітычнай гісторыі. Цэнтр увагі даследчыкаў паступова пачынае перамяшчаецца з палітычных пытанняў да вывучэння розных бакоў жыцця і сацыяльнага быту канкрэтных катэгорый насельніцтва, саслоўяў, класаў і г. д. Менавіта яны становяцца галоўнымі аб’ектамі даследаванняў. Усё гэта адбываецца на фоне фарміравання сучасных нацый у Еўропе, фарміравання грамадзянскіх супольнасцяў.

У асобны і самастойны, а пазней нават інстытуцыялізаваны напрамак, са сваімі даследчымі цэнтрамі і кафедрамі, сацыяльная гісторыя выдзяляецца з 1930-х гг. З 60-х гг. XX стагоддзя адным з асноўных паняццяў парадыгмы сацыяльнай гісторыі становіцца паняцце «сацыяльная структура». На вывучэнне сацыяльных структур, пад якімі часта разумеюць класы, саслоўі, страты грамадства і інш., гісторыкі ўсё больш скіроўваюць сваю увагу. Пры гэтым сацыяльная гісторыя сёння ўключае у сябе таксама і гістарычную дэмаграфію і даследаванне гендэрнай гісторыі і ўрбаністыку.

Яна стала і застаецца, калі можна так сказаць, мэйнстрымам у гістарычных даследаваннях, які дае новыя магчымасці для пазнання мінулага, змяняе стаўленне даследчыкаў да праблем і аб'ектаў даследавання, дазваляе ўбачыць і зразумець глыбінныя сацыяльныя змены ў грамадстве, якія як аснова вызначаюць палітычныя і эканамічныя трансфармацыі. Можна казаць таксама пра тое, што сацыяльная гісторыя – гэта напрамак даследванняў, дзе даследчык імкнецца выявіць сацыяльныя перадумовы гістарычных працэсаў ва ўсёй іх складанай сістэме ўзаемазалежнасцяў і ўзаемаабумоўленасцяў.

Разам з тым, паняцце «сацыяльная гісторыя» мае даволі расплыўчатае вызначэнне. Калі казаць абагулена, гісторыкі, якія займаюцца вывучэннем сацыяльнай гісторыі, вывучаюць гісторыю «сацыяльнага» у гістарычнай рэтраспектыве. У пэўнай ступені, са значнымі дапушчэннямі, сацыяльная гісторыя як накірунак, стыкуецца з гістарычнай сацыялогіяй – накірункам у сацыялогіі скіраваным на даследаванне мінулага інструментарыем сацыёлагаў. Пры гэтым два накірункі вувучэння «сацыяльнага» у мінулым, захоўваюць характэрную для сябе метадалогію. Наяўнасць метадалагічных падыходаў двух навук, аднак, ва ўмовах узмацняючыхся інтэрдысцыплінарных сувязяў, ужо не з'яўляецца перашкодай для паспяховай навуковай дзейнасці. З іншага боку, прымяненне падыходаў сацыялогіі да даследаванняў, дзе дапускаецца тэарэтызаванне над мінулым, нярэдка выклікае крытыку з боку гісторыкаў. Гісторыкі традыцыйна ў першую чаргу абапіраюцца на гістарычныя факты, а не на пабудаваныя у адарванасці ад факту тэарэтычныя разважанні.

Заснавальнікам навуковай школы сацыяльнай гісторыі Беларусі яшчэ ў міжваенны час мог бы стаць выдатны беларускі гісторык Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі. Яго работа «История Белоруссии», падрыхтаваная якраз у перыяд яго працы ў БДУ, з'яўлялася пэўным сінтэзам вывучэння пытанняў сацыяльнай і палітычнай гісторыі. У рукапісе работы, сярод іншых, былі раздзелы «Сацыяльны лад», «Народное хозяйство и роль в нём крестьянства», «Очерк народного хозяйства последнего десятилетия», «Рэвалючыйны і рабочы рух». На вялікі жаль, у сувязі з абвінавачваннямі ў нацыянал-дэмакратызме, вучоны ў 1926 г. вымушаны быў пакінуць Беларусь, а рукапіс выдатнага, як на свой час, даследавання быў аддадзены з архіўнага сховішча ў друк толькі ў 2003 г. [5].

Пасля М. В. Доўнар-Запольскага ў даваеннай беларускай савецкай гістарыяграфіі праблематыцы сацыяльнай гісторыі не надавалася значная ўвага. Толькі з 1950-х гг. пачынаюць праводзіцца даследаванні натуральнага руху насельніцтва ў Беларусі, прычым цікавіліся гэтай праблемай пераважна эканамісты і сацыёлагі, у прыватнасці Андрэй Андрэевіч Ракаў.

Марксісцка-ленінская метадалогія панавала цалкам, што не пакідала шанцаў на паяўленне ў сценах дзяржаўных навуковых устаноў работ, якія б не ўпісваліся ў яе строгія рамкі. У блізкім напрамку да сацыяльнай гісторыі магло б развівацца вывучэнне рабочага руху і рабочага класу, часткова сялянства, але і гэтыя работы павінны былі быць строга ўбудаваны ў вызначаны ідэалагічны шаблон – росту колькасці пралетарыяту і адпаведнага нарастання класавай барацьбы, што фактычна не давала магчымасцяў гісторыкам для самастойнага даследчага пошуку. Нельга аднак, цалкам адмаўляць у навуковай вартасці работам гісторыкаў таго перыяду, хаця б па прычыне выяўлення і апрацоўкі імі значнага пласта гістарычных крыніц.

Толькі ў 1960–80-я гг. можна убачыць цікавасць асобных даследчыкаў у сценах універсітэта да аспектаў сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XXI ст. Сюды можна аднесці работы загадчыка кафедры гісторыі БССР Валянціны Уладзіміраўны Чапко: «Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в.» Минск, (1966) [21], «Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX века» (1972) [20], «Города Белоруссии в первой половине XIX века : экономическое развитие» (1981) [19]. Але і гэтыя работы па вядомых прычынах не маглі выйсці за ўстаноўленыя ідэалагічныя межы.

Непасрэдна вывучэнне пытанняў сацыяльнай гісторыі Беларусі на гістарычным факультэце БДУ выдзяляецца ў адзін з асноўных напрамкаў правядзення гістарычных даследаванняў толькі з канца 1980-х гг. Адкрыліся новыя далягляды для творчасці прадстаўнікоў гуманітарных і грамадскіх навук, адкрываліся новыя даследчыя гарызонты для выбару як тэматыкі даследаванняў, так і новых тэарэтычных падыходаў і метадаў даследавання.

Кафедра гісторыі Беларусі (у савецкі перыяд кафедра гісторыі БССР існавала з 1958 г., першым яе загадчыкам быў Лаўрэнці Сямёнавіч Абецэдарскі), адна з першых пачала паглыблена распрацоўваць пытанні звязаныя з гісторыяй сацыяльных структур і сацыяльных груп насельніцтва Беларусі, прымяняючы новыя метады даследавання. У гэтым напрамку сталі працаваць тады яшчэ маладыя даследчыкі кафедры А. Г. Каханоўскі (кандыдацкая дысертацыя Сацыяльна-класавая структура насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX ст. (дыс. 1989.) [8] і П. А. Лойка (Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі. Эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI–XVIII стст. 1991.) [10].

Паказальна, што ў 1994 г. у сувязі з пашырэннем і паглыбленнем вывучэння курса айчыннай гісторыі ў БДУ, кафедра гісторыі Беларусі была падзелена на дзве: кафедру гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, якую да 2006 г. узначальваў доктар гістарычных навук П. А. Лойка і

кафедру гісторыі Беларусі новага і навейшага часу, якую да 1999 г. ўзначальваў прафесар П. І. Брыгадзін. У выніку істотна павялічыўся колькасны склад супрацоўнікаў кафедр, значна пашыралася праблемнае поле даследаванняў, у тым ліку і за кошт праблематыкі сацыяльнай гісторыі Беларусі.

З 1999 г., калі кафедру гісторыі Беларусі новага і навейшага часу ўзначаліў тады яшчэ кандыдат навук, а на цяперашні час ужо прафесар і доктар навук А. Г. Каханоўскі, яе склад пачынае папаўняцца цэлай плеядай маладых даследчыкаў, якія ўсклалі на сябе абавязак даследавання новых недаследаваных гарызонтаў беларускай мінуўшчыны. У выніку, у першую чаргу намаганнямі А. Г. Каханоўскага, за апошнія ўжо больш чым два дзесяцігоддзі на кафедры сфарміраваўся і працягвае развівацца навуковы накірунак, які пераўтварыўся ў адмысловую школу сацыяльнай гісторыі Беларусі Новага і Навейшага часу пад кіраўніцтвам А. Г. Каханоўскага. Пры гэтым на кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу па-ранейшаму працягнулі развівацца і іншыя напрамкі – станаўленне беларускай дзяржаўнасці, гісторыя палітычных партый, грамадскіх арганізацый і рухаў, канфесійная гісторыя Беларусі XIX–XXI стст., ваенна-палітычныя працэсы ў Беларусі і гісторыя Вялікай Айчыннай вайны.

Пад навуковым кіраўніцтвам ці кансультаваннем прафесара А. Г. Каханоўскага былі падрыхтаваны некалькі важных для беларускай гістарычнай навукі работ па сацыяльнай гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст., выдадзена некалькі манаграфій і больш за дзясятак калектыўных манаграфій, было рэалізавана некалькі навукова-даследчых тэм. Сярод абароненых пад кіраўніцтвам А. Г. Каханоўскага работ можна адзначыць работы А. Л. Дашкевіча «Маладзёжны рух Беларусі 30 – пачатку 60-х гадоў XIX ст.» (2003) [4], В. С. Макарэвіча «Дробная шляхта Беларусі ў 30–60-я гг. XIX ст.: склад і эвалюцыя сацыяльна-прававога становішча» (2008) [11], Г. І. Маскевіч «Сацыяльная стратыфікацыя сялянства Беларусі ў 60–90-я гг. XIX ст.» (2012) [13], А. В. Бурачонка «Развіццё прадпрымальніцтва ў фабрычна-заводскай вытворчасці Беларусі (1861–1914 гг.)» (2013) [2].

У 2013 г. свет убачыла манаграфія прафесара А. Г. Каханоўскага «Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.)», выданне якой стала значнай навуковай падзеяй [7]. На аснове комплекса гістарычных крыніц аўтарам былі даследаваны накірункі і змест трансфармацыйных працэсаў у беларускім грамадстве у другой палове XIX – пачатку XX ст. У даследаванні была нададзена значная ўвага характарыстыцы эвалюцыі саслоўна-карпаратыўнай арганізацыі насельніцтва, працэсам сацыяльнай і тэрытарыяльнай мабільнасці розных груп насельніцтва Беларусі, станаўленню класаў буржуазнага грамадства, а таксама некаторым іншым пытанням сацыяльнай гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст.

У 2015 г. у капілку кандыдацкіх дысертацый, якія былі падрыхтаваны пад кіраўніцтвам А. Г. Каханоўскага, лягла работа Артура Андрэевіча Кухарэнкі «Дзейнасць Сялянскага пазямельнага банка на тэрыторыі Беларусі», у 2017 г. яшчэ дзве: Д. П. Брыгадзіна «Преступность в Беларуси во второй половине XIX – начале XX в.» (2017) [1] і А. І. Стралені «Деятельность земских начальников на территории Беларуси (конец XIX в. – 1914 г.)» (2017) [18]. У 2018 г. у рамках работы, якая вядзецца па вывучэнні сацыяльных структур, была падрыхтавана манаграфія аўтара гэтага артыкула «Разбор шляхты ў беларускіх губернях Расійскай імперыі (канец XVIII–XIX ст.)». У манаграфіі на фоне рэалізацыі ўладамі Расійскай імперыі палітыкі разбору шляхты, разглядаецца працэс эвалюцыі прававога і сацыяльнага статусу катэгорый дробнай шляхты, трансфармацыі саслоўных і сацыяльных структур звязаных з гэтай, не такой ужо і малой, часткай беларускага грамадства, даследуецца рэакцыя шляхты Беларусі на палітыку разбора шляхты [12].

У 2020 г. ўбачыла свет работа яшчэ аднаго прадстаўніка школы, які паспяхова абараніў у выніку і доктарскую дысертацыю пад навуковай апекай Аляксандра Генадзьевіча Каханоўскага, работа Надзеі Сяргееўны Маторавай «Сацыяльная палітыка Расійскай імперыі на тэрыторыі Беларусі (1861–1914)» [15]. Аўтар зрабіў вялізны ўклад у вывучэнне маладаследаванай тэмы сацыяльнай палітыкі Расійскай імперыі ў Беларусі ў паслярэформены перыяд. У 2021 г. даследчык абараніў доктарскую дысертацыю.

Сёння на кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу праблемы сацыяльнай гісторыі Беларусі XIX–XX ст. у значнай ступені ўваходзяць у сферу навуковых даследаванняў большасці яе супрацоўнікаў. Сацыяльная гісторыя Беларусі як асобная дысцыпліна стала часткай вучэбных планаў падрыхтоўкі спецыялістаў на гістарычным факультэце. Узніклі такія дысцыпліны як «Сацыяльная гісторыя Беларусі», «Грамадства і ўлада», «Гісторыя прадпрымальніцтва», «Гісторыя моды», «Гістрычная дэмаграфія» і інш. На дадзены момант удзельнікі школы працуюць над падрыхтоўкай падручніка па дысцыпліне «Сацыяльная гісторыя Беларусі», актыўна ўдзельнічаюць ў падрыхтоўцы акадэмічных навуковых выданняў разам са спецыялістамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі [15].

Тэматыка дысертацыйных работ і артыкулаў многіх дактарантаў і аспірантаў кафедры таксама кладзецца ў агульную канву вывучэння сацыяльных аспектаў гісторыі Беларусі ў рамках склаўшайся на кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу школы сацыяльнай гісторыі Беларусі Новага і Навейшага часу. У 2020 г. Святлана Алегаўна Сідарава скончыла работу над падрыхтоўкай дысертацыі «Развіццё паштова-тэлеграфнай сувязі на тэрыторыі Беларусі (80-е гг. XIX в. – 1914 г.)» і паспяхова яе абараніла [17]. Кандадацкая дысертацыя прысвечаная даследаванню са-

цыяльнага становішча рабочых Беларусі пачатку XX ст. была падрыхтавана аспірантам кафедры Я. В. Маслоўскім [14], ў 2020 г. Кароль М. М. абараніла кандыдацкую дасертацыю па праблеме міжканфесійных пераходаў у Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. [6], іншымі аспірантамі, суіскальнікамі і дактарантамі кафедры: І. Лебедзевай [9], Т. Шчэрбай [22], Т. Вароніч [3] і іншымі маладымі даследчыкамі актыўна вядзецца навуковая работа па распрацоўцы пытанняў сацыяльнай гісторыі Беларусі. За апошнія гады выдадзена некалькі дзясяткаў навуковых артыкулаў, прысвечаных разнастайным аспектам сацыяльнай гісторыі Беларусі Новага і Навейшага часу. Навуковыя даследаванні школы па-ранейшаму накіраваны на вывучэнне трансфармацыйных працэсаў і сацыяльных змяненняў у беларускім грамадстве ў канцы XVIII–XX стст.: эвалюцыі саслоўна-карпаратыўнай структуры насельніцтва, дэмаграфічных працэсаў, тэрытарыяльнай і сацыяльнай мабільнасці насельніцтва ў канцы XVIII–XX стст., што адпавядае прыярытэтным напрамкам навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь: сацыягуманітарная, эканамічная і інфармацыйная бяспека (чалавек, грамадства і дзяржава, гісторыя, культура, адукацыя, турызм, кіраванне сацыяльнымі працэсамі).

Бібліяграфічны спіс

1. *Бригадин, Д. П.* Преступность в Беларуси во второй половине XIX – начале XX в.: Дисс. на соиск. учён. степ. канд. ист. наук: 07.00.02. – Минск, 2017.

2. *Бурачонак, А. В.* Развіццё прадпрымальніцтва ў фабрычна-заводскай вытворчасці Беларусі (1861–1914): Дыс. на суіск. вучон. ступ. канд. гіст. навук: 07.00.02. – Мінск, 2012.

3. *Вороніч, Т. В.* Административно-полицейское регулирование проституции в городах Беларуси: вторая половина XIX – начало XX в. // Журнал Белорусского государственного университета / учредитель Белорусский государственный университет. – 2019. – № 1. – С. 46–56.

4. *Дашкевіч, А. Л.* Маладзежны рух Беларусі 30 – пачатку 60-х гг. XIX ст.: Дыс. на суіск. вучон. ступ. канд. гіст. навук: 07.00.02. – Мінск, 2003.

5. *Довнар-Запольский, М. В.* История Белоруссии. Минск, 2003.

6. *Кароль, М. М.* Перавод каталіцкага насельніцтва Беларусі ў праваслаўе (1863–1914).: аўтарэферат дысертацыі на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук: 07.00.02 / М. М. Кароль; Беларускі дзярж. ун-т. Мінск, 2021.

7. *Каханоўскі, А. Г.* Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) / А. Г. Каханоўскі. – Мінск : БДУ, 2013.

8. *Кохановский, А. Г.* Социально-классовая структура народонаселения Белоруссии во второй половине XIX в.: Автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук: 07.00.02. Минск, 1989.

9. *Лебедзева, І. В.* Дзеці ў сацыяльна-эканамічных працэсах на тэрыторыі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст.: гістарыяграфія пытання // История и историография: объективная реальность и научная интерпретация : сб. науч. ст. по материалам междунар. науч. конф., посвящ. 140-летию со дня рождения акад. В. И. Пичеты / редкол.: А. Д. Король (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2018. – С. 276–283.

10. *Лойка, П. А.* Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі. Эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI–XVIII стст. Мінск, 1991.

11. *Макарэвіч, В. С.* Дробная шляхта Беларусі ў 30–60-я гг. XIX ст.: склад і эвалюцыя сацыяльна-прававога становішча: Дыс. на суіск. вучон. ступ. канд. гіст. навук: 07.00.02. Мінск, 2008.

12. *Макарэвіч, В. С.* Разбор шляхты ў беларускіх губернях Расійскай імперыі (канец XVIII–XIX ст.) / В. С. Макарэвіч. – Мінск: БДУ, 2018.

13. *Маскевіч, Г. І.* Сацыяльная стратыфікацыя сялянства Беларусі ў 60–90-я гг. XIX ст.: Дыс. на суіск. вучон. ступ. канд. гіст. навук: 07.00.02. – Мінск, 2011.

14. *Маслоўскі, Я. В.* Рабочыя фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў Беларусі (1907–1914 гг.): склад, матэрыяльнае становішча, формы сацыяльнага пратэсту : аўтарэферат дысертацыі на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук : 07.00.02 / Маслоўскі Яўген Валер'евіч ; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 2001.

15. *Моторова, Н. С.* Социальная политика Российской империи на территории Беларуси (1861–1914) : монография / Н. С. Моторова. – Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2019.

16. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / В. В. Яноўская [і інш.] Мінск, 2020.

17. *Сидорова, С. О.* Развитие почтово-телеграфной связи на территории Беларуси (80-е гг. XIX в. – 1914 г.) : автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата исторических наук / Сидорова Светлана Олеговна; Белорусский государственный университет. – Минск, 2021.

18. *Страленя, А. А.* Деятельность земских начальников на территории Беларуси (конец XIX в. – 1914 г.): Дыс. на суіск. вучон. ступ. канд. гіст. навук: 07.00.02. – Мінск, 2017.

19. *Чепко, В. В.* Города Белоруссии в первой половине XIX века : экономическое развитие. Минск, 1981.

20. *Чепко, В. В.* Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX века. Минск, 1972.

21. *Чепко, В. В.* Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в. Минск, 1966.

22. *Щерба, Т. Н.* Отношение почётных граждан к белорусскому национально-культурному движению в начале XX в. / Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX ст.: матэрыялы міжнар. Навук. канф., Мінск, 29–30 ліст. 2018 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: А. Д. Кароль (старшыня) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2018. – С. 284–286.

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫЯ І САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПАЧАТКУ XX ст.

УДК 94(476)

ПРАЦЭС ФАРМАВАННЯ ЭЛІТ ВА ЎМОВАХ ТРАНСФАРМАЦЫЙНЫХ ПРАЦЭСАЎ У БЕЛАРУСКІМ ГРАМАДСТВЕ Ў КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX стст.

П. Б. Артамонаў

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, pavel.artamonov.17@mail.ru

Дадзены артыкул прысвечаны аналізу працэсу фармавання эліт ва ўмовах трансфармацыйных працэсаў у беларускім грамадстве ў канцы XIX – пачатку XX стст. на аснове шэрагу дакументаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

Ключавыя словы: трансфармацыйныя працэсы; фармаванне эліт; эліты; сацыяльная гісторыя.

ПРОЦЕСС ФОРМИРОВАНИЯ ЭЛИТ В УСЛОВИЯХ ТРАНСФОРМАЦИОННЫХ ПРОЦЕССОВ В БЕЛОРУССКОМ ОБЩЕСТВЕ КОНЦА XIX – НАЧАЛА XX ВЕКА

П. Б. Артамонов

Белорусский государственный университет, 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 4, pavel.artamonov.17@mail.ru

Данная статья посвящена анализу процесса формирования элит в условиях трансформационных процессов в белорусском обществе в конце XIX – начале XX вв. на основе ряда документов Национального исторического архива Беларуси.

Ключевые слова: трансформационные процессы; формирование элит; элиты; социальная история.

THE PROCESS OF FORMATION OF ELITES IN CONDITIONS OF TRANSFORMATION PROCESSES IN BELARUSIAN SOCIETY AT THE END OF THE 19th – EARLY 20th CENTURIES

P. B. Artamonov

Belarusian State University, 220030, Minsk, Nezavisimosti Ave., 4, pavel.artamonov.17@mail.ru

This article is devoted to the analysis of the process of formation of elites in the conditions of transformation processes in Belarusian society at the end of the 19th – beginning of the 20th centuries. based on a number of documents from the National Historical Archive of Belarus.

Keywords: transformation processes; formation of elites; elites; social history.

Канец XIX – пачатак XX стст. на тэрыторыі Беларусі характарызуецца значнымі сацыяльнымі зменамі. У працэсе мадэрнізацыі ва ўсіх слаях грамадства значна высіўся ўзровень пісьменства, знікалі саслоўныя межы, а таксама рос запыт на інстытуалізаваную адукацыю. Пачатак працэсу дэмаграфічнага пераходу, павышэнне сацыяльнай мабільнасці і іншыя трансфармацыйныя працэсы прывялі да некаторай змены фармавання эліт грамадства [1, с.7].

Працэс фармавання эліт ва ўмовах трансфармацыйных працэсаў у беларускім грамадстве ў канцы XIX – пачатку XX стст. зафіксаваны ў цэлым шэрагу дакументальных крыніц, многія з якіх захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі. Найбольшую цікавасць за кошт рэпрэзентатыўнасці ўяўляюць фонды, якія захоўваюць у сабе асабістыя справы, фармулярныя спісы аб службе, справаводчыя перапіскі. Адзін з такіх, напрыклад, фонд № 183: «Мінскі акруговы суд».

Акруговыя суды ў Расійскай Імперыі былі заснаваны паводле судовай рэформы ад 20 лістапада 1864 года і ўваходзілі разам з судовымі палатамі ў склад урадавай сістэмы суда. Акруговы суд уяўляў з сябе калегіяльную ўстанову і складаўся са старшыні, таварышаў старшыні, якія стаялі на чале аддзяленняў, аддзяленняў крымінальных і грамадзянскіх спраў, канцылярыі старшыні, рэгістратуры, касы і архіва. Пры судзе складаліся чыны пракурорскага нагляду, обер-пракуроры, пракуроры і таварышы пракураў, судовыя следчыя, прыватныя павераныя, судовыя прыставы, рассыльныя і натарыят. Акруговы суд засноўвалі на некалькі паветаў губерні ці на ўсю губерню. Яму былі падсудныя ўсе крымінальныя і грамадзянскія справы, канфіскаваныя з ведамства сусветных суддзяў, гэта значыць тыя правіны, за якія «Статутам аб пакараннях» вызначалася грашовае спагнанне звыш трохсот рублёў і зняволенне ў турме звыш аднаго года, непадсудныя справы аб дзяржаўных злачынствах, а таксама злачынствы духоўных і ваенных асоб. На тэрыторыю паўночна-заходніх губерняў дзеянне судовых статутаў 1864 было распаўсюджана толькі ў 1883 годзе. Такім чынам, Мінскі акруговы суд быў заснаваны 30 лістапада 1883 года замест ліквідаванай Мінскай злучальнай палаты крымінальнага і грамадзянскага суда. Ён меў агульную для гэтых устаноў структуру і быў падведамны Віленскай судовай палаце. Ліквідаваны Мінскі акруговы суд быў у 1917 годзе, разам з ліквідацыяй усёй старой сістэмы судоў. У сакавіку 1918 года, пасля акупацыі Мінска войскамі Германскай Імперыі, акруговы суд аднавіў дзейнасць, якая працягнулася да снежня 1918 года.

У сілу сваёй спецыфікі, а менавіта часу існавання, месцы ў структуры судовай улады, відавочную атрыбутыку сацыяльнага ліфта, матэрыялы дадзенага фонду здольныя на належным узроўні раскрыць тэму працэсу

фармавання эліт ва ўмовах трансфармацыйных працэсаў у беларускім грамадстве канца XIX – пачатку XX стст.

Доўгі час значнае месца ў традыцыйнай іерархіі чыноўнікаў Расійскай Імперыі адыгрывала становішча ў табелі аб рангах. Чын стацкага саветніка аб'ядноўваў пад сабой вышэйшую наменклатуру царскіх чыноўнікаў, якія мелі непасрэднае дачыненне да распрацоўкі і рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі. З асабістай справы Івана Іульянавіча Максімовіча можна зрабіць выснову аб мелай месца быць запаволенай сацыяльнай мабільнасці ў пачатку мадэрнізацыйных працэсаў, а таксама залежнасці становішча ў кар'ернай іерархіі ад іерархіі чыноў: чын стацкага саветніка ён атрымаў у 1896 годзе, на 52 годзе жыцця, а пасаду гарадскога суддзі Пінска заняў у 1901 годзе [2, арк. 3–7]. Іван Максімавіч быў сынам святара з Чарнігаўскай губерні (што таксама характэрна адлюстраваннем тэндэнцыі да прызначэння на вядучыя пасады мясцовай адміністрацыі немясцовай эліты), таму судзейская кар'ера стала для яго сацыяльным ліфтам у вышэйшае свецкае грамадства [2, арк. 3]. З ростам дзяржаўнага апарата да пачатку XX стагоддзі ўсё большае значэнне набываюць асабістыя якасці, прафесійныя кампетэнцыі і адукаванасць. Калі раней для руху па кар'еры было дастаткова хатняй адукацыі [2, арк. 3], то зараз у годным святле паўстаюць перспектыўныя выпускнікі вышэйшых навучальных устаноў, як напрыклад Сцяпан Білялавіч Мурза-Мурзавіч – старэйшы кандыдат на судовыя пасады, беларускі татарын, патомны дваранін і выпускнік юрыдычнага факультэта Санкт-Пецярбургскага Імператарскага ўніверсітэта [3, арк. 33].

Актуальнай праблемай тагачасных элітаў была карумпаванасць. З вышэйзгаданай справы Івана Іульянавіча Максімовіча (на момант 1908 года ўжо Пінскага натарыуса, бо судзейскі пост ён пакінуў па ўласным жаданні [2, арк. 8]) вынікае, што ў 1908 годзе ён скончыў жыццё самагубствам каб пазбегнуць ганьбы і захаваць гонар сям'і з прычыны растраты даручаных яму па службе грошаў. Гэта, ваенныя дзеянні Першай сусветнай вайны, а таксама некаторыя іншыя фактары прывялі да люстрацый элітаў пасля падзей 1917 года. 12 мая 1918 года, падчас аднаўлення дзейнасці Мінскага акруговага суда акупацыйнымі ўладамі, Мікалай Рамановіч Маркевіч, малодшы кандыдат на судовыя пасады, які да эвакуацыі суда займаў пасаду ў другім стале першага грамадзянскага аддзялення, у прашэнні таварышу старшыні па грамадзянскім аддзяленні Мінскага акруговага суда пісаў наступнае: «У сувязі з адсутнасцю якіх бы там ні было сродкаў да існавання, я знаходжуся ў вельмі безвыходным становішчы. У цяперашні час, з сыходам Рэуцкага, у даручаным Вашаму старшыняванню грамадзянскай філіі маецца вакансія канцылярскага служыцеля, а таму маю гонар прасіць Вашага хадайніцтва перад Спадаром старшынёй аб прадастаўленьні мне сказанай пасады. Пры гэтым маю гонар далажыць, што служу па грамадзянскім аддзяленні з 5 лютага 1915 года, атрымліваючы

канцылярскі аклад і раней, якога я цяпер пазбаўлены» [4, арк. 2]. Лёс Мікалая Маркевіча пасля снежня 1918 года з наяўных матэрыялаў справы невядомы. З вышэйапісанага можна зрабіць выснову аб маргіналізацыі пасля 1917 часткі люстраванай эліты.

Іншыя тэндэнцыі працэсу фармавання эліт ва ўмовах трансфармацыйных працэсаў можна таксама прасачыць і па дакументальных крыніцах іншых фондаў НГАБ:

• Матэрыялы фонду № 91 («Урадавы аграном у Мінскай губерні ад Дэпартамента земляробства, горад Мінск Мінскага павета Мінскай губерні») адлюстроўваюць спробу прыцягнення да аграрнай эліты сялянства ў пачатку XX стагоддзя. Ажыццяўлялася гэта шляхам укладанняў сродкаў у сельскагаспадарчую адукацыю, імкненнем да павышэння яго якасці [5, л. 178], а таксама арганізацыю розных выставак, палітыку стымулявання працы ў галіне напісання навуковых прац і папулярных артыкулаў па сельскай гаспадарцы шляхам заснавання грашовых прэмій [5, арк. 92] і іншых мерапрыемстваў.

• Матэрыялы фонду № 2414 («Кіраванне Лібава-Роменскай чыгункі Міністэрства шляхоў зносін, горад Гомель Гомельскага павета Магілёўскай губерні») адлюстроўваюць працэс знікнення саслоўных межаў пасля 1905 года: чыноўнік Калабаеў Ягор адправіў двух сваіх сыноў, Аляксея [6] і Уладзіміра , у вучні тэлеграфіста пры ЛР-Ч з перспектывай на далейшае іх працаўладкаванне на гэтай пасадзе. Падобныя сюжэты былі распаўсюджаны і на Палескай чыгунцы [8].

• Матэрыялы фонду № 448 («Кіраванне Мінскай паштова-тэлеграфнай акругі, горад Мінск Мінскага павета Мінскай губерні»), напрыклад асабістая справа паштова-тэлеграфнага чыноўніка шостага разраду Магілёўскай тэлефоннай сеткі Клаўдзіі Мікалаеўны Арыстархавай [9], адлюстроўваюць пачатак працэсу эмансіпацыі жанчын у сферы кіравання.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Каханоўскі, А. Г.* Беларускае грамадства напярэдадні ваенна-палітычных узрушэнняў і сацыяльных зрухаў у пачатку XX ст. / А. Г. Каханоўскі // Рыжскі мірны дагавор 1921 г. у лёсах народаў усходняй і цэнтральнай еўропы: матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі, Мінск, 26 сакавіка 2021 г. – 2021. – С. 3–11
2. Национальный Исторический Архив Беларуси (НИАБ). – Ф. 183. Оп. 1. Д. 1008
3. Национальный Исторический Архив Беларуси (НИАБ). – Ф. 183. Оп. 1. Д. 1050
4. Национальный Исторический Архив Беларуси (НИАБ). – Ф. 183. Оп. 1. Д. 1020
5. Национальный Исторический Архив Беларуси (НИАБ). – Ф. 91. Оп. 1. Д. 1
6. Национальный Исторический Архив Беларуси (НИАБ). – Ф. 2414. Оп. 2. Д. 3859
7. Национальный Исторический Архив Беларуси (НИАБ). – Ф. 2414. Оп. 2. Д. 3860
8. Национальный Исторический Архив Беларуси (НИАБ). – Ф. 2415. Оп. 2. Д. 1113
9. Национальный Исторический Архив Беларуси (НИАБ). – Ф. 448. Оп. 2. Д. 30

УДК 37.011.3(476)"186"

ШКОЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА ЦАРЫЗМУ Ў БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ 1860-х г.

В. М. Астрога

Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, вул. Свярдлова, 13 а, 220006, г. Мінск, ostroga.v@mail.ru

У артыкуле разглядаюцца асноўныя накірункі адукацыйнай і кадравай палітыкі царызму на тэрыторыі Беларусі ў 1860-я гг. Падкрэсліваецца яе дваісты і непаслядоўны характар: змест пастаянна карэктаваўся ва ўмовах складанай грамадска-палітычнай сітуацыі і вымушанай барацьбы з польскім уплывам. Прыхільнікі афіцыйнай гітарыяграфіі падкрэслівалі падвіжніцкі і прагрэсіўны характар асветніцкай місіі самадзяржаўя. Згодна з другой канцэпцыяй, прычынай рэформаў быў эканамічны стан краіны, таму урадавая праграма насіла прагматычны характар.

Ключавыя словы: Віленская навучальная акруга; настаўнік; адукацыйная палітыка; навучальныя ўстановы; дырэкцыі народных вучылішчаў.

ШКОЛЬНАЯ ПОЛИТИКА ЦАРИЗМА В БЕЛАРУСИ В НАЧАЛЕ 1860-х г.

В. М. Острога

Белорусский государственный технологический университет, ул. Свердлова, 13а, 220006, г. Минск, ostroga.v@mail.ru

В статье рассматриваются основные направления образовательной и кадровой политики царизма на территории Беларуси в 1860-е годы. Подчеркивается ее двойственный и противоречивый характер: содержание постоянно корректировалось в условиях сложной общественно-политической ситуации и вынужденной борьбы с польским влиянием. Сторонники официальной историографии подчеркивали подвижнический и прогрессивный характер просветительской миссии самодержавия. Согласно второй концепции, причиной реформ было экономическое состояние страны, поэтому программа правительства носила прагматичный характер.

Ключевые слова: Виленский учебный округ; учитель; образовательная политика; учебные заведения; дирекция народных училищ.

SCHOOL POLICY OF TSARISM IN BELARUS IN THE EARLY 1860s

V. M. Ostroga

Belarusian State Technological University, st. Sverdlova, 13a, 220006, Minsk, ostroga.v@mail.ru

The article examines the main directions of the educational and personnel policy of tsarism on the territory of Belarus in the 1860s. Its dual and contradictory nature is emphasized: the content was constantly adjusted in the conditions of a difficult socio-political situation and the forced struggle against Polish influence. Supporters of official guitarography emphasized

the ascetic and progressive nature of the educational mission of the autocracy. According to the second concept, the reason for the reforms was the economic condition of the country, so the government program was pragmatic.

Keywords: Vilna educational district; teacher; educational policy; educational establishments; Directorate of public schools.

Пасля далучэння беларускіх земляў да Расійскай імперыі царскі ўрад праводзіць аб'яднаўчую палітыку, накіраваную на іх збліжэнне і зліццё з цэнтральнымі расійскімі рэгіёнамі. Важным рычагом у ажыццяўленні гэтых мэт была сістэма народнай адукацыі. Прадстаўнікі афіцыйнай ідэалогіі былі перакананыя ў тым, што сфера асветы павінна з'яўляцца фактарам стабільнасці і непахіснасці існуючых парадкаў, своеасаблівым гарантам непарушнасці існаваўшых палітычных і сацыяльных адносін. Разам з тым, адставанне краіны ад еўрапейскіх дзяржаў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, эканамічныя інтарэсы буржуазіі, прамысловы і гандлёвы дабрабыт якой у значнай ступені залежыў ад культурнага ўзроўню работнікаў, стымулявалі ажыццяўленне мадэрнізацыйных працэсаў і паказвалі неабходнасць развіцця пісьменнасці насельніцтва і прафесійнай адукацыі. Вядомы дзеяч народнай асветы Г. А. Фальбарк справядліва адзначаў: «Расія, невуцкая і спустошаная, паўстала перад сценамі Севастопаля... Гераізм асобных людзей не мог выправіць тое, што было падрыхтавана ўсёй сістэмай». Таму у шэрагу палітычных задач вылучалася «вялікая справа правільнай арганізацыі адукацыі» [21, с. 9–10].

Сістэма адукацыі першай паловы XIX ст. характарызавалася разнатыпнасцю навучальных устаноў, якія знаходзіліся ў падпарадкаванні розных міністэрстваў і ведамстваў. Напярэдадні школьнай рэформы 1860-х гг. у Беларусі дзейнічала 576 навучальных устаноў усіх тыпаў: 12 сярэдніх, 45 няпоўных сярэдніх, 45 прыватных і дзяржаўных жаночых вучылішчаў, 21 духоўнае вучылішча і 453 пачатковыя школы. Ва ўсіх школах навучалася каля 17 тыс. чалавек [4, с. 283].

Апякун Віленскай навучальнай акругі П. Шырынскі-Шыхматаў у 1861 г. у запісцы міністру народнай асветы А. У. Пуцяціну адзначаў, што «інтарэсы Расіі ў тутэйшым краі настолькі вялікія, што выдаткі, хаця б і значныя, злучаныя з рознымі мерамі, якія маюць мэтай яго падтрыманне, не павінны служыць таму перашкодай». Заўважалася, што Віленская навучальная акруга знаходзілася ў асаблівым становішчы, якое вызначалася «нацыянальнасцю насельніцтва» [9, с. 1–3]. Урадавым колам было відавочна, што «настаўнікі-палякі, асабліва пры тагачасным настроі польскага грамадства, не маглі не падтрымліваць у школе польскай мовы, польскіх поглядаў, польскага духу» [1, с. 21, 6]. «Асаблівасці Паўночна-Заходняга краю» патрабавалі адпавведнай адукацыйнай палітыкі. Падкрэслівалася неабходнасць кантролю за дзей-

насцю навучальных устаноў, у якіх рускія настаўнікі павінны былі карыстацца правамі дзяржаўнай службы, маглі атрымліваць чыны і прадстаўляцца да ўзнагарод [9, с. 37–38]. У гэтых умовах надзвычай важная ўвага надавалася рускай мове выкладання граматы.

Новыя вучылішчы вырашылі адкрываць у Віленскай, Гродзенскай губернях і Навагрудскім павеце Мінскай, дзе, нягледзячы на моцны польскі ўплыў, частка насельніцтва з'яўлялася праваслаўнай. У маі 1862 г. А. П. Шырынскі-Шыхматаў камандзіраваў сваіх служачых у гэтыя раёны для арганізацыі новых школ. Ім былі дадзены шырокія паўнамоцтвы ў выбары месцазнаходжання школ і прызначэнні настаўнікаў. На працягу двух месяцаў гэтага года была адкрыта 101 школа, у тым ліку, 5 у Гродзенскай і 17 у Мінскай губернях [1, с. 15–20]. Дапамогу ў дадзенай справе аказаў літоўскі мітрапаліт Іосіф. Па яго ўказанні праваслаўныя святары павінны былі не толькі на месцах падтрымліваць камандзіраваных асоб, але і самі працаваць настаўнікамі ў новых школах [16, с. 107]. Ва ўсе ўрадавыя школы выкладчыкамі прызначаліся выхаванцы філасофскіх класаў Мінскай і Літоўскай духоўных семінарый, святары, дзякі, прычотнікі, для якіх былі арганізаваны педагагічныя курсы ў Мінску і Вільні. Будучых настаўнікаў знаёмілі з метадамі навучання пісьму, чытанню і арыфметыцы. Ім гаварылася, што «вучэбнае начальства глядзіць на іх не як на звычайных настаўнікаў рускай граматы, але як на самых дзейных правадыроў рускіх ідэй, рускай адукацыі ў народзе» [1, с. 21]. У 1860-я гг. доля дзяржавы ў фінансаванні сельскіх вучылішчаў прыкладна складала 90 %. Гэта дазволіла стварыць сетку пачатковых школ, якія падпарадкоўваліся непасрэдна Міністэрству народнай асветы. Але расла таксама і колькасць грамадскіх школ, якія ва ўмовах адсутнасці земскіх устаноў адкрывалі і ўтрымлівалі самі сялянскія таварыствы. Для забеспячэння вучылішчаў педагогамі генерал-губернатар М. М. Мураўёў прапанаваў стварыць настаўніцкія семінарыі для падрыхтоўкі «рускіх настаўнікаў як праваднікоў і абаронцаў рускай народнасці». Для новай навучальнай установы (пачала працу з 1864 г.) абралі Маладзечна, дзе большасць насельніцтва было праваслаўным [22, с. 15].

Лічылася неабходным у каталіцкага духавенства «забраць» усялякі ўдзел у справе народнай адукацыі, даўшы права выкладаць толькі Закон Божы дзецям сваіх вернікаў. Падкрэслівалася, што акрамя праваслаўнага духавенства ніхто не павінен займацца навучаннем сялян без папярэдняга дазволу дырэкцый народных вучылішчаў. Спецыяльны цыркуляр (1864 г.) прадугледжваў настаўнікаў «тайных школ» штрафаваць у памеры 100 руб., а затым «браць іх пад арышт для далейшых распараджэнняў» [9, с. 51–53]. На барацьбу з тайным навучаннем урад прыцягваў і сельскіх настаўнікаў, якія павінны былі паведамляць уладам аб існаванні недазволеных школ [14, л. 65, 36]. Планавалася бясплатнае распаўсюджванне малітоўнікаў і рускіх

букваро̆. Быў устаноўлены строгі кантроль за фондамі школьных бібліятэк, кніжнымі складамі і гандлярамі кніг [11, л. 1]. Але новыя навучальныя ўстановы сустрэлі «вельмі неспачувальна»: былі выпадкі, калі міравыя пасрэднікі і валасныя старшыні пры падтрымцы мясцовага насельніцтва і ксяндзоў закрывалі вучылішчы [20, с. 85].

У афіцыйных дакументах таго часу падкрэслівалася, што «пакласці канец палітычнай і рэлігійнай смуце» і забяспечыць умовы «паступовага правільнага развіцця на аснове карэнных гістарычных пачаткаў», важнае значэнне набывала «пытанне аб выхаванні» [10, л. 1]. Удзел моладзі ў паўстанні 1863–1864 гг. стаў падставай для закрыцця па палітычных матывах «найбольш аддаленых ад урадавага нагляду» Горы-Горацкага земляробчага інстытута, Віленскага дваранскага інстытута, Навагрудскай, Кейданскай, Панявежскай гімназій, а таксама Цельшэўскай і Свіслацкай прагімназій. Значна быў ўзмоцнены агульны паліцэйскі і інспектарскі кантроль над сярэдняй і пачатковай школай, паводзінамі вучняў [6, с. 126–127]. М. М. Мураўёў прапанаваў гімназіі пакінуць толькі ў губернскіх гарадах, дзе, з аднаго боку, пражывала значная колькасць рускага насельніцтва, і, з другога, існавала магчымасць дасканалага кантролю за ажыццяўленнем усяго навучальна-выхаваўчага працэсу. Што ж датычылася павятовых гарадоў, то сярэднія навучальныя ўстановы маглі прадоўжыць сваю дзейнасць «толькі ў выключных выпадках» [12, с. 29].

Паралельна ішла распрацоўка праектаў статутаў і палажэнняў агульнаадукацыйных навучальных устаноў. Міністэрства асветы засяродзіла ў сваіх руках кіруючую і кантралюючую функцыі. Прадстаўніком царскай адміністрацыі і правадніком урадавай адукацыйнай палітыкі на тэрыторыі Беларусі, уключаючы кадравую, з'яўляўся апякун Віленскай навучальнай акругі, перад якім была пастаўлена задача не толькі арганізацыі навучальна-выхаваўчай дзейнасці, але і «станаўлення культуры адукацыі, якой не аказалася ў ступені, неабходнай для стварэння дзеючай сістэмы асветы» [3, с. 159–160].

Правядзенне школьнай рэформы ў Беларусі з некаторымі асаблівасцямі у многім было абумоўлена грамадска-палітычнай сітуацыяй у краі. Зацверджанае 14 чэрвеня 1864 г. «Палажэнне аб пачатковых народных вучылішчах» на беларускія землі не распаўсюджвалася. Яшчэ раней, 23 сакавіка 1863 г., былі прыняты «Часовыя правілы для народных школ у губернях: Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай» [2, с. 1–4], якія дзейнічалі да канца XIX ст. У 1866 г. кожная губерня Віленскай навучальнай акругі мела сваю дырэкцыю са штатам інспектараў, якая загадвала ўсімі пачатковымі вучылішчамі на яе тэрыторыі і ажыццяўляла пільны нагляд. Школа выкарыстоўвалася як сродак русіфікацыі краю і барацьбы з «паланізмам».

Новы апякун акругі І. Карнілаў адзначаў, «каб паказаць, да якой ступені край быў апалячаны, дастаткова сказаць, што нават цяпер у нашых гімназіях і прагімназіях на 240 настаўнікаў толькі 80 рускіх і немцаў; у сямі павятовых вучылішчах працэнт польскіх настаўнікаў такі ж, а ў парафіяльных вучылішчах амаль ўсе настаўнікі – палякі». На 1 студзеня 1864 г. са 114 настаўнікаў, якія служылі ў прыходскіх вучылішчах, 91 чалавек з іх па нацыянальнасці быў палякам. Ён лічыў, што настаўнікамі з Расіі павінны быць заменены ў першую чаргу ўсе выкладчыцкія месцы ў гімназіях, прагімназіях і трохкласных павятовых вучылішчах, бо «штодзённы досвед пераконвае, што дастаткова прысутнасці аднаго настаўніка-паляка, каб пазбавіць педсаветы ўсякай сілы і перашкаджаць узаемнаму даверу і абмену думкамі» [9, с. 82]. Абмяжоўваўся прыём ў сярэднія навучальныя ўстановы дзяцей польскай шляхты. У выніку з 1862 г. да пачатку 1866 г. колькасць праваслаўных вучняў ў гімназіях павялічылася на 33 %, а каталіцкай зменшылася на 56 % [18, с. 37].

Строгія меры прымаліся ў дачыненні педагогаў і навучэнцамі, якія падчас паўстання прадэманстравалі сваю нелаяльнасць да ўлады. Так, 19 чэрвеня 1864 г. апякун у лісце дырэктару Гродзенскай гімназіі рэкамендаваў «прапанаваць гг. Гедройцу і Бяляўскаму падаць прашэнні аб звальненні ад пасад». Затым 18 ліпеня быў звольнены настаўнік французскай мовы Ю. Карэйва (яму было дадзена месца звышштатнага выкладчыка ў Кастрамскай гімназіі) і старшы настаўнік лацінскай мовы А. Гінтаўт (яму была прапанавана пасада ў Прывісленскім краі) [7, с. 65, 71]. Паўстанне 1863 г. паўплывала і на змену ў асабовым складзе служачых у Магілёўскай гімназіі [19, с. 141]. Сур'ёзныя кадравыя перастаноўкі былі зроблены таксама ў Слуцкай гімназіі з мэтай «замяніць мясцовых ураджэнцаў рэфарматарскага і рымска-каталіцкага вызнанняў настаўнікамі рускага паходжання і падпарадкаваць гэтую гімназію агульным правілам будовы навучальных устаноў краю» [5, с. 128]. Кадравая палітыка была ўзята пад асаблівы кантроль і ў жаночых сярэдніх навучальных установах. Педагогі-католікі ў абмежаванай колькасці дапускаліся толькі ў сферу прыватнай педагагічнай практыкі: яны атрымалі права працаваць у якасці дамашніх настаўнікаў дзяцей заможных бацькоў [8, с. 22].

Статутам 1864 г. у сярэдніх навучальных установах уводзіўся інстытут класных выхавальнікаў, якія павінны былі засяродзіць у сваіх руках выхаваўчыя функцыі, сачыць за паводзінамі сваіх падапечных. Цыркулярам ад 29 снежня 1864 г. яшчэ патрабавалася, каб наглядальніцы і класныя дамы, якія па ўстаноўленым парадку прысутнічалі ў класе падчас правядзення заняткаў, таксама ўважліва сачылі «за словамі выкладчыкаў і ў выпадку, калі заўважаць шкодны кірунак лекцый, адразу даводзілі б да ведама начальства». Інакш яны аб’яўляліся «саўдзельніцамі нядобранамерных выкладчыкаў» і неадкладна звальняліся з працы з пазбаўленнем права паступлення зноў на службу [14, л. 4].

Для замяшчэння настаўніцкіх пасад у гімназіях і прагімназіях асобамі рускімі і праваслаўнымі ў Маскоўскім, Казанскім і Харкаўскім універсітэтах былі заснаваны 60 стыпендый на гісторыка-філалагічных і фізіка-матэматычных факультэтаў. Студэнты-католікі на такія стыпендыі прэтэндаваць не маглі. Больш за тое, з 1864 г. асігнавана было «50 000 руб. на вытворчасць служачым па вучэбнай частцы асобам рускага паходжання дадатковага заробку ў памеры палавінных акладаў» [17, с. 466]. Аклады рускіх настаўнікаў былі павялічаны на 50 %, а пры прызначэнні на службу яны атрымлівалі падвойныя прагоны, дадаткова паўгадавы аклад заробку і грошы на арэнду кватэры. З найбольш здольных і дасведчаных людзей «чыста-рускага паходжання» праз «узмацненне грашовага ўтрымання» прапаноўвалася рэкрутаваць інспектараў і дырэктараў гімназій, чыноўнікаў дырэкцый народных вучылішчаў і служачых Віленскай навучальнай акругі [9, с. 39]. Выкладчыкі з Расіі ў асноўным атрымлівалі сваё прызначэнне ў гарадскія навучальныя ўстановы.

Такім чынам, сур'ёзнай перашкодай на шляху сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх зямель была адсталасць у сферы народнай адукацыі. Сучаснікі падкрэслівалі, што «невуцтва масы народа ёсць вельмі ўстойлівая, гістарычна ўспадкаваная традыцыя, якая трывала ўсталявалася на працягу многіх стагоддзяў» [13, с. 1–2]. Праводзячы кансерватыўны курс у школьнай палітыцы, урад клапаціўся перш за ўсё аб захаванні манархічных асноў дзяржаўнасці і манаполіі на адукацыю за маёмаснымі класамі. Асноўнай мэтай пераўтварэнняў, у тым ліку ў сферы асветы, было прыстасаванне існаваўшага самадзяржаўна-прыгонніцкага ладу да патрэб капіталістычнага развіцця краіны. Адукацыйная і кадравая палітыка 1860-х гг. характарызавалася дваістасцю, непаслядоўнасцю і большай рэакцыйнасцю ў параўнанні з іншымі губернямі Расійскай імперыі. Перадавая грамадскасць гучна заяўляла, што «лепшыя школьныя ідэі ва ўсіх краінах і ва ўсе часы нараджаліся і выспявалі ў нетрах рэвалюцыйнага патоку... Рабства ёсць антытэза нармальнай школе, якая патрабуе самых шырокіх гарантый правоў чалавека» [21, с. 9–10].

Бібліяграфічны спіс

1. *Белецкий, А. В.* Сороколетие русской начальной школы в Северо-Западном крае России. Вильно: тип. А. Сыркина, 1904. 64 с.
2. Временные правила для народных школ в губерниях: Виленской, Ковенской, Гродненской, Минской, Могилевской и Витебской // Циркуляр по управлению Виленским учебным округом за 1867 г. 1967. № 2. С. 1–4.
3. *Галиуллина, Р. Х.* Институт попечительства учебных округов России первой половины XIX в. в трудах историков // Источниковедение и историография в мире гуманитарного знания / сост. Р. Б. Казаков. М.: изд. Центр РГГУ, 2002. С. 159–162.
4. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. Ч. 1. Ад старажытных часоў – па люты 1917 г.: падручнік / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. 3-е выд. Мінск: Вышэйшая школа, 2007. 398 с.
5. *Глебов, И. А.* Историческая записка о Слуцкой гимназии с 1617–1901 гг. Вильна: тип. А. Г. Сыркина, 1903. 217 с.

6. Историческая записка о Мозырской прогимназии / сост. К. Шпаковский. Мозырь: тип. Х. В. Кугель, 1909. 150 с.
7. Исторический очерк Гродненской гимназии / сост. Е. Ф. Орловский. Гродно: типо-литография С. Лапина, 1901. 119 с.
8. *Киприанович, Г. Я.* К истории женского образования в Западной России. Вильна: Губ. тип., 1910. 68 с.
9. *Корнилов, И.* Русское дело в Северо-Западном крае. Материалы по истории Виленского учебного округа преимущественно в Муравьевскую эпоху. СПб.: тип. А. Суворина, 1908. Вып. 1. 504 с.
10. ЛГИА. Ф. 576. Воп. 1. Спр. 120.
11. ЛГИА. Ф. 567. Воп. 1. Спр. 653.
12. *Миловидов, А. И.* Участие молодежи Северо-Западного края в мятеже 1863 года и вызванная им реформа местных учебных заведений (по архивным материалам). Вильна: тип. «Русский почин», 1904. 39 с.
13. Народная школа в Государственной Думе // Русская школа. 1907. № 12. С. 1–25.
14. НИАБ. Ф. 2263. Воп. 1. Спр. 1.
15. НИАБ. Ф. 458. Воп. 1 Спр. 124.
16. *Родевич, М.* Белорусские народные школы. Б. м., Б. г. 119 с.
17. *Рождественский, С. В.* Исторический обзор деятельности Министерства Народного Просвещения. 1802–1902. СПб.: Государственная тип., 1902. 785 с.
18. *Самбук, С. М.* Политика царизма в Белорусси во второй половине XIX века. Минск: Наука и техника, 1980. 224 с.
19. *Созонов, М. Л.* Историческая записка Могилевской мужской гимназии. 1809–1909. Могилев: Губ. тип., 1909. 213 с.
20. *Солоневич, Л. М.* Краткий исторический очерк Гродненской губернии за сто лет ее существования, 1802–1902. Гродно: Губ. тип., 1901. 106 с.
21. *Фальборк, Г. А.* Всеобщее образование в России. М.: Тип. т-ва И. Д. Сытина, 1908. 212 с.
22. *Ярушевич, А.* Молодечно и его учебные заведения: К пятидесятилетию Молодечненской учительской семинарии (1864–1914). Вильна: Русский почин, 1914. 70 с.

УДК 338(476)(091)"18/19"(043.3)

УПЛЫЎ МАДЭРНІЗАЦЫЙНЫХ ПРАЦЭСАЎ НА РАЗВІЦЦЁ ПРАМЫСЛОВАГА ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА Ў БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

А. В. Бурачонак

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, burachonak@bsu.by

Аўтарам выяўлены асноўныя фактары, якія прывялі да трансфармацыі эканамічнага жыцця ў беларускіх губернях. Ахарактарызавана праватворчая дзейнасць урада Расійскай імперыі, якая закранае пытанні арганізацыі прыватнага прадпрымальніцтва і яго падаткаабкладання. Вызначана роля асацыіраванага капіталу і манапалістычных аб'яднанняў у развіцці гандлёва-прамысловага прадпрымальніцтва Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. У выніку аўтар прыходзіць да высновы аб тым, што пад уплывам мадэрнізацыйных працэсаў на тэрыторыі Беларусі змяняліся формы і ўмовы

ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, мяняўся склад удзельнікаў прадпрымальніцтва, узнікалі новыя сродкі вытворчасці і рыначныя інстытуты, якія не замянялі старыя, а дапаўнялі іх.

Ключавыя словы: БССР; гісторыя прадпрымальніцтва; Беларусь; мадэрнізацыя; падаткаабкладанне; гандлёвыя дамы; акцыянерныя кампаніі; прамысловасць; гандаль.

ВЛИЯНИЕ МОДЕРНИЗАЦИОННЫХ ПРОЦЕССОВ НА РАЗВИТИЕ ПРОМЫШЛЕННОГО ПРЕДПРИНИМАТЕЛЬСТВА В БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЯХ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XIX – НАЧАЛА XX в.

А. В. Бурачонок

Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, burachonak@bsu.by

Автором выявлены основные факторы, которые привели к трансформации экономической жизни в белорусских губерниях. Охарактеризована правотворческая деятельность правительства Российской империи, затрагивающая вопросы организации частного предпринимательства и его налогообложения. Определена роль ассоциированного капитала и монополистический объединений в развитии торгово-промышленного предпринимательства Беларуси в конце XIX – начале XX вв. В результате автор приходит к выводу о том, что под влиянием модернизационных процессов на территории Беларуси изменялись формы и условия осуществления предпринимательской деятельности, менялся состав участников предпринимательства, возникали новые средства производства и рыночные институты, которые не заменяли старые, а дополняли их.

Ключевые слова: история предпринимательства; Беларусь; модернизация; налогообложение; торговые дома; акционерные компании; промышленность; торговля.

THE IMPACT OF MODERNISATION ON PROMOTING INDUSTRIAL ENTREPRENEURSHIP IN THE BELARUSIAN PROVINCES IN THE SECOND HALF OF THE 19th AND BEGINNING OF THE 20th CENTURY

A. Burachonak

Belarusian State University, 4, Niezaležnasci avenue, Minsk, 220030, Belarus, burachonak@bsu.by

Згодна «Агульнаму палажэнню аб сялянах, якія выйшлі з прыгоннай залежнасці» 1861 г. сяляне аб'ядноўваліся ў сельскія грамады. Сельскія грамады павінны былі займацца вырашэннем розных гаспадарчых спраў. Для рашэння судовых і адміністрацыйных пытанняў ствараліся воласці, якія ўключалі ў сябе некалькі сельскіх грамад [2, с. 143]. Да 1861 г. на тэрыторыі Беларусі валасных упраў не існавала, яны дзейнічалі толькі ў казённых вёсках цэнтральных рэгіёнаў Расійскай імперыі. Сельская грамада, як і раней, магла складацца з сялян аднаго сельскага пасялення, альбо аб'яднаных дробных вёсачак. У адрозненне ад грамад дзяржаўных сялян, у памешчыцкіх вёсках дапускалася дзяленне сялян адной вёскі на некалькі сельскіх грамад у тым выпадку, калі сяляне належалі розным памешчыкам. Сяляне розных памешчыкаў маглі ўваходзіць у адну сельскую грамаду толькі ў выпадку, калі ў паселішчы налічвалася менш дваццаці рэвізскіх душ мужчынскага полу. Колькасныя памеры сельскай грамады не рэгламентаваліся. Іншай сітуацыя была з валасцямі. У воласці магло налічвацца ад 300 да 2 000 рэвізскіх душ мужчынскага полу. Пры гэтым у склад воласці маглі ўваходзіць толькі пасяленні аднаго павета. Пры арганізацыі валаснога дзялення ўрадам прапаноўвалася ўлічваць ужо існуючы падзел тэрыторыі на царкоўныя прыходы.

Структура сельскага кіравання ў памешчыцкіх сялян некалькі адрозніваласа ад дзяржаўных. У сельскіх грамадах памешчыцкіх (і былых памешчыцкіх) сялян не існавала такой пасады як сельскі старшына. Кіраўніком грамады афіцыйна з'яўляўся сельскі староста (у адпаведнасці з рэформай 1838 г. сельскіх старастаў у адной грамадзе дзяржаўных сялян магло быць некалькі і выконвалі яны функцыі не кіраўнікоў, а памочнікаў старшыны). Сельскі староста знаходзіўся ў падначаленні валаснога старшыні, у той час як сельскі старшына ў казённых вёсках падпарадкоўваўся наўпрост акружному начальніку. Захоўваліся ў сельскіх грамадах былых памешчыцкіх сялян пасады зборшчыка падаткаў і сельскага пісара. Адрозненне ад дзяржаўнай вёскі заключалася толькі ў тым, што па рэформе 1861 г. пасады гэтыя не з'яўляліся абавязковымі, а ўводзіліся ў выпадку неабходнасці па рашэнні сельскай грамады. Замест лясной варты і палясоўшчыкаў у памешчыцкіх сялян былі лясныя і палявыя вартаўнікі. Да функцыяналу дазорцы сельскага запаснога хлебнага магазіна дадаваліся абавязкі наглядчыка вучылішч і бальніц. Існавалі ў былых памешчыцкіх вёсках і дзесяцкія, але акрамя іх уводзіліся яшчэ пасады соцкіх. Апошнія дзве пасады ўяўлялі сабой ужо не проста памочнікаў сельскіх старастаў, як было раней, а з'яўляліся ніжэйшымі паліцэйскімі чынамі [17, с. 782–783],

выконвалі наглядныя функцыі. Яны прызначаліся сельскімі грамадамі выключна з сялян адной вёскі, у той час як кандыдаты на іншыя кіруючыя пасады не абавязкова былі «мясцовымі». Дзесяцкія выбіраліся штогод у пачатку снежня не больш аднаго на 25–30 двароў [12, с. 791], а ў дзяржаўнай вёсцы іх колькасць адпавядала назве – 1 ад дзесяці двароў, і абавязкам іх было выключна выкананне распараджэнняў сельскіх старастаў.

Заканадаўствам рэгламентавалася не толькі працэдура выбараў службовых асоб, але і тыя патрабаванні, якія прад'яўляліся да кандыдатаў. Разам з тым, нярэдка яны насілі суб'ектыўны і нефармальны характар. Сельскі староста ў былых памешчыцкіх сялян, пасада якога па сутнасці адпавядала пасадзе сельскага старшыны ў дзяржаўных сялян, выбіраўся сельскім сходам на тры гады з магчымасцю неаднаразовых перавыбараў. Такія ж тэрміны службы раней былі ўсталяваны для сельскага старшыны. Ва ўмовах выбарнасці сельскіх старастаў першапачатковае абранне на пасаду шмат у чым залежала ад думкі аднавяскоўцаў. Таму не дзіўна, што кандыдаты і выбарныя асобы спрабавалі паказаць усе свае лепшыя якасці перад грамадой, заваяваць аўтарытэт і павагу. Для беларускіх сялян гаспадарлівасць і дабрабыт выступалі важнымі фактарамі фарміравання сацыяльнага становішча, заваёвы асабістага нефармальнага аўтарытэту. Павагай карысталіся менавіта тыя сяляне, якія ўмела і разумна вялі сваю гаспадарку [5, с. 218]. Пасля абрання на пасаду і атрымання ўлады паводзіны старастаў нярэдка мяняліся, што цягнула за сабой і змяненне адносін аднавяскоўцаў да абранага кіраўніка. Падобны факт пацвярджаўся наяўнасцю значнай колькасці скаргаў на прадстаўнікоў вясковай адміністрацыі. Большасць з іх адносілася да злоўжывання службовым становішчам, хабарніцтва, п'янства. Такая сітуацыя ў меншай ступені была характэрнай для службовых асоб сельскіх грамад дзяржаўных сялян, таму што старшыны там валодалі меншымі паўнамоцтвамі і не вырашалі пытанняў, звязаных з сялянскай зямельнай уласнасцю, выконвалі пераважна ролю наглядчыкаў за парадкам і выканаўцаў распараджэнняў вышэйшай адміністрацыі.

Выкананне сельскім старастам сваіх абавязкаў знаходзілася ў залежнасці ад дзейнасці ўсіх членаў грамады, бо менавіта староста нёс адказнасць за яе працу. У выпадку наяўнасці парушэнняў, нядоімак у гаспадароў пакаранню падлягала адказная службовая асоба. Таму нярэдка атрымлівалася так, што падобная служба з'яўлялася для сялян цяжарам, якога імкнуліся пазбегнуць любымі сродкамі. Нярэдкімі былі просьбы аб датэрміновым звальненні з пасады [7, л. 4–6, 28]. Нават шэраг ільгот, якімі валодалі сельскія старасты, не мог зацікавіць вясковых гаспадароў у гэтай пасадзе. З цягам часу склалася сітуацыя, калі сяляне адмаўляліся ад кіруючых пасад. Нежаданне быць абранымі на кіруючую пасаду прыводзіла да

таго, што выбіралі асоб, якія на момант правядзення выбараў адсутнічалі на сходах (знаходзіўся на заробках, у аддаленых губернях імперыі і інш.) [10, с. 62]. Рашэнні сельскіх сходаў у такім выпадку былі абавязковымі да выканання і абраныя кіраўнікамі сяляне вымушаны былі вяртацца на радзіму. Адмовіцца можна было толькі ў выпадку, калі селянін ужо адбываў падобную службу раней, альбо быў здольны выплаціць пэўную суму «адчэпных».

Фармальна кіраўніком сельскай грамады ў дзяржаўных сялян з'яўляўся сельскі старшына, у памешчыцкіх сялян пасля адмены прыгоннага права – сельскі стараста. На практыцы часта атрымлівалася так, што рэальнай уладай і аўтарытэтам сярод сялян валодаў не стараста, а сельскі пісар. Пасада гэта была асаблівай, так як у абавязковым парадку патрабавала наяўнасці хаця б мінімальнага ўзроўню адукацыі. У грамадах дзяржаўных сялян у 30–50-я гг. XIX ст., калі адукацыя для прадстаўнікоў ніжэйшых саслоўяў была маладаступнай, на пасаду пісара пачыналі рыхтаваць кандыдатаў ужо ў дзіцячым узросце. Хлопчыкаў спецыяльна адбіралі і адпраўлялі на вучобу, якую аплочвалі «усім мірам». Праўда, сабраных грошай не заўсёды хапала, таму ўзровень іх адукацыі заставаўся невысокім. Пры недахопе адукаваных сялян у дарэформенны перыяд пасады пісараў нярэдка замяшчалі выхадцы з мяшчан альбо дваран [8, л. 92–97]. Гэта акалічнасць таксама адыграла ролю ў фарміраванні высокай грамадскай думкі і аўтарытэту пісараў у вёсцы. У сельскіх грамадах пасля адмены прыгоннага права выпадкі замяшчэння пасады прадстаўнікамі іншых саслоўяў рабіліся ўсё больш рэдкімі ў сувязі з пашырэннем магчымасці атрымання адукацыі сялянамі. У канцы XIX ст. большасць пісараў ужо складалі выхадцы з сялянскага саслоўя [11, с. 79].

Аб значнасці пасады пісара кажа і памер яго жалавання, якое нязначна адрознівалася ад жалавання кіраўніка грамады. Так, старшына атрымліваў 120–180 руб. штогод, а пісар мог зарабляць да 120 руб. [3, с. 608, 610]. Пасля адмены прыгоннага права прыбытак пісара яшчэ больш узрос. Так, у Мінскай губерні зарплата пісара была ў сярэднім удвая большай, чым у валаснога старшыны, і складала ад 200 да 350 руб. штогод [9, л. 117], а да канца XIX ст. узрасла яшчэ ў 2 разы, у той час як зарплата старшыны – толькі ў 0,7 разы. Акрамя таго, пасада пісара ў адрозненне ад старшыны альбо старасты, не з'яўлялася выбарнай. Ён прызначаўся альбо акружным начальнікам, альбо сельскай грамадой.

Асаблівасцю беларускіх губерняў было тое, што тут большасць сельскіх грамад былі невялікімі і маглі абыходзіцца без асобнага «письмоводителя». У такіх выпадках абавязкі сельскага пісара ўскладаліся на пісара валаснога. Пісара называлі «настоящим, хотя и закулисным, вершителем всех крестьянских дел» [6, с. 41]. Прадстаўнікі вышэйшай

адміністрацыі адзначалі, што пісары для сялян адыгрывалі ролю «мясцовых аракулаў», знаўцаў законаў, але на самай справе ўяўлялі сабой людзей «даволі сумніўнай маральнасці», толькі блыталі справу, а пастановы сходаў і судоў пад «пяром невуча-пісара» часта з'яўляліся верхам бязладдзя [1, с. 113]. Адсутнасцю падрыхтаваных кадраў тлумачыўся даволі малады ўзрост тых, хто пачынаў службу пісарам у мясцовай сельскай адміністрацыі. У пісары ішлі звычайна маладыя сяляне, юнакі, якія атрымалі хаця б якія-небудзь пачатковыя веды ці толькі пачыналі вучыцца. У той жа час на выбарныя пасады сельскай адміністрацыі маглі прэтэндаваць асобы не маладзей за 25 гадоў [2, с. 158], што для сялян было ўжо досыць сталым узростам.

Больш падрабязна, у параўнанні з дзяржаўнымі сялянамі, вызначаліся ў «Агульных палажэннях…» 1861 г. абавязкі сельскага сходу былых памешчыцкіх сялян. Некалькі іншай была сістэма яго фарміравання. У абодвух выпадках удзельнікамі сельскага сходу ў абавязковым парадку з'яўляліся сельскія службовыя асобы. Астатняя частка сходу была выбарнай. У дзяржаўных сялян выбарныя прызначаліся па два ад кожных дзесяці двароў. Выключэнне складалі выпадкі, калі сход разглядаў пытанні аб раздзеле грамадскіх зямель. У такой сітуацыі на сходзе прысутнічалі ўсе гаспадары сельскай грамады [4, с. 604]. У памешчыцкай вёсцы ўсе сяляне-гаспадары (якія яшчэ не выкупілі зямельны надзел і знаходзіліся ў часоваабавязаным становішчы) і сяляне-уласнікі (сяляне, якія выкупілі зямлю) прысутнічалі на сходзе ў абавязковым парадку пры разглядзе любых пытанняў, а пры немагчымасці з'явіцца на сход замест сябе трэба было адправіць іншага прадстаўніка сям'і [2, с. 148]. Праўда, сяляне-ўласнікі не прымалі ўдзелу ў вырашэнні пытанняў, якія тычыліся адносін з уладальнікам зямлі, якой грамада толькі карысталася.

У дзяржаўных сялян сельскі сход павінен быў збірацца толькі тры разы ў год: у студзені, маі і верасні (кастрычніку), а таксама дадаткова ў надзвычайных выпадках. Асобна раз у тры гады збіраўся сход для выбараў сельскага кіраўніцтва [4, с. 605]. У памешчыцкіх сялян сельскія сходы маглі збірацца значна часцей і склікаліся старастамі па меры неабходнасці. Рашэнні сходу прызнаваліся паўнамоцнымі толькі пры прысутнасці не менш за 2/3 членаў сходу ў першым выпадку, і не менш за 1/2 – у другім. Менавіта на сельскім сходзе вырашаліся галоўныя пытанні сялянскага жыцця. Праз яго рашэнні можна было прасачыць не толькі юрыдычнае, але і рэальнае становішча селяніна, фармальныя і нефармальныя ўзаемаадносіны ў сялянскім асяроддзі. Праца сходу не заўсёды адпавядала юрыдычна ўстаноўленым правілам. Асабліва гэта было заўважна ў парэформенны час. Нярэдка рашэнні прымаліся без узгаднення з большасцю гаспадароў. У такім выпадку адказнасць на сябе бралі пераважна заможныя сяляне. Па-

добныя сітуацыі былі больш частымі ў грамадах былых памешчыцкіх сялян, у якіх менавіта пасля адмены прыгоннага права яскрава праявілася маёмасная няроўнасць.

Такім чынам, традыцыі сялянскага самакіравання ў Беларусі ў форме сельскай грамады з сельскім сходам і сельскімі службовымі асобамі сталі фарміравацца ў дзяржаўных сялян у канцы 1830-х гг. Вопыт самакіравання дзяржаўных сялян быў пакладзены ў аснову стварэння мясцовай сялянскай адміністрацыі ў ходзе рэформы 1861 г. Аднак сельскія грамады памешчыцкіх сялян мелі адрозненні ад сялян казённага ведамства. Становішча іх было ўніфікавана ў 1867 г., калі дзеянне «Агульнага палажэння аб сялянах, якія выйшлі з прыгоннай залежнасці» 1861 г. распаўсюдзілася і на дзяржаўных сялян.

Бібліяграфічны спіс

1. *Брокгауз, Ф. А.* Письма о современном состоянии России. 11-го апреля 1879 – 6-го апреля 1880 / Ф. А. Брокгауз. – Лейпциг, 1881. – 148 с.

2. Высочайше утвержденное Общее положение о крестьянах, вышедших из крепостной зависимости, 19 фев. 1861 г., № 36657 // Полное собрание законов Российской империи. – Собр. 2-е : в 55 т. – СПб., 1863. – Т. 36. – Отд. 1. – С. 141–169.

3. Высочайше утвержденное учреждение о управлении государственными имуществами в Западных губерниях и Белостокской области, 28 дек. 1839 г., № 13035 // Полное собрание законов Российской империи. – Собр. 2-е : в 55 т. – СПб., 1840. – Т. 14. – Отд. 1. – С. 989–1150.

4. Высочайше утвержденный проект учреждения о управлении государственными имуществами в губерниях, 30 апр. 1838 г., № 11189 // Полное собрание законов Российской империи. – Собр. 2-е : в 55 т. – СПб., 1839. – Т. 13. – Отд. 1. – С. 405–651.

5. *Каханоўскі, А. Г.* Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) / А. Г. Каханоўскі. – Мінск : БДУ, 2013. – 335 с.

6. *Леонтьев, А. А.* Крестьянское право. Систематическое изложение особенностей законодательства о крестьянах / А. А. Леонтьев. – 2-е изд-е, пересмотренное и дополненное изложением новых землеустроительных законов. – СПб. : изд-е. Юрид. книг. маг. И. И. Зубкова под фирмою «Законоведение», 1914. – VIII, 364 с.

7. Национальный исторический архив Беларуси (НИАБ). – Фонд 242. – Оп. 1. – Д. 126. О службе волостных и сельских должностных лиц крестьянского управления по Борисовскому уезду. Фонд 242. – Оп. 1. – Д. 417. Сведения мировых посредников для годового отчета о ходе крестьянского дела в Минской губернии за 1865 г.

8. НИАБ. – Фонд 242. – Оп. 1. – Д. 1950. По сбору сведений о нравственных и служебных качествах волостных старшин и писарей.

9. НИАБ. – 201 Фонд 242. – Оп. 1. – Д. 2126. Сведения о составе волостей Минской губернии и списки землевладельцев, имеющих более 25 десятин.

10. *Панюціч, В. П.* Прававое становішча сялянства парэформеннай эпохі / В. П. Панюціч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 1998. – № 1. – С. 58–65.

11. *Токць, С.* Беларуская вёска ў эпоху зьменаў : другая палова XIX – першая траціна XX ст. / С. Токць. – Менск : Тэхналогія, 2007. – 306 с.

12. *Тютрюмов, И. М.* Общее положение о крестьянах / сост. И. М. Тютрюмов. – 3-е изд-е, испр. и значит. доп. – Спб. : изд. Юрид. книг. маг. И. И. Зубкова под фирмою «Законоведение», 1915. – VIII, 1248 с.

УДК 323.33(476)(091)"1907/1914"

САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ ЎМОВЫ ЖЫЦЦЯ ФАБРЫЧНА-ЗАВОДСКІХ РАБОЧЫХ У БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ XX ст.

Я. В. Маслоўскі

«СІЦІ БАС» ПУП, пр. Незалежнасці, 11, корп. 2, оф. 215, 220030, г. Мінск, apm2021vad@yandex.by

На падставе архіўных і статыстычных крыніц праводзіцца аналіз умоў працы рабочых на фабрычна-заводскіх прадпрыемствах беларускіх губерняў у пачатку XX ст. Параўноўваюцца ўмовы жыцця розных катэгорыяў фабрычна-заводскога пралетарыята ў Беларусі.

Ключавыя словы: Беларусь; рабочы; прамысловасць; 1907–1914 гг.; пралетарыят; фабрычна-заводскі; беларускія губерні; умовы жыцця; умовы працы.

СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКИЕ УСЛОВИЯ ЖИЗНИ ФАБРИЧНО-ЗАВОДСКИХ РАБОЧЫХ В НАЧАЛЕ XX в.

Е. В. Масловский

«СИТИ БАС» ЧУП, пр. Независимости, 11, корп. 2, оф. 215, 220030, г. Минск, apm2021vad@yandex.by

На основании архивных и статистических источников проводится анализ условий труда рабочих на фабрично-заводских предприятиях белорусских губерний в начале XX в. Сравниваются условия жизни различных категорий фабрично-заводских пролетариата в Беларуси.

Ключевые слова: Беларусь; рабочий; промышленность; 1907–1914 гг. пролетариат; фабрично-заводской; белорусские губернии; условия жизни; условия работы.

SOCIO-ECONOMIC CONDITIONS OF LIFE OF FACTORY WORKERS IN THE BEGINNING OF THE XX CENTURY

Y. V. Maslouski

“CITY BUS” Private Unitary Enterprise, Minsk, Nezavisimosti Avenue, 11/2, room 215, apm2021vad@yandex.by

On the basis of archival sources and statistical analyzes working conditions of workers in the factory enterprises of the Belarusian provinces in the early XX c. We compare the living conditions of the various categories of the factory proletariat in Belarus.

Keywords: Belarus; worker; industry; 1907–1914; proletariat; factory; Belarusian province; living conditions; working conditions.

Важным паказчыкам умоў жыцця і працы фабрычна-заводскіх рабочых з’яўлялась і з’яўляецца працягласць рабочага дня і колькасць рабочых дзён у год. Ад колькасці гадзін на працы залежыла якасць жыцця шэрагавага рабочага: магчымасць правядзення досуга, акрамя адпачынку дома, ад-

сутнічала ў выпадку рабочага дня даўжэй за 12 гадз. тлумачыцца гэта шэрагам фактараў: выдаткамі часу на дарогу да працы і дамоў, неабходнасцю выдаткаваць 8 гадз. на сон. Менавіта таму важным пытаннем для аналізу становішча пралетарыята цэнзавай прамысловасці з'яўляецца даследванне працягласці рабочага дня.

Працягласць рабочагага дня на прамысловых прадпрыемствах Беларусі, падпарадкаваных наглядзе фабрычнай інспекцыі, у разгляданы час рэгламентавалася законам ад 2 чэрвеня 1897 г. [1]. У цэлым, па фабрычна-завадской прамысловасці ў вывучаемыя перыяд час працы скарачаўся. Для параўнання, у 70–80-я гг. XIX ст. рабочы дзень налічваў 12–14 гадзін, а ў 1913 г. ужо 9–10 гадзін [2, арк. 82]. Шмат для падобных зменаў было зроблена ў перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг. У гэты час рабочы дзень скараціўся да 8–9 гадзін, які на многіх прадпрыемствах быў ўведзены явачным парадкам. Аднак, пасля рэвалюцыі, шмат у чым з-за дэпрэсіі, якая ахапіла эканоміку Расійскай імперыі, а значыць і беларускіх губерняў, фабрыканты дамагліся падаўжэнне рабочага дня да 10–10,5 гадзін у сярэднім [3, арк. 84–88].

Варта адзначыць, што на значнай колькасці прадпрыемстваў беларускіх губерняў рабочыя працавалі 8 гадзінаў з перапынкам на абед. Так было на Дабрушкай папяровай фабрыке, на Шклоўскай папяровай фабрыке [4, арк. 8]. Рабочыя Цэнтральнай электрастанцыі г. Віцебска таксама працавалі па 8 гадзінаў у 3 змены: 1 змена ад 7:00 да 15:00, 2 змена ад 15:00 да 23:00, 3 змена ад 23:00 да 7:00 [5, арк. 16].

Іншая сітуацыя была на фабрыке ангельскіх ложкаў «Меркурый» у г. Віцебску. У Правілах унутранага распарадку фабрыкі на 1907–1910 гг. паведамляецца, што праца на фабрыцы вядзецца ў 2 змены. 1 змена з 6-й раніцы да 6 вечара з двума перапынкамі: з 8:00–8:30 і 12:00–13:00. Другая змена з 19:00 да 5:00 з перапынкам з 00:00 да 01:00. У перадсвяточныя дні праца скончвалася на 30 хвілін раней, тое ж было па суботах. Асобна былі прапісаны святы хрысціян як выходныя і святы габрэяў. Агульная колькасць святочных дзён у год складала 20. Перад Калядамі праца скончвалася для хрысціян не пазней поўдня [6, арк. 22]. Атрымоўваецца, што гэтым прадпрыемстве працавалі па 10,5 гадзін пяць дзён на тыдзень, ў суботу 10 гадзін. Падобная сітуацыя была тыповай для беларускіх губерняў і назіралася на большасці прадпрыемстваў Віцебскай губерні [6].

Акрамя працягласці рабочага дня, варта разгледзець і колькасць рабочых дзён. Старэйшы фабрычны інспектар Віцебскай губерні у 1907–1912 гг. пры складанні агульнай сумы выплаты пацярпелым, якія атрымалі пашкоджанні падчас працы на прадпрыемстве, лічуў рабочы год у 290,5 дзён [7, арк. 21–28].

Варта прааналізаваць ўмовы працы рабочых беларускіх губерняў. Менавіта яны з’яўляюцца адным з галоўных крытэрыяў для аднаўлення рэальнай карціны сацыяльна-эканамічнага становішча рабочага.

Тагачасныя дактары пішуць, што шкодны ўплыў на здароў гарбароў аказвала ўдыханне пылу ў майстэрнях для ачысткі шчаціння. Усе звароты датычыліся хвароб скуры і лёгкіх. Загадчык фабрычна-завадской амбулаторыі г. Мінска доктар С. Л. Саламонаў канстатуе, што амаль усе звароты тычыліся хвароб скуры і лёгкіх: «Сухая скура, пакрытая рознымі высыпкамі, паміж якімі пераважаюць Pithyriasis і Acne; атрафія падскурнага тлушчавага пласта, запаў грудзі і значныя ўчасткі ўшчыльнення лёгачнай тканіны сутнасць звычайных з'яў ў гэтых хворых». Убіраючыся ў скуру і дыхальныя органы, пыл ад шчаціння даваў хваробатворным мікраарганізмам спрыяльную глебу для іх далейшага развіцця [8, с. 283–286]. Аднак на гэтай і на іншых гарбарных прадпрыемствах існавала магчымасць даволі хуткага прафесійнага развіцця. Рабочы-гарбар, навучыўшыся вырабу і ачыстцы шчаціння, часта пераходіў да іншай галіны гэтай вытворчасці: да вырабу шчотак, дзе яму даводзілася мець справу з чыстай пазбаўленай пылу шчаціннем і такім чынам рабочы меў магчымасць, калі не зусім акрыяць ад сваіх хвароб, дык, прынамсі, пазбавіцца ад далейшага разбурэння арганізма. Падобнае пацвярджаецца ва ўспамінах Зміцера Жылуновіча [9, с. 154–168].

Аднымі з найгоршых былі ўмовы працы на тытунёвых фабрыках, дзе хварэлі самі працоўныя і члены іх сем’яў. У мінскую фабрычна-завадскую амбулаторыя за 1907 г. яны звярнуліся 975 разоў. Найбольшая колькасць дзіцячых хвароб, па дадзеных С. Л. Саламонава прыпадала на дзяцей тытуннікаў. Рахітызм сярод іх быў звычайнай з’явай. Заробкі гэтых рабочых, былі параўнальна з металургамі невялікімі, таму жонкі гэтых рабочых павінны былі працаваць на фабрыцы або займацца рамяством для таго, каб пракарміць сям'ю. Жылі яны ў цесных памяшканнях. Дактары адзначаюць, што «за детьми никто не смотрит, целый день дети предоставлены сами себе, и неудивительно, что число детских болезней здесь самое большое» [8, с. 287].

Шкодны ўплыў пылу на арганізм працоўных назіраўся таксама ў друкарнях. На дадзеных вытворчасцях дзейнічаў свінцовая пыл, які, всасываясь ў арганізм, ствараў хранічнае атручванне яго, якое выяўлялася ў з'явах раздражнення нервовай сістэмы і засмучэннях з боку кішачніка рабочых друкарняў. Па ступені захворванняў рабочыя друкарняў займалі чацвёртае месца ў Мінску: 1 037 выпадкаў за 1907 г. [8, с. 288]. Можна мяркаваць, што падобныя сітуацыі была на прадпрыемствах іншых беларускіх губерняў.

Адносна небяспечна было працаваць на металургічных прадпрыемствах. Напрыклад, у Мінску найбольшая колькасць зваротаў у фабрычна-

завадскую амбулаторыю, 1 680 разоў за 1907 г. прыпадала штогод менавіта на металаапрацоўчыую галіну – найбуйнейшыя з заводаў Мінску вызначанага часу: каля 400 рабочых. Тут рабочыя часта атрымалі раненні, траўмы і апёкі. Амаль усе хірургічныя выпадкі належалі гэтым заводам [8, с. 287].

Акрамя прамысловых устаноў узгаданых галін вытворчасці, на якіх існавала небяспека заразіцца сібірскай язвай, а таксама шэрагу іншых цяжкіх хвароб, астатнія вытворчасці Беларусі не ўяўлялі нічога спецыфічнага для рабочых у сэнсе захворванняў і ў гэтых адносінах апошнія былі схільныя да ўсякіх выпадковых захворванняў нароўні з астатнім працоўным насельніцтвам.

Дарэвалюцыйныя аўтары характарызавалі жыллёвыя ўмовы фабрычных рабочых у асноўным як нездавальняючыя. У гэтых характарыстыках пераважаў апісальна-эмацыйны погляд, які мяжуе са здзіўленнем аўтараў тымі ўмовамі, у якіх даводзілася пражываць працоўным. Шэраг аўтараў з ліку лекараў, занятых арганізацыяй супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў або фабрычных інспектараў, фабрыкантаў, якія паўсядзённа сутыкаліся з патрэбамі работнікаў, саміх рабочых пакінулі падрабязныя апісанні ўладкавання, якасці і асноўных параметраў жылля фабрычных рабочых. Грамадскія і партыйныя дзеячы разглядалі нездавальняючыя жыллёвыя ўмовы ў ліку прычын забастовак. Звярталі ўвагу на такія паказчыкі як колькасць жыхароў у адным памяшканні, аб'ём паветра, які выдаткоўваўся на аднаго жыхара, забяспечанасць жылля мэбляй і неабходнымі для жыцця выгодамі і вядома кошт жылля. Большасць з іх адзначала антысанітарыю, цеснату і самую прымітыўную арганізацыю побыту.

У пачатку XX ст. некалькі палепшыліся жыллёва-бытавыя ўмовы прамысловых рабочых. У 1918 г. з 5 085 рабочых Віцебскай губерні ахопленых прафесійным перапісам 1 090 валодалі домам. Асобна ўказываецца, што 986 рабочых жылі ў сваім домам ці доме сваёй сям'і, 2 817 жылі на кватэры, 718 у асобным памяшканні ад фабрыкі, 72 у казармах ад фабрыкі, 498 рабочых не паведамілі, дзе жывуць. Падобны перапіс быў праведзены ў Магілёўскай губерні, дзе было апытана 5 627 рабочых. З гэтых людзей – у 2 268 чалавек меўся свой дом ці дом сваёй сям'і. Дадаецца, што 2 041 рабочы жылі ў сваім доме ці доме сваёй сям'і, 2 062 у кватэры, 877 у асобных памяшканнях ад фабрыкі, 140 у фабрычных казармах, яшчэ 507 рабочых не паведамілі не жывуць. Прыведзеныя дадзеныя варта ўлічваць пры разглядзе стану забеспячэння жыллём рабочых, прымаючы пад ўвагу, што перапіс быў прыведзены ва ўмовах вядзення Першай сусветнай і Грамадзянскай вайны толькі ў 2 беларускіх губернях [10; с. 271].

Вышэй адзначалася, што рабочыя Віцебская і Магілёўская губерні зараблялі менш, таму можна сказаць што стан жыллёвага забеспячэння рабочых астатніх беларускіх губерняў быў на лепшым узроўні. Невялікая іх

частка карысталася казённымі кватэрамі, мела ўласныя дома або жыла ў казармах. Значная частка рабочых пражывала ў прыватных дамах, здымаючы там пакой [11].

Удзельная вага прадпрыемстваў цэнзавай прамысловасці, якія дзейнічалі ў сельскай мясцовасці ў 1913 г. склала 68 %, у 1900 г. 65,7 % [1; с. 145]. Адпаведна за 13 гадоў было і павелічэнне ўдзельнай вагі рабочых, якія працавалі ў сельскай мясцовасціў. Прадпрымальнікам для таго, каб прыцягнуць кваліфікаванага пралетарыя з гарадоў, неабходна было даць ім кватэры. У пацверджанне гэтаму можна прывесці ліст-скаргу фабрыканта Мерліса старэйшаму фабрычных інспектару Віцебскаму губерні І. Мяцельскаму. У лісце паведамляецца, што ў Гарадоцкім павеце Віцебскай губерні Мерліс пабудаваў буйныя шкляны і лесапільныя заводы з лікам рабочых каля 500. Большасць з іх былі прыезджымі. Для пражывання рабочых ён на свае грошы пабудаваў кватэры [12, с. 7–11]. Дадзены выпадак не адзіны і прыведзены як яркі прыклад паляпшэння жыллёвага добраўпарадкавання рабочых таго часу.

Гэту гіпотэзу пацвярджаюць зводы справаздач фабрычных інспектароў, якія асвячаюць прычыны скаргаў рабочых. Адной із найменш распаўсюджаных падстаў скарг з'яўляецца «недовольство хозяйскими квартирами или харчами».

Можна прывесці вытрымку з тлумачальнай запіскі старэйшага фабрычнага інспектара Мінскай губерні. У частцы, якая тычылася скаргаў заведываючых прадпрыемствамі, ён адзначае, што звольненыя рабочыя вінакурнага завода братоў Ракаўшчыкоў адмаўляюцца выселяцца з гаспадарчых кватэр [13; арк. 28].

Некаторая частка рабочых здымала асобныя пакоі ў майстроў прадпрыемстваў. Падобны пакой Зміцер Жылуновіч здымаў свайго майстра гарбарнага прадпрыемства г. Мінск у 1909 г. плацячы за яго разам з харчаваннем 3 руб. са сваіх 6 руб. заробку за тыдзень. Жылуновіч апісвае пакой наступным чынам: «мініатурны пакоік без жаднае мэблі, акрамя аднаго крэсла», у якім быў ложак, а свае прылады да пісання, прадметы «туалета і кніжкі злажваў на вакне». Праз некаторы час Жылуновіч пераехаў у г. Бабруйск, дзе за падобныя грошы здымаў пакой, але ў лепшага гаспадара з лепшымі ўмовамі жыцця і харчаваннем, таму бабруйскі перыяд свайго жыцця ён ацэньваў больш станоўча чым мінскі [9; с. 159–161].

У снежні 1909 г. Жылуновіч пераязджае ў г. Палтаву, дзе таксама працуе гарбаром. У гэтым горадзе ўмовы жыцця і працы былі значна горш у параўнанні з беларускімі. Горшымі ён называе і ўмовы харчавання: «дзень у дзень (кармілі) адным і тым жа ўкраінскім баршчом і падазроным мясам. Абеду не было, бо не хапала часу на дарогу з майстэрні на кватэру. Я браў

з сабою кавалак булкі ці хлеба з каўбасою або з салам і падзакусваў у майстэрні» [9; с. 164–168]. Можна меркаваць, што харчаванне рабочых беларускіх губерняў было на лепшым узроўне за палтаўскае.

Падобнае пацвярджаецца ўспамінамі Язэпа Голубева, які працаваў чыгуначнікам у Мінску з 1902 г., але меў заробак на ўзроўне кваліфікаванага рабочага металургічнага заводу. У свой выхадны дзень 1916 г. у яго быў наступным: «хлеб с маслом, с сыром закуска, 3 стакана чаю». На абед ён, як можна зразумець з кантэксту разам з хлебам, «колбаски закусил, чаю выпил». Святочны стол на свае імяніны Голубеў апісвае наступным чынам: «ленивые щи из утки, ветчина жирная, хлеб своего печенья, булка сдобная и мазурка, чай хороший». Падобны стан харчавання быў і ў рабочага падчас Першай сусветнай вайны, калі Мінск быў прыфрантавым горадам пры коштах, якія па сведчанню самаго Голубева выраслі з даваеннымі амаль у 5 разоў [14, с. 41; 44; 60]. Улічваючы складанасць часу, можна меркаваць, што рабочыя металлургічных, гарбарных і іншых заводаў, дзе сярэдні заробак быў на ўзроўні 35 руб. у месяц мелі магчымасць падтрымліваць ўзровень харчавання ня горш за апісанае вышэй.

Аднак, на прадпрыемствах дрэваапрацоўчай галіны, якія ствараліся далёка ад населеных пунктаў, умовы жыцця рабочых можна назваць цяжкімі. Так, у справе аб адкрыцці лесапільнага завода памешчыка Косава ў м. Лукішкі Віцебскага павета у дазволе на адкрыццё прадпрыемства фабрычны інспектар адзначыў умовы дазволу працы на ім «павінны быць выкананы наступныя патрабаванні 1. і 2. Пункты аб рабочых механізмах, а 3 п. “Жылыя памяшканні” павінны быць зроблены так, каб кожны рабочы меў асобную ложак/нару, аддзеленую дошчачкай у 4 вяршкі і павінна быць падгалоўе» [15]. Падобнае патрабаванне фабрычнага інспектара дазваляе зразумець нізкую мяжу патрабаваннях тагачасных улад для абсталявання жылых памяшканняў рабочых фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў.

Такім чынам, ёсць падставы сцвярджаць, што становішча рабочых у 1907–1914 гг., умовы іх працы і бытавыя ўмовы жылля рабочых істотна адрозніваліся: на шэрагу прадпрыемстваў рабочым давалі бясплатныя кватэры ці настолькі высокі заробак, што яны маглі дазволіць сабе здымаць кватэру ці набыць дом. На шэрагу іншых прадпрыемстваў заробкі рабочых не дазвалялі здымаць кватэру, але можна сцвярджаць, што нават чорнарабочыя мелі магчымасць здымаць сабе асобны пакой у наёмнай кватэры.

Варта адзначыць цяжкія жыллёва-бытавыя ўмовы, а таксама шкодныя для здароўя ўмовы працы на гарбарных, запалкавых, шкляных прадпрыемствах рэгіёну. Таксама цяжкімі для жыцця і адпачынку, і траўманебяспечнымі падчас працы для рабочых можна лічыць большасць тагачасных дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў Беларусі. Аднак на шэрагу прыватных прадпрыемстваў: такіх як Добрушская папяровая фабрыка і другіх умовы

працы адпавядалі патрабаванням рабочых. На многіх з такіх прадпрыемстваў былі ўладкованыя бясплатныя кватэры, медыцынскае абслугоўванне, школы для дзяцей рабочых.

Дынаміка росту вытворчага траўматызму была невялікай. У цэлым супадаючы з дынамікай росту агульнай колькасці фабрычна-заводскіх рабочых. З 1907 па 1913 гг. колькасць рабочых, з якімі адбыліся няшчасныя выпадкі на вытворчасці вагалася паміж 1,1 і 1,2 % у год ад колькасці пралетарыята цэнзавай прамысловасці. У статыстыку амаль не ўвайшлі звароты рабочых на захворванні, атрыманныя падчас працы. Аднак, згодна з прыведзенымі вышэй сведчаннямі дактароў, можна сцвярджаць, што на тытунёвых і гарбарных прадпрыемствах былі найбольш шкодныя ўмовы працы для здароўя рабочых. Менавіта сярод гэтай катэгорыі пралетарыята былі распаўсюджаны цяжкія лёгачныя, скураныя захворванні, а таксама востраінфекцыйныя захворванні, часам сібірская язва, якія былі найбольш небяспечны для здароўя.

Бібліяграфічны спіс

1. Материалы по изданию закона 2 июня 1897 г. Об ограничении и распределении рабочего времени в заведениях фабрично-заводской промышленности. СПб, 1905. Электронный ресурс: http://www.hist.msu.ru/Labour/zakon1897/index.htm
2. Свод отчётов фабричных инспекторов за 1913 г. Петроград.: тип. В. Ф. Киршбаума, 1914. 82 с.
3. *Бурачонак, А. В.* Прававое рэгуляванне сацыяльна-працоўных адносін на фабрычназаводскіх прадпрыемствах Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / А. В. Бурачонак // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны : навук. зб. Вып. 7. Мінск : БДУ, 2012. С. 80–89.
4. ЦДГАУ у Кіеве. Фонд 575. Спр. 610. Воп.1. Арк. 1–25. Пояснительная записка старших фабричных инспекторов статистическим данным об увечьях рабочих на фабриках Киевского фабричного округа в 1911 г.
5. НГАБ. Фонд 2592. Воп. 1. Спр. 253. Арк. 16. Переписка владельцев промышленных предприятий со старшими фабричным инспектором Витебской губернии об изменении правил внутреннего распорядка.
6. НГАБ. Фонд 2592. Воп. 1. Спр. 118. Арк. 1–19. Правила внутреннего распорядка и расценки заработной платы рабочим фабрики английских кроватей «Меркурий» в гор. Витебске.
7. НГАБ. Фонд 2592. Воп. 1. Спр. 140. Арк. 21–25 адв. Акты о несчастных случаях и соглашений владельцев предприятий с рабочими о выдаче пособий по нетрудоспособности в Витебской губернии.
8. *Соломонов, С. Л.* Медицинская помощь фабрично-заводским рабочим г. Минска // Труды первого съезда врачей Минской губернии, 22–25 января 1908 г. / под редакцией М. А. Поляка. Минск, 1908. С. 279–289.
9. Цішка Гартны. Дваццаць гадоў назад (успаміны з мінулага) / Гартны Цішка // Полымя. 1929. № 5. С. 162–180.
10. *Савицкий, Э. М.* Рабочее движение в Беларуси (июнь 1907 – февр. 1917 гг.). Дисс. д-ра. ист. наук. Минск : БелНИЦДААД, 1995. 295 с.

11. *Абезгауз, З. Е.* Рабочий класс Белоруссии в начале XX в. (1900–1913 гг.). – Минск: Наука и техника, 1977. – с 134

12. НГАБ. – Фонд 2592. – Воп. 1. – Спр. 217. Арк. 1–29. Канцелярия старшего фабричного инспектора Витебской губернии, г. Витебск. Переписка старшего фабричного инспектора Витебской губернии с витебским губернатором о забастовках рабочих, о принятии мер борьбы с пьянством, об открытии школы и больничной кассы на стекольном заводе «Труды» Мерлиса в Городокском уезде Витебской губернии. 5 февраля – 10 декабря 1913 г.

13. ЦДГАУ у Кіеве. Фонд 575. Спр. 442. Воп. 1. Арк. 28–33. Сводный пояснительный отчёт фабричной инспекции Минской губернии за 1906 г.

14. «Счастье мое... »: Дневники Иосифа Голубева, 1916–1923 гг. / [Предисл. Г. Буравкина. – Мн.: Энциклопедикс, 2002. – 441, [1] с., [6] л. ил.

15. НГАБ. Фонд 2592. Воп. 1. Спр. 226. Арк. 5. Дело об открытии лесопильного завода помещика Коссова в им. Лукишки Витебского у. Список рабочих завода.

УДК 364.3-058.38(476)(091)+364.65-058.38(476)(091)

ПОМОЩЬ СЕМЬЯМ СОЛДАТ, МОБИЛИЗОВАННЫХ В БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЯХ НА РУССКО-ЯПОНСКУЮ ВОЙНУ (1904–1905 гг.)

Н. С. Моторова

Витебский государственный университет им. П. М. Машерова, пр. Московский, 33, 210038, г. Витебск, motorova@ro.ru

В результате мобилизации солдат на Русско-японскую войну (1904–1905 гг.) в белорусских губерниях стала актуальной помощь их семьям. Ее основные формы были закреплены законодательно (в Воинском уставе и Уставе о земских повинностях) и включали предоставление продуктовых или денежных пособий, обеспечение нуждавшихся жильем. Сироты могли получать стипендии на обучение. Реализация помощи была возложена на органы местного самоуправления и сельские общества. Государство взяло на себя обязанности по ее дополнительному финансовому обеспечению, а с 1906 г. начало выплачивать пенсии вдовам погибших солдат.

Ключевые слова: Русско-японская война; белорусские губернии; продовольственные пособия; денежные пособия; стипендии; пенсии.

ASSISTANCE TO THE FAMILIES OF SOLDIERS MOBILIZED IN THE BELARUSIAN PROVINCES FOR THE RUSSIAN-JAPANESE WAR (1904–1905)

N. S. Motorova

Vitebsk State University named after. P. M. Masherova, Moskovsky Ave., 33, 210038, Vitebsk, motorova@ro.ru

As a result of the mobilization of soldiers to the Russo-Japanese War (1904–1905) in the Belarusian provinces assistance to their families became urgent. Its main forms were enshrined in law (in the Statute of Liability for Military Service and the Statute of Zemstvo Duties) and

included the provision of food or cash benefits, and the provision of housing for those in need. Orphans could receive scholarships for education. The implementation of assistance was entrusted to local governments and rural communities. The state assumed responsibility for additional financial support and in 1906 began paying pensions to the widows of dead soldiers.

Keywords: Russian-Japanese War; Belarusian provinces; food benefits; cash benefits; scholarships; pensions.

В белорусских губерниях помощь нуждавшимся семьям и детям, оставшимся без попечения родителей, традиционно относилась к обязанностям ближайших родственников и сословных групп, к которым они принадлежали. Такая практика была закреплена законодательно, и полностью соответствовала менталитету и традиционным духовным ценностям белорусского народа. Однако по мере размывания сословной структуры общества после отмены крепостного права в 1861 г., а также увеличения числа нуждавшихся в помощи (как правило, это происходило в условиях чрезвычайных ситуаций или социальных бедствий, например, во время неурожаев, эпидемий, военных действий) в оказании помощи начали активно участвовать и органы местного самоуправления, являвшиеся элементом государственного управления в имперский период. На фоне разворачивавшихся модернизационных процессов осуществлялся поиск оптимальной модели взаимодействия государства и общества по оказанию поддержки наиболее уязвимым категориям населения и решению острых социальных проблем.

В качестве примера апробации подобной модели можно назвать оказание помощи нуждавшимся семьям мобилизованных солдат во время Русско-японской войны 1904–1905 гг. Ее основные формы были закреплены законодательно. Так, согласно статьям 37, 38 и 332 Устава о воинской повинности на органы местного и сословного самоуправления возлагались обязанности призрения семей нижних воинских чинов, чинов запаса и ратников ополчения, направленных на действительную службу, а также раненых, убитых или пропавших без вести во время боевых действий [11, с. 7–8, 64]. Если они не обладали достаточными средствами для оказания помощи, то могли ходатайствовать о предоставлении казенного пособия, что закреплялось статьей 38 [11, с. 8]. Формы помощи конкретизировались в приложении к ней – во Временных правилах о призрении семейств чинов запаса и ратников государственного ополчения, призванных в военное время на службу. Так, жены и дети вне зависимости от сословной принадлежности могли претендовать на получение от городов или селений – бесплатного помещения с отоплением либо приюта; от земств (в белорусских губерниях – управлений по делам земского хозяйства) – продовольственного пособия либо его денежного эквивалента, причем на одного члена се-

мьи полагалось не менее 1 пуда 28 фунтов муки, 10 фунтов крупы и 4 фунтов соли в месяц *(1 пуд составлял 16,38 кг, 1 фунт – 453,6 г.)*. Что касается других членов семьи, находившихся на попечении погибшего солдата, то оказание им помощи возлагалось на городские и сельские общества, к которым они принадлежали [11, с. 99].

Основные расходы по обеспечению призрения семей нижних воинских чинов и ратников ополчения фактически ложились на земства, а в Беларусь – на управления по делам земского хозяйства. Это было закреплено статьей 36 Устава о земских повинностях [12, с. 137]. Кроме того, согласно Временным правилам о призрении семейств чинов запаса и ратников государственного ополчения, призванных в военное время на службу, для оказания им помощи органы самоуправления могли совершать заимствования из продовольственного капитала, а также городских и сельских запасных магазинов [11, с. 100].

В белорусских губерниях с началом Русско-японской войны основные расходы по поддержке семей мобилизованных солдат легли на управления по делам земского хозяйства Минской, Витебской и Могилевской губерний, о чем свидетельствуют их делопроизводственные материалы. Основной формой помощи в полном соответствии с действовавшим законодательством стало предоставление продовольственных пособий. Например, 17 марта 1904 г. Минский губернский комитет по делам земского хозяйство выделил на эти цели в распоряжение Минской губернской управы 1 000 руб. За счет этих средств должны были формироваться ежемесячные продовольственные пособия. В целом их структура и нормы соответствовали рекомендованным правительством. Каждое пособие включало 2 пуда муки, 20 фунтов крупы, 4 фунта соли, 4 фунта сала. Допускалось назначение пособия в денежной форме, размер которого определялся исходя из стоимости продуктов, однако из расчета не более 3 руб. на одного человека [10, с. 43, 45]. К июлю 1904 г. стало очевидно, что выделенных средств недостаточно для оказания помощи всем нуждавшимся семьям. В этой связи было дополнительно выделено 3 000 руб. из свободных остатков земской сметы текущего года [10, с. 141, 166, 168].

Именно благодаря материалам Минского губернского комитета по делам земского хозяйства можно примерно определить количество нуждавшихся в помощи. Как видно из доклада Минской губернской управы, представленного на заседании 23 декабря 1904 г., из 9 уездов Минской губернии на действительную службу было призвано более 24 тыс. человек. У них осталось свыше 11 тыс. семей, состоявших из более чем 43 тыс. человек. В случае выплаты пособия каждому из них из расчета 1 руб. 86 коп. на протяжении года управлению по делам земского хозяйства дополнительно требовалось до 1 млн. руб. Это были огромные средства, которыми оно не располагало, а потому решило просить о предоставлении беспроцентную ссуду из казны [10, с. 211–212, 214, 217, 221].

В Витебской губернии по данным на начало 1905 г. размер пособия составлял 2 руб. 10 коп., а чтобы обеспечить всех нуждавшихся на протяжении года требовалось 600 тыс. руб. В данном случае также было решено обратиться за предоставлением беспроцентной ссуды [2, с. 39, 41]. В Могилевской губернии в начале 1905 г. Губернский комитет по делам земского хозяйства возбудил перед правительством ходатайство о выделении беспроцентной ссуды в размере 870 тыс. руб. для оказания помощи семьям мобилизованных солдат [1, с. 21, 31].

В городах нуждавшимся семьям призванных на военную службу нижних чинов и ратников ополчения выплачивались квартирные пособия. Например, в Себеже на эти цели было выделено 300 руб. Размер пособия колебался от 3 до 4 руб. в зависимости от состава семьи [6, л. 96, 165]. Невельская городская дума на те же цели выделила 200 руб. [8, л. 316].

В условиях дефицита свободных средств для оказания помощи всем нуждавшимся семьям мобилизованных солдат органы местного самоуправления обращались к хорошо зарекомендовавшей себя практике привлечения общественности через создание участковых попечительств. Так, в Витебской губернии такие попечительства были созданы в двух уездах – Витебском и Велижском [2, с. 37–39, 41–42]. Работа подобных учреждений осуществлялось по нескольким направлениям. Они выясняли, в чем нуждались семьи, и по мере возможности обеспечивали их необходимым, а также собирали добровольные пожертвования.

Отдельным видом помощи являлось назначение стипендий для детей, чьи отцы погибли на войне с Японией. Так, согласно предложению Министерства народного просвещения Двинская городская дума в 1904 г. учредила в реальном училище и женской гимназии по две стипендии в размере 75 руб. каждая, в двух городских и двух ремесленных училищах – по одной стипендии в размере 50 руб. каждая [7, л. 11]. Витебский губернский комитет по делам земского хозяйства выделил 1 тыс. руб. на учреждение подобных стипендий в низших учебных заведениях [3, с. 23, 30]. Вместо стипендий осиротевшим учащимся могла выплачиваться адресная денежная помощь. Например, в Слуцке для поддержки детей нижних чинов и офицеров, учившихся в местной гимназии, Городская дума направила 100 руб. [5, л. 5–5 об.].

Выплата стипендий для данной категории сирот продолжалась и после завершения Русско-японской войны. Так, небольшие пособия на эти цели на протяжении 1912–1914 гг. выделяли Борисовское, Минское, Бобруйское, Игуменское, Слуцкое уездные земские собрания [4, с. 71, 72, 73, 74].

26 апреля 1906 г. был принят закон, который конкретизировал участие государства в оказании помощи семьям лиц, погибших на войне с Японией. Он закрепил за вдовами нижних чинов и ратников ополчения право на пенсию от казны. Ее размер составлял 36 руб. в год. Данное право распространялось не только на вдов погибших во время боевых действий, но и умер-

ших от ран либо болезней, пропавших без вести. Обязанность по назначению пенсий была возложена на казенные палаты. Заявление могло представляться как в письменной, так и в устной форме, причем не только в казенную палату, но и в уездную земскую или городскую управу, участковому земскому начальнику, уездному или полицейскому управлению, воинскому начальнику, волостному правлению. Перечисленные учреждения и должностные лица должны были составить на его основании краткий протокол и в течение трех дней направить в казенную палату по месту жительства заявительницы. Решение о назначении пенсии принималось в течение трех недель. Что касается обеспечения других членов семьи погибшего (детей, ставших круглыми сиротами, и лиц, находившихся на его попечении – родителей, дедушек, бабушек, братьев и сестер), то данная обязанность по-прежнему закреплялась за органами земского, городского и сословного самоуправления [9, с. 495–496].

Таким образом, основные виды помощи семьям солдат и ратников ополчения, мобилизованных из белорусских губерний на Русско-японскую войну, были регламентированы законодательно – в Уставе о воинской повинности и Уставе о земских повинностях. Они включали в себя предоставление продовольственных пособий в виде фиксированного набора продуктов либо выплату денежного пособия, эквивалентного их стоимости, обеспечение нуждавшихся жильем. Кроме того, предусматривалась возможность выплаты дополнительных стипендий за счет местных бюджетов для обучения осиротевших детей погибших воинов. Основным ресурсом для обеспечения перечисленных расходов являлись земские повинности, то есть средства, находившиеся в распоряжении органов земского самоуправления (в Беларуси – управлений по делам земского хозяйства). В случае их дефицита допускалась возможность предоставления пособий из казны, к чему активно прибегали в органы самоуправления белорусских губерниях. Собственно государство взяло на себя один расход – выплату пенсий вдовам солдат и ратников ополчения, что законодательно было закреплено в 1906 г.

Библиографический список

1. Журналы годичного собрания Могилевского губернского комитета по делам земского хозяйства сентябрьской сессии 1905 года. Могилев: Типо-литогр. Я. Н. Подземского, 1905. 10, 150 с.

2. Журналы обыкновенного собрания Витебского губернского комитета по делам земского хозяйства заседаний с 28 января по 2 февраля [1905 г.] включительно с приложениями. Витебск: Типо-литогр. наследников М. Б. Нейман, 1905. [546] с. разд. паг.

3. Журналы II-го годичного собрания Витебского губернского комитета по делам земского хозяйства заседаний с 1 по 10 сентября 1904 года и приложения к ним. Витебск: Губерн. тип. и тип. наследников М. Б. Неймана, 1904. 184, [24], XII с.

4. Краткий обзор деятельности земств Минской губернии в первом трехлетии. [Минск : б. и., 1914]. 105 с.

5. Национальный исторический архив Беларуси (далее – НИАБ). Ф. 22. Оп. 1. Д. 934.

6. НИАБ. Ф. 2508. Оп. 1. Д. 2587.

7. НИАБ. Ф. 2508. Оп. 1. Д. 3773.
8. НИАБ. Ф. 2508. Оп. 1. Д. 3774.
9. Полное собрание законов Российской империи. Собрание 3 : [в 34 т.]. Т. 26, отдние 1 : 1906. СПб. : Гос. тип., 1909. 1141, [29] с.
10. Сборник постановлений Минского губернского комитета по делам земского хозяйства за 1904 год. Минск : Паровая типо-литогр. И. и В. Тасьман, 1905. 254 с.
11. Устав о воинской повинности. Издание 1897 года // Свод законов Российской империи : полн. текст всех 16 т., соглас. с послед. продолж., постановлениями, изд. в порядке ст. 87 Зак. осн., и позднейшими узаконениями : в 5 кн. / сост.: Н. П. Балканов, С. С. Войт, В. Э. Герценберг ; под ред. и с примеч. И. Д. Мордухай-Болтовского. Изд. неоф. Кн. 2, т. 4. СПб., [1912?]. С. 1–128.
12. Устав о земских повинностях. Издание 1899 года // Свод законов Российской империи : полн. текст всех 16 т., соглас. с послед. продолж., постановлениями, изд. в порядке ст. 87 Зак. осн., и позднейшими узаконениями : в 5 кн. / сост.: Н. П. Балканов, С. С. Войт, В. Э. Герценберг ; под ред. и с примеч. И. Д. Мордухай-Болтовского. Изд. неоф. Кн. 2, т. 4. СПб., [1912?]. С. 129–367.

УДК 355:94 (470)"1794–1874"

РЕКРУТСКАЯ ПОВИННОСТЬ КАК ИНСТРУМЕНТ ВОЗДЕЙСТВИЯ НА ЭТНО-КОНФЕССИОНАЛЬНЫЕ ПРОЦЕССЫ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В 1794–1874 гг.

Ф. А. Некрашевич

Академия Министерства внутренних дел Республики Беларусь, Минск, пр. Машерова 6А, 220005, davou@mail.ru

Рекрутская повинность являлась важным инструментом регулирования этно-конфессиональных процессов в белорусских губерниях в 1794–1874 гг. Российские власти принудительно направляли на военную службу членов деструктивных сект, а также дискредетировавших себя представителей православного духовенства. Кроме того, рекрутская повинность была призвана содействовать принудительной интеграции еврейского населения западных губерний.

Ключевые слова: Российская империя; рекруты; духовенство; евреи; секты.

RECRUITMENT AS A TOOL FOR INFLUENCING ETHNO-CONFESSIONAL PROCESSES ON THE TERRITORY OF BELARUS IN 1794–1874

F. Niekrashevich

Academy of the Ministry of Internal Affairs of the Republic of Belarus, Minsk, Masherova Av. 6A, 220005, davou@mail.ru

Recruitment was an important tool for regulating ethno-confessional processes in the Belarusian provinces in 1794–1874. The Russian authorities forcibly sent members of destructive sects, as well as discredited representatives of the Orthodox clergy, to military

service. In addition, conscription was intended to facilitate the forced integration of the Jewish population of the western provinces.

Последовательное развитие отношений между странами сделало возможным подписание 6 января 1995 г. «Соглашения о Таможенном союзе между Российской Федерацией и Республикой Беларусь», 2 апреля 1996 г. – Договора об образовании Сообщества России и Беларуси, 2 апреля 1997 г. – Договора о Союзе Беларуси и России. Принятие этих документов позволило отменить тарифные и количественные ограничения во взаимной торговле между Республикой Беларусь и Российской Федерацией, а также таможенный контроль и таможенное оформление товаров на границе двух стран. Это способствовало значительному росту взаимного товарооборота, который за один лишь 1997 г. увеличился на 40 % и составил более 9 млрд. долларов, что сделало Беларусь вторым по величине после ЕС экспортёром товаров в Россию. В конце 1990-х гг. около 60 % внешнеторгового оборота Беларуси приходилось на долю России [11, с. 103].

Важным фактором экономического роста стало строительство международного газопровода Ямал – Европа, первая очередь которого была пущена в 1999 г. По территории Беларуси проходит 575 км. газопровода, здесь построены 5 компрессорных станций: «Несвижская», «Крупская», «Слонимская», «Минская» и «Оршанская». Выгодное транспортно-географическое положение продолжило приносить доход и после обретения страной независимости [2].

В 1998 г. по отношению к уровню 1991 г. ВВП составил 82 %, продукция промышленности – 86 %, продукция сельского хозяйства – 75 %, инвестиции в основной капитал – 53 % [1, с. 12, 18, 22, 25].

Нерешенной проблемой осталась инфляция. Льготное кредитование важнейших отраслей экономики привело к резкому увеличению денежной массы и соответственно – к ускорению роста цен. Так, в 1997 г. денежная масса возросла вдвое (в 1996 г. – на 35,1 %), а уровень инфляции (декабрь к декабрю предыдущего года) достиг 63,1 % при прогнозе 27 % [7, с. 39].

Финансовый кризис в России оказал сильное негативное влияние на белорусскую экономику. 17 августа 1998 г. Правительство России и Центральный банк объявили о техническом дефолте по основным видам государственных ценных бумаг. В мировой истории это был первый случай, когда государство объявило дефолт по внутреннему долгу, номинированному в национальной валюте. В результате кризиса российские предприятия сократили закупки продукции в РБ, кроме того резкая девальвация российского рубля сделала невыгодным экспорт в РФ многих белорусских товаров. В целом экспорт товаров и услуг в Россию только в августе 1998 г. снизился по сравнению с августом 1997 г. на 13,7 %, а его валютная составляющая – на 17,4 %. В абсолютном выражении экспорт в Россию в первом полугодии 1998 г. составил в среднем за месяц в эквиваленте 421 млн. долл. В июле 1998 г. он сократился до 401 млн. долл., в августе – до 346,4 млн. долл., в сентябре экспорт в Россию составил 255,2 млн. долл. и в октябре – 324,4 млн. долл.

Помимо этого вызванный кризисом рост цен в России привел к заметному удорожанию импорта сырья и комплектующих для белорусских предприятий [11, с. 105].

В этих условиях ухудшаются экономические показатели Беларуси. В 1998 г. рост ВВП составил 8,4 %, в 1999 – 3,4 %, в 1998 г. индекс объема инвестиций в основной капитал увеличился на 25 %, в 1999 г. – уменьшился на 8 %, индекс реальной среднемесячной заработной платы в 1998 г. увеличился на 18 %, в 1999 г. – на 7 %, в 1999 г. индекс потребительских цен увеличился в 3,9 раза (в 1998 г. – в 1,7 раза). Индекс объема промышленной продукции в 1998 г. увеличился на 12,4 % (в 1997 на 18,8 %), в 1999 г. – увеличился на 10,3 % [1, с. 12, 25, 130, 45, 18]. Возрос дефицит торгового и платежного балансов.

В целях преодоления кризиса были проведены унификация валютного курса в отношении белорусского рубля и частичная либерализация цен, усилена бюджетная дисциплина, в значительной мере осуществлен перевод расчетов на денежную основу, сокращен бартер. В результате этих мер, инфляция снизилась с 251 % в 1999 г. до 108 % в 2000 г. [8].

К началу нового тысячелетия республика смогла преодолеть последствия глубоких кризисных явлений, достичь успехов в социально-экономическом развитии. В 2000 г. ВВП Беларуси составил 89,7 % к уровню 1991 г., продукция промышленности – 102 %, розничный товарооборот – 113 %, реальные располагаемые доходы населения – 92 %.

Индекс объема продукции сельского хозяйства составил только 75 % к уровню 1991 г., однако этот показатель равен 109 % к уровню 1999 г., что говорит о положительной динамики отрасли. Индекс объема инвестиции в основной капитал составил 50 % к уровню 1991 г., что равно 102 % к уровню 1999 г. [1, с. 22, 25].

Таким образом, в период 1991–1999 гг. произошла трансформация белорусской экономики. За это время Беларусь смогла перейти от падения социально-экономического развития к началу экономического роста. К началу нового тысячелетия в республике наблюдалась положительная динамика по основным экономическим показателям. Быстрому восстановлению показателей способствовало осуществление комплекса социально-экономических преобразований, становление белорусской модели социально-экономического развития, а также развитие взаимодействия с Российской Федерацией и другими партнерами по СНГ.

Библиографический список

1. 10 лет Содружества Независимых Государств (1991–2000) : Статистический сборник / Межгосударственный статистический комитет СНГ. – М. : Статкомитет СНГ, 2001. – 800 с.

2. Газопровод «Ямал – Европа» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.gazprom.ru/projects/yamal-europe/. – Дата доступа: 01.03.2023.

3. *Гранберг, А. Г.* Межреспубликанские экономические отношения накануне распада СССР / А. Г. Гранберг, В. И. Суслов // Региональное развитие и сотрудничество. – 1997. – № 0. – С. 17–25.

4. История Беларуси, вторая половина 1940-х гг. – начало XXI в.: учеб. пособие для 11-го кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / В. М. Фомин, С. В. Панов, Н. Н. Ганущенко; под ред. В. М. Фомина. — Минск: Нац. ин-т образования, 2013. – 232 с.: ил.

5. *Калачян, К. К.* Союзное государство Белоруссии и России (международно-правовые проблемы создания) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.yurclub.ru/docs/pravo/1103/1.html. – Дата доступа: 30.02.2023.

6. Министерство экономики Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://economy.gov.by/ru/history-ru/. – Дата доступа: 28.02.2023.

7. *Павловец, Ю. С.* Экономика Белоруссии. Исторические очерки XX–XXI века / Ю. С. Павловец, С. А. Шиптенко – М. : Книжный мир, 2017. – 320 с.

8. Попытки политической и экономической модернизации СССР и БССР в годы перестройки (вторая половина 1980-х гг.). Переход к рынку. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://infopedia.su/1x5371.html. – Дата доступа: 01.03.2023.

9. Постановление Верховного Совета РБ № 3249-XII от 30.09.1994. О Программе неотложных мер по выходу экономики Республики Беларусь из кризиса [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://belzakon.net/Законодательство/Постановление_Верховного_Совета_РБ/1994/94657. – Дата доступа: 30.02.2023.

10. Соглашение о создании Содружества Независимых Государств [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.mid.ru/print/?id=1673617&lang=ru. – Дата доступа: 26.02.2023.

11. Социально-экономическое развитие постсоветских стран: итоги двадцатилетия / Л. Б. Вардомский [и др.]. – М .: ИЭ РАН, 2012. – 400 с.

12. *Шимов, В. Н.* Национальная экономика Беларуси : учебник для студентов учреждений высшего образования по экон. спец. / В. Н. Шимов [и др.] ; под ред. В. Н. Шимова. – 4-е изд., перераб. и доп. – Минск : БГЭУ, 2012. – 649 с.

УДК 94(476)+94(100)"1914/1917"

ФІНАНСАВАЯ ДАПАМОГА СЕМ'ЯМ ВАЙСКОЎЦАЎ У ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ (1914–1917 гг.)

Я. А. Бодрыкаў

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, yaugen.bodrykau@yandex.by

Мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца вызначэнне памераў і форм сацыяльнай дапамогі сем'ям вайскоўцаў у Віцебскай губерні з боку дзяржаўных інстытутаў і грамадскіх арганізацый. У даследаванні звяртаецца ўвага, што дзяржаўнай дапамогі для падтрымання сем'яў мабілізаваных ніжніх чыноў і ратнікаў апалчэння было недастаткова, таму дзяржава актыўна заклікала да ўдзелу грамадскія і прыватныя арганізацыі. Дапамога з боку апошніх істотна зменшылася ўжо з лета – восені 1915 г. Сістэма сацыяльнай дапамогі ў Мінскай губерні не была цэнтралізаванай і мела вялікую залежнасць ад настрояў і дабрабыту грамадства, якія за перыяд Першай сусветнай вайны толькі пагоршыліся. Кардынальныя змены ў сістэме сацыяльнай дапамогі сем'ям вайскоўцаў адбыліся толькі пасля падзей Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. і ўсталявання Часовага ўрада.

Ключавыя словы: фінансавая дапамога; Закон 25 чэрвеня 1912 г.; папячыцельства; дабрачыннасць.

ФИНАНСОВАЯ ПОМОЩЬ СЕМЬЯМ ВОЕННОСЛУЖАЩИХ В ВИТЕБСКОЙ ГУБЕРНИИ (1914–1917 гг.)

Е. А. Бодриков

Белорусский государственный университет, пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, yaugen.bodrykau@yandex.by

Целью данного исследования является определение размеров и форм социальной помощи семьям военнослужащих в Витебской губернии со стороны государственных институтов и общественных организаций. В исследовании обращается внимание, что

государственной помощи для поддержания семей мобилизованных нижних чинов и ратников ополчения было недостаточно, поэтому государство активно призывало к участию общественные и частные организации. Помощь со стороны последних существенно уменьшилась уже с лета–осени 1915 г. Система социальной помощи в Минской губернии не была централизованной и имела большую зависимость от настроений и благополучия общества, которые за период Первой мировой войны только ухудшились. Кардинальные изменения в системе социальной помощи семьям военнослужащих произошли только после событий Февральской революции 1917 г. и установления Временного правительства.

Ключевые слова: финансовая помощь; Закон 25 июня 1912 г.; попечительство; благотворительность.

FINANCIAL ASSISTANCE TO MILITARY FAMILIES IN VITEBSK PROVINCE (1914–1917)

Ya. A. Bodrykau

Belarusian State University, 4 Nezavisimosti Avenue, Minsk 220030, Belarus, yaugen.bodrykau@yandex.by

The purpose of this research is to determination the dimensions and forms of social assistance to military families in Vitebsk province from state institutions and public organizations. The research draws attention to the fact that the state assistance at supporting families of mobilized lower ranks and mili-tia warriors was insufficient, so the state actively called for the participation of public and private organizations. Assistance from the latter has been significantly reduced since the summer–autumn of 1915. The system of social assistance in the Minsk province was not centralized and was highly depend-ent on the mood and well–being of society, which only worsened during the First World War. Fundamental changes in the system of social assistance to military families occurred only after the events of the February Revolution of 1917 and the establishment of the Provisional Government.

Keywords: financial assistance; the Law of June 25, 1912; guardianship; well–being.

Першая сусветнай вайна стала адкрыла эпоху «татальных канфліктаў», якія патрабавалі ад дзяржаў-удзельніц максімальнага напружання і выкарыстання не толькі ўласных узброеных сіл, але таксама эканомікі і грамадства, якія павінны былі працаваць на ваенныя патрэбы ўласнай дзяржавы. Адным з галоўных наступстваў Першай сусветнай вайны для шырокіх колаў грамадства стала масавая мабілізацыя мужчынскага насельніцтва ва ўзброеныя сілы Расійскай імперыі. Дадзены працэс прыводзіў да негатыўных эканамічных наступстваў для сем'яў мабілізаваных. У першую чаргу гэта тычылася небагатых шматдзетных сем'яў і сем'яў сялян, якія такім чынам гублялі працаздольнага мужчыну, які нярэдка быў адзіным паратункам яе членам.

Азначаныя вышэй фактары прывялі да з'яўлення як дзяржаўнай (казённай) дапамогі азначаным сем'ям, так і прыватных ініцыятыў у дадзеным кірунку. Галоўным заканадаўчым актам Расійскай імперыі, згодна якому

ажыццяўлялася ўся дабрачынная дзейнасць у сферы аказання сацыяльнай дапамогі сем'ям вайскоўцаў, стала прынятае 25 чэрвеня (8 ліпеня) 1912 г. «Палажэнне аб апекаванні ніжніх чыноў і іх сем'яў», больш вядомае ў грамадстве як «Закон 25 чэрвеня 1912 г.». Назва дакумента падкрэслівала, што дзяржаўная дапамога павінна аказвацца толькі сем'ям мабілізаваных ніжніх чыноў (салдат і ўнтэр-афіцэраў) і ратнікаў апалчэння. Сем'і афіцэраў павінны былі ўтрымліваць за частку афіцэрскага жалавання, а ўдовы і сіраты (да 17-гадовага ўзросту) афіцэраў (як і ніжніх чыноў) атрымлівалі права на дзяржаўную пенсію [2, с. 30].

Згодна азначанаму вышэй дакументу, дапамога выдавалася членам сямей ніжніх чыноў, якіх прызвалі ў войска пры мабілізацыі (у тым ліку і тым, хто добраахвотна пайшоў у войска пры мабілізацыі); затрыманых у войску больш тэрміну абавязковай службы з-за мабілізацыі; ратнікаў дзяржаўнага апалчэння, адпраўленых на вайсковую службу і тых, хто паступаў на службу ў ваенныя дружыны. На безумоўную дапамогу маглі разлічваць толькі афіцыйныя жонкі і «законныя» дзеці (да 17-гадовага ўзросту) мабілізаваных ніжніх чыноў. Акрамя таго, разлічваць на дапамогу маглі бацькі, браты і сёстры, дзяды і бабкі мабілізаванага, калі яны «ўтрымліваліся працай апошняга». Таксама аказвалася дапамога жонкам стараверaў і сектантаў, нават калі яны не жылі ў зарэгістраваным шлюбе, а таксама іх дзецям. Дзяржаўная дапамога выдавалася ў грашовым эквіваленце кошту харчовага пайка ў памеры 1 пуда 28 фунтаў мукі (каля 29 кг.), 10 фунтаў крупы (4,5 кг.), 4 фунтаў солі (1,8 кг.) і 1 фунта поснага алею (0,45 л.) на месяц на чалавека. Дзецям да 5 гадоў такая дапамога выдавалася ў палавінным памеры [1, с. 431].

Пазашлюбныя дзеці і жонкі, а таксама пасынкі, падчарыцы і прыёмныя дзеці не мелі права да дзяржаўныя выплаты, але маглі разлічваць на дапамогу з грамадскіх і дабрачынных сродкаў. Гэтае ж правіла фактычна распаўсюджвалася і на сем'і афіцэраў, якія мелі фінансавыя праблемы і знаходзіліся ў складаным матэрыяльным становішчы. У 1915 г. выйшла новае Палажэнне, згодна якому сем'і дэзерціраў і вайскоўцаў, якія добраахвотна здаліся ў палон, пазбаўляліся дзяржаўнай дапамогі. Акрамя таго, харчовы паёк не выдаваўся сем'ям ніжніх чыноў, якія яшчэ да вайны былі прызваныя на тэрміновую службу і працягвалі адбываць яе.

Не гледзячы на існаванне агульнага заканадаўства, многія губерні мелі ўласныя асаблівасці аказання сацыяльнай дапамогі сем'ям вайскоўцаў. Не стала выключэннем і Віцебская губерня. У беларускай гістарыяграфіі пытанне аказання фінансавай дапамогі сем'ям вайскоўцаў у Віцебскай губерні разглядалася толькі ў кантэксце гэтага ж працэсу на тэрыторыі ўсіх беларускіх губерняў даследчыцай Н. С. Маторавай [3]. Апека сем'яў мабілізаваных больш падрабязна даследавана ў работах расійскіх гісторыкаў апошніх

дзесяцігоддзяў. Сярод прац, у якіх вылучалася Віцебская губерня, варта адзначыць дысертацыйнае даследаванне А. Дз. Грудзіны [2] і артыкул С. У. Букалавай [1].

Стварэнне сеткі дзяржаўных устаноў і грамадскіх арганізацый у сферы сацыяльнай дапамогі сем'ям вайскоўцаў пачалося ў ліпені – жніўні 1914 г., пасля абвяшчэння ўсеагульнай мабілізацыі. Дзейнасць дзяржаўных устаноў па грашовым выплатам для сем'яў мабілізаваны ніжніх чыноў і ратнікаў апалчэння прадугледжвалася Законам ад 25 чэрвеня 1912 г. Для апекавання над сем'ямі мабілізаваных у сельскай мясцовасці абіраліся валасныя папячыцельства, а ў выпадку іх адсутнасці гэтыя функцыі ўскладваліся на валаснога старшыню. Згодна заканадаўству, валасны сход павінен быў абраць не менш 3-х чалавек у склад валаснога папячыцельства [1, с. 437].

Асноўнай задачай валаснога папячыцельства было абследаванне складу і ўмоў жыцця сем'яў мабілізаваных. Кантроль за дзейнасцю валасных папячыцельстваў належаў земскім участковым начальнікам. Валасныя папячыцельства павінны былі даследаваць сем'і і гаспадаркі ў 2-тыднёвы тэрмін са дня абвяшчэння мабілізацыі. Непасрэднае рашэнне аб ўсталяванні канкрэтнай сумы выплат кожнай сям'і на падставе інфармацыі, сабранай на валасным узроўні, прымаў павятовы з'езд, пасля чаго дадзеныя перадаваліся ў губернскую прысутнасць. Аднак, ужо 29 жніўня (11 верасня) 1914 г. выйшаў указ, згодна якому функцыі павятовых з'ездаў у справе выдачы дзяржаўнай дапамогі пераходзілі да адпаведных павятовых папячыцельстваў ці павятовых земскіх управаў. Непасрэдна сем'ям мабілізаваных у сельскай мясцовасці грошы выдаваліся 4 разы ў год: у сакавіку, чэрвені, верасні і снежні праз валаснога старшыню [2, с. 192].

Сістэма дзяржаўнай дапамогі ў гарадской мясцовасці мела свае адрозненні. У гарадах Расійскай імперыі функцыі па збору інфармацыі аб становішчы сем'яў мабілізаваных ускладваліся на гарадскія ўправы ці гарадскіх стараст, аднак па рашэнні мясцовых уладаў маглі быць створаны і адпаведныя камісіі ці асобныя папячыцельства. Як і ў сельскай мясцовасці, гэтыя органы павінны былі збіраць інфармацыю аб колькасным і гаспадарчым станах сем'яў мабілізаваных і цягам вайны сачыць за зменамі па гэтых параметрах. У гарадах, у адрозненні ад сельскай мясцовасці, грашовыя выплаты адбываліся кожны месяц. Нагляд за дзейнасцю ўсіх дзяржаўных органаў па дапамозе сем'ям мабілізаваных у межах кожнай губерні належаў мясцоваму губернатару. На тэрыторыі Віцебскай губерні першыя гарадскія папячыцельства былі створаны ў Полацку і Лепелі ўжо ў жніўні 1914 г. [7, арк. 171], а ў наступныя месяцы ў іншых гарадах губерні [6, арк. 479].

Сярод гісторыкаў няма адзінай думкі наконт агульнай колькасці мабілізаваных на тэрыторыі беларускіх губерня падчас Першай сусветнай вайны, што ўскладняе і асобныя падлікі па Віцебскай губерні. Аднак, у

верасні 1917 г. Міністэрствам унутраных спраў была падлічаная колькасць асоб па губернях, якія атрымлівалі дзяржаўную дапамогу па прычыне мабілізацыі блізкага сваяка. У Віцебскай губерні на той момант выдавалася ўсяго 439 278 пайкоў (на чалавека), з якіх 402 471 у сельскай мясцовасці і толькі 36 807 у гарадах губерні. Трэба заўважыць, што такая колькасць фарміравалася паступова, бо да пачатку сакавіка 1917 г. на тэрыторыі Віцебскай губерні было праведзена 22 хвалі мабілізацыі [3, с. 268]. Акрамя таго, паступова змяняўся і кошт пайка, які быў прывязаны да мясцовых цэн на харчаванне. Так, у верасні 1917 г. адзін паёк у гарадской мясцовасці абыходзіўся ўладам у 19 руб. 15 кап., у той момант як у сельскай мясцовасці ацэньваўся ў 15 руб. 71 кап. Такім чынам, кошт пайка ў Віцебскай губерні быў на некалькі рублёў вышэйшы, чым сярэдні па астатнім неакупаваным беларускім губерням [1, с. 486].

Важная роля ў аказанні сацыяльнай дапамогі сем'ям мабілізаваных адводзілася мясцовым земствам і органам самакіравання, якія аказвалі дапамогу і сем'ям, якія не атрымлівалі дзяржаўнай дапамогі, і сем'ям, якія атрымлівалі яе ў малым або недастатковым памеры. Так, напрыклад, Віцебская гарадская дума да канца 1914 г. вылучыла на гэтыя патрэбы 11,5 тыс. руб. [4, арк. 467]. Аднак, з павелічэннем колькасці сем'яў мабілізаваных і бежанцаў, а таксама павышэннем кошту прадуктаў магчымасці аказання дадатковай дапамогі з боку земскіх устаноў і дум толькі змяншаліся.

Важную ролю ў арганізацыі дадатковай фінансавай дапамогі сем'ям вайскоўцаў адыгрывалі дабрачынныя арганізацыі, сярод якіх асабліва вылучаўся «Камітэт вялікай княгіні Елізаветы Фёдараўны па аказанні дабрачыннай дапамогі сем'ям асобаў, прызваных на вайну» (шырока вядомы як Елізавецінскі камітэт). Дадзеная арганізацыя знаходзілася пад кіраўніцтвам вялікай княгіні Елізаветы Фёдараўны (роднай сястры імператрыцы), што надавала Камітэту як дадатковае фінансаванне з боку дзяржавы, так і спрыяла стварэнню асаблівых умоў дзейнасці арганізацыі з боку мясцовых уладаў. Віцебскае губернскае аддзяленне арганізацыі ўзначальваў непасрэдна віцебскі губернатар. Віцебскае губернскае аддзяленне Елізавецінскага камітэта ў сваю чаргу падзялялася на гарадскія і павятовыя камісіі, якія таксама маглі падзяляцца на мясцовыя камісіі. У сваёй дзейнасці на тэрыторыі Віцебскай губерні Елізавецінскі камітэт паступова ўключаў у сетку сваіх устаноў і больш дробныя дабрачынныя ўстановы, што рабіла арганізацыю манапалістам у сферы недзяржаўнай дапамогі сем'ям вайскоўцаў [9, арк. 41–42].

Варта адзначыць, што земскія ўстановы, органы гарадскога самакіравання і дабрачынныя арганізацыі выдавалі фінансавыя сродкі на канкрэтныя запыты і праблемы. У першую чаргу гэта тычылася тых расходаў, якія не ўлічваліся пры выплаце дзяржаўнай дапамогі, напрыклад адукацыя дзяцей, ацяпленне і арэнда памяшкання, медыцынскія паслугі [9, арк. 5]. Гэтыя праблемы былі больш актуальны менавіта для гарадскога насельніцтва губерні. Акрамя таго, дапамога магла аказвацца і ў выпадку страты

часткі або ўсёй маёмасці, напрыклад у выніку яе крадзяжу. Аднак, магчымасць і памер дапамогі ў дадзеным выпадку залежаў ад матэрыяльнага стану пацярпелых сваякоў вайскоўцаў [10, арк. 104].

Улічваючы тое, што Елізавецінскі камітэт узяў на сябе апеку пазашлюбных дзяцей мабілізаваных ніжніх чыноў, на аказанне падтрымкі іншых сем'яў далёка не заўсёды знаходзілася фінансаванне. Грашовая дапамога сем'ям вайскоўцаў у большасці выпадкаў насіла разавы характар, аднак паступова колькасць адмоўных адказаў на звароты і запыты з боку камітэта толькі ўзрастала [9, арк. 3]. Прычына была ў тым, што з 1915 г. колькасць ахвяраванняў на дабрачыннасць істотна знізілася, а дзяржаўных субсідый было недастаткова для маштабнай дзейнасці арганізацыі. Такая ж тэндэнцыя назіралася сярод земскіх устаноў, органаў самакіравання і іншых дабрачынных арганізацый. Напрыклад, у Невелі памер дадатковай дапамогі вагаўся ад 30 да 65 кап. на чалавека ў месяц [5, арк. 125 адв.], а ў Полацку ад 1 руб. да 2 руб. Пры гэтым, ужо ў пачатку 1915 г. выплата дадатковай грашовай дапамогі ў Полацку была цалкам спыненая па прычыне адсутнасці ў горада сродкаў [8, арк. 54].

Варта адзначыць, што недахоп фінансавых сродкаў мог прыводзіць да выдачы харчовых пайкоў і дадатковай дапамогі ў форме сапраўднага харчовага пайка. У 1916 г. такая практыка была ўведзена ў Невелі і ў Себежскім павеце Віцебскай губерні [3, с. 271]. Аднак, у большасці паветаў і гарадоў Віцебскай губерні выдача фінансавай дапамогі адбывалася згодна заканадаўству ў грашовым эквіваленце.

Нярэдка ў Елізавецінскі камітэт звярталіся і ўдовы або дзеці афіцэраў, якім для ўласнага забеспячэння ці працягу адукацыі не хапала дзяржаўнай пенсіі. У большасці выпадкаў камітэт аказваў разавую дапамогу такім сем'ям, аднак сумы дапамогі адрозніваліся ад той, якую маглі атрымаць сваякі ніжніх чыноў. Так, напрыклад, бяздзетная ўдава падпрапаршчыка магла разлічваць на дапамогу ад арганізацыі ў памеры 25 руб. [11, арк. 119], а ўдава падпрапаршчыка з 2-мя дзецьмі на 40 руб. [11, арк. 199]. На памер выплат уплывала не толькі колькасць дзяцей і эканамічны стан сям'і, але і чын загінулага вайскоўца. Так, удава падпалкоўніка М. А. Знаменская, маючы на ўтрыманні 2-х дзяцей-вучняў, двойчы атрымала ад Елізавецінскага камітэта па 100 руб. разавай фінансавай дапамогі [11, арк. 218–219]. Пры гэтым, зацверджаны памер дзяржаўнай пенсіі для ўдоў вайскоўцаў вагаўся ад 48 руб. да 84 руб. у залежнасці ад чыну і тэрміну службы вайскоўца.

Асаблівасцю Віцебскай губерні была наяўнасць значнай колькасці нацыянальных яўрэйскіх, польскіх і латышскіх дабрачынных арганізацый, якія аказвалі дапамогу сем'ям мабілізаваных яўрэяў, палякаў і латышоў. Аднак, іх грашовая дапамога ў дадзеным выпадку таксама аказвалася ў невялікіх памерах. Акрамя таго, на тэрыторыі губерні дзейнічалі прыхадскія папячыцельства, якія ўзначальвалі мясцовыя праваслаўныя святары. Больш прадуктыўнай была праца прыходскіх папячыцельстваў у сельскай мясцовасці, бо ў вёсках царква часцей адыгрывала значную ролю ў сацыяльнай і

духоўнай сферах. Нярэдка святары асабіста ведалі многія сем'і ніжніх чыноў, з-за чаго карысталіся большым даверам з боку апошніх. Аднак, дзейнасць многіх прыходскіх папячыцельстваў не мела працяглай актыўнасці або ўвогуле адбывалася выключна фармальна, што не дазваляе прасачыць рэальную колькасць актыўных прыходскіх папячыцельстваў у межах Віцебскай губерні. Напрыклад, у Себежскім павеце ў жніўні 1915 г. такія папячыцельства апекавалі 171 сям'ю вайскоўцаў, дапамагаючы не толькі фінансаваннем, але і збожжам [9, арк. 27–28].

Рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. унеслі істотныя змены ў функцыянаванне сістэмы сацыяльнай падтрымкі сем'яў вайскоўцаў. Ужо пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. па прычыне свайго «манархічнага характару» цалкам спыніў сваё існаванне Елізавецінскі камітэт, што пазбавіла магчымасці атрымаць дадатковае фінансаванне шматлікія сем'і вайскоўцаў на тэрыторыі губерні. Акрамя таго, істотна скарацілася дзяржаўная падтрымка прыватных і нацыянальных дабрачынных арганізацый, што таксама ўплывала на эканамічны стан сваякоў вайскоўцаў. Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. прывяла да поўнай перабудову сістэмы матэрыяльна-фінансавага забеспячэння не толькі сем'яў мабілізаваных вайскоўцаў, але і ўсяго грамадства.

Падсумоўваючы, трэба адзначыць, што сістэма фінансавай дапамогі сем'ям вайскоўцаў у Расійскай імперыі ў перыяд Першай сусветнай вайны грунтавалася на спалучэнні дзяржаўнай і грамадскай дапамогі. Законам ад 25 чэрвеня 1912 г. толькі сем'ям мабілізаваных ніжніх чыноў і ратнікаў апалчэння дзяржава кампенсавала адсутнасць гаспадароў харчовай дапамогай у грашовым эквіваленце. Пры гэтым, такую дапамогу маглі атрымаць толькі «законныя» жонка і дзеці (узростам да 17 год) мабілізаванага. Земскія ўстановы, органы самакіравання, дабрачынныя арганізацыі і прыходскія папячыцельства на тэрыторыі Віцебскай губерні аказвалі дапамогу як тым сем'ям вайскоўцаў, якія не атрымлівалі дзяржаўны паёк, так і тым, хто атрымліваў у недастатковым памеры. Аднак, з-за абмежаванасці сродкаў недзяржаўная фінансавая дапамога насіла абмежаваны па памеры і пераважна разавы характар. Асаблівасцю Віцебскай губерні з'яўлялася значная колькасць нацыянальных дабрачынных арганізацый, якія аказвалі дапамогу сем'ям мабілізаваных палякаў, яўрэяў і латышоў. Сістэма фінансавай дапамогі сем'ям вайскоўцаў істотна змянілася пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. і фактычна была скасавана ўжо пасля прыходу да ўлады бальшавікоў.

Бібліяграфічны спіс

1. *Булгакова, Л. А.* Привилегированные бедняки: помощь солдатским семьям в годы Первой мировой войны / Л. А. Булгакова // На пути к революционным потрясениям. Из истории России второй половины XIX – начала XX века. Материалы конференции памяти В. С. Дякина. – СПб.; Кишинев: Nestor–Historia, 2001. – С. 429–493.

2. *Грудина, А. Д.* Государственная помощь семьям нижних чинов российской армии в годы Первой мировой войны: диссертация на соискание учёной степени кандидата исторических наук: специальность 07.00.02 Отечественная история / Алексей Дмитриевич Грудина. – Брянск, 2019. – 242 с.

3. *Моторова, Н. С.* Помощь семьям мобилизованных на территории Беларуси в 1914–1916 гг. / Н. С. Моторова // Исторические и психолого-педагогические науки : сб. науч. статей. – Минск : РИВШ, 2023. – (Научные труды Республиканского института высшей школы; Вып. 23, ч. 1 : Исторические науки) – С. 266–274.

4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2508. Воп. 1. Спр. 5768.

5. НГАБ. – Ф. 2508. Воп. 1. Спр. 5772.

6. НГАБ. – Ф. 2508. Воп. 1. Спр. 5776.

7. НГАБ. – Ф. 2508. Воп. 1. Спр. 5779.

8. НГАБ. – Ф. 2508. Воп. 1. Спр. 6090.

9. НГАБ. – Ф. 2665. Воп. 1 Спр. 5.

10. НГАБ. – Ф. 2665. Воп. 1. Спр. 9.

11. НГАБ. – Ф. 2665. Воп. 1. Спр. 17.

УДК 94(476)"1953/1968"

АНТЫАЛКАГОЛЬНАЯ КАМПАНІЯ Ў БССР КАНЦА 1950-х – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 1960-х гг.

А. А. Гужалоўскі

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, huzhalouski@bsu.by

У артыкуле аналізуецца рэалізацыя кампаніі па барацьбе з п'янствам і алкагалізмам у БССР у канцы 1950-х – першай палове 1960-х гг. Паказана, што праблема спажывання спіртных напояў у тыя гады была вельмі актуальнай. Разглядаюцца заканадаўчыя ініцыятывы і практычныя дзеянні ўлады па абмежаванні дзяржаўнага абароту алкаголю і самагонаварэння. Адзначаецца, што алкагалізм уяўляў сур'ёзную сацыяльную праблему для беларускага грамадства, наносіў шкоду здароўю насельніцтва. Дзяржаўная палітыка і дзеянні беларускага кіраўніцтва па барацьбе з ім не мелі значных станоўчых вынікаў. У цэлым антыалкагольная палітыка была супярэчлівай і мела неадназначныя наступствы.

Ключавыя словы: БССР; адліга; дзяржаўная палітыка; антыалкагольная кампанія; п’янства; самагонаварэнне.

АНТИАЛКОГОЛЬНАЯ КАМПАНИЯ В БССР КОНЦА 1950-х – ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЫ 1960-х гг.

А. А. Гужаловский

Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, huzhalouski@bsu.by

В статье анализируется реализация кампании по борьбе с пьянством и алкоголизмом в БССР в конце 1950-х – первой половине 1960-х гг. Показано, что проблема потребления спиртных напитков в те годы являлась весьма актуальной. Рассматриваются

законодательные инициативы и практические действия власти по ограничению государственного оборота алкоголя и самогоноварения. Отмечается, что, алкоголизм представлял серьезную социальную проблему для белорусского общества, наносил ущерб здоровью населения. Государственная политика и действия белорусского руководства по борьбе с ним не имели значительных положительных результатов. В целом проводимая антиалкогольная политика была противоречивой и имела неоднозначные последствия.

Ключевые слова: БССР; оттепель; государственная политика; антиалкогольная кампания; пьянство; самогоноварение.

ANTI-ALCOHOLIC CAMPAIGN IN SOVIET BELARUS IN THE END OF THE 1950s – FIRST HALF OF THE 1960s

A. Huzhalouski

Belarusian State University, 4, Niezależnasci avenue, Minsk 220030, Belarus, huzhalouski@bsu.by

The article analyzes the implementation of the campaign to combat drunkenness and alcoholism in Soviet Belarus in the late 1950s – first half of the 1960s. It is shown that the problem of alcohol consumption in those years was very relevant. Legislative initiatives and practical actions of the authorities to limit the state turnover of alcohol and moonshine are considered. It is noted that alcoholism was a serious social problem for the Belarusian society, causing damage to the health of the population. The state policy and actions of the Belarusian leadership to combat it did not have significant positive results. In general, the anti-alcohol policy pursued was controversial and had ambiguous consequences.

Keywords: Soviet Belarus; Khrushchev ‘thaw’; public policy; anti-alcohol campaign; drunkenness; moonshine.

Да канца 1957 г. да М. С. Хрушчова прыйшло разуменне таго, што маштабы, якіх дасягнула п’янства ў краіне можа паставіць крыж на мары аб хуткай пабудове камуністычнага грамадства. Спрабуючы асэнсаваць гэты феномен як знакавы для часу «адлігі», П. Вайль і А. Геніс ахарактарызавалі яго як «кульмінацыю карнавала 60-х» [1, с. 71]. П’янка дапамагала савецкім людзям пазбавіцца трагічнага светаадчування нядаўняга мінулага, а таксама асэнсаваць і ўбудавацца ў новую сацыяльную рэальнасць.

З месцаў паведамлялі, што пасля заканчэння працоўнага дня ў гарадах рабочыя арганізавана ідуць у крамы, купляюць гарэлку і распіваюць ў скверах, дварах, пад’ездах. Шмат прыхільнікаў Бахуса было сярод савецкай інтэлігенцыі і нават партыйна-гаспадарчай намерклатуры. Напрыклад, за 1957 і першую палову 1958 гг. у гарадскім выцвярэзніку пабывала больш за 240 рабочых і служачых магілёўскага завода штучнага валакна, у тым ліку галоўны механік, начальнік цэха вентыляцыі і нават сябры парбюро прадпрыемства [6, арк. 61].

Не менш трывожнае становішча склалася на вёсцы, дзе на савецкія і рэлігійныя святы пілі брыгадамі і цэлымі калгасамі на некалькі дзён, не выходзячы на палі і фермы. Тыя, хто не мог дазволіць сябе гарэлку ўжываў самагон, вытворчасць якога ў сярэдзіне 1950-х гг. набыла ўнушальныя памеры. Асабліва раздражняў першага сакратара ЦК КПСС той факт, што прыватныя вытворцы выраблялі самагон з калгаснай сыравіны – збожжа, бульбы, цукру і інш.

Старт хрушчоўскай антыалкагольнай кампаніі быў дадзены 22 студзеня 1958 г. у Мінску. Выступаючы падчас кароткатэрміновага візіту ў БССР для ўдзелу ў нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі ў БССР, М. С. Хрушчоў сказаў: «Надышоў час рэзка паставіць пытанне аб барацьбе з п'янствам, а таксама з тымі, хто гоніць самагонку» [15, с. 2]. Беларускае кіраўніцтва адразу ж распачало энергічную барацьбу з прыкрай перашкодай на шляху будаўніцтва камунізма. За першыя 7 месяцаў 1958 г. было ліквідавана 1 305 «ачагоў» самагонаварэння ў Гомельскай вобласці, 1 210 – у Мінскай вобласці, 1 122 – у Віцебскай вобласці, 1 045 – у Гродзенскай, 933 – у Маладэчанскай вобласці, 825 – у Магілёўскай вобласці [7, арк. 221]. На працягу ўсяго 1958 г. у насельніцтва рэспублікі было адабрана 277 605 літраў брагі, 23 581 літраў самагону, а таксама 12 385 самагонных апаратаў, 5 308 з якіх знайшлі ў Віцебскай вобласці [10, арк. 240].

Дадатковы імпульс кампанія атрымала 4 красавіка 1958 г., калі ЦК КПСС звярнуўся да партыйных арганізацый краіны з лістом пра ўзмацненне барацьбы з п'янствам і самагонаварэннем, паставіўшы задачу рашучай барацьбы з імі «усімі сродкамі і спосабамі». Апошнія словы сведчылі пра тое, што партыйнае кіраўніцтва не збіраецца абмяжоўвацца антыалкагольнай прапагандай, а таксама канфіскацыяй самагонных апаратаў і самаробных напояў. Пра рэпрэсіўны характар кампаніі, да правядзення якой былі прыцягнуты праваахоўныя органы, сведчаць наступныя лічбы.

У 1958 г. у БССР было асуджана 38 178 чал., у тым ліку 8 347 – за самагонаварэнне, 7 143 – за крадзеж дзяржаўнай і грамадскай маёмасці, 5 317 – за хуліганства, 3 403 – за дробны крадзеж, 2 344 – за крадзеж асабістай маёмасці грамадзян, 392 – за разбой, 366 – за забойства, 267 – за згвалтаванне. Колькасць асобаў, асуджаных у рэспубліцы ў 1958 г. павялічылася ў параўнанні з папярэднім годам на 38 %, пераважна за кошт самагошчыкаў.

Такім чынам, самагоншчыкі зрабілася найбольш шматлікімі злачынцамі ў рэспубліцы, апярэдзіўшы традыцыйных лідараў – раскрадальнікаў дзяржаўнай маёмасці і хуліганаў. З усіх 8 347 асуджаных у 1958 г. паводле 149 артыкула тагачаснага Крымінальнага Кодэкса БССР, які за выраб самагона толькі з мэтай продажу прадугледжваў пакаранне ад штрафу да 2 гадоў пазбаўлення волі, абсалютная большасць (8 091 чал.) выраблялі алкагольны

напой для ўласнага ўжытку. 1 326 з іх атрымалі гадовыя і двухгадовыя тэрміны турэмнага зняволення, астатнія – штрафы і папраўчыя працы па месцу працы [11, арк. 12].

Адной з тых, хто ў 1958 г. атрымаў дзвухгадовы тэрмін была жыхарка г. п. Урэчча Слуцкага раёна А. І. Фісун. З'яўляючыся самагоншчыцай са стажам, яна ператварыла сваю хату ў сапраўдны шынок, дзе за грошы частавала суседзяў. Падчас ператрусу і затрымання, яна аказала супраціў супрацоўнікам міліцыі, а таксама спрабавала знішчыць рэчавыя доказы [3, с. 4].

Каля 60 % асуджаных па «самагонным» артыкуле былі жанчыны, прыкладна столькі ж – асобы старэйшыя за 40 год, хаця доля гэтых груп насельніцтва ў агульнай колькасці асуджаных вагалася ў межах 20 %. Гэтыя асаблівасці складу асуджаных тлумачыліся тым, што вырабам самагонкі ў асноўным займаліся тыя, хто адказваў у сем'ях за хатнюю гаспадарку, не быў заняты ў грамадскай вытворчасці. Акрамя таго, людзі сталага веку і жанчыны з непаўналетнімі дзецьмі бралі на сябе ўсю адказнасць, ведаючы, што суд улічыць іх узрост і абавязкі маці.

Выраб і ўжыванне самагона зрабілася часткай габітуса, адной з традыцыйных практык мясцовага насельніцтва, да якой нармальна ставіліся старшыні калгасаў, участковыя міліцыянеры і суддзі. У верасні 1958 г. першы сакратар ЦК КПБ К. Т. Мазураў атрымаў паведаленне намесніка міністра юстыцыі БССР Г. Ф. Басава, у якім пералічваліся шматлікія выпадкі міліцэйскіх злоўжыванняў. Так, з адабраных участковымі ўпаўнаважанымі Суражскага аддзялення міліцыі Калугай і Майсеевым у якасці рэчавага доказу 4,5 літраў самагона да суда дайшло толькі 0,5 літра. Лейтэнант Лагішынскага аддзела міліцыі Луд у пратаколе адабранння пазначыў 13 літраў знойдзенага самагона, у той час як панятыя ў судзе паказалі, што знойдзена было 24 літра. Участковы Лунінецкага аддзела Прыка перад адабраннем знойдзенага самагона «апрабаваў» яго разам з панятым Мельянцом, пасля чаго апошні заснуў за сталом і не мог даваць паказанняў на судовым пасяджэнні [7, арк. 213].

Многія выканкамы саветаў дэпутатаў працоўных паставіліся да правядзення антыалкагольнай кампаніі фармальна. Ніякіх мерапрыемстваў па барацьбе з самагонаварэннем у 1958 г. не распрацавалі ў Ашмянскім, Докшыцкім, Радашковіцкім, Вілейскім, Глубокскім, Бешанковіцкім, Лёзненскім, Лепельскім, Расонскім, Пінскім, Лагішынскім, Целеханскім, Столінскім, Клічаўскім, Крычаўскім, Слаўгародскім, Чэрыкаўскім і некаторых іншых раёнах. А ў Столінскім, Кобрынскім і Кіраўскім раёнах самагонныя апараты былі знойдзены нават у дэпутатаў мясцовых органаў улады. Ахвярамі антыалкагольнай кампаніі сталі дырэктар Дубойскай СШ

Столінскага раёна Ўрбановіч, дырэктар мядзелскага цаглянага завода Голубеў, а таксама падабраны міліцыяй у бяспрытомным стане інструктар магілёўскага райкама партыі Лужкоў [7, арк. 223].

У снежні 1958 г. старшыня Вярхоўнага суда БССР С. Ц. Шардыка зрабіў аналіз судовай практыцы па справах аб вырабе і продажу самагона. Яго вынікі, прадстаўленыя партыйнаму кіраўніцтву рэспублікі, суправаджаліся наступнай прапановай: у сувязі з тым, што больш 96 % самагона вырабляецца сялянамі для ўласных патрэб і з уласнай сыравіны, прадугледзіць за падобную дзейнасць адміністрацыйнае, а не крымінальнае пакаранне [8, арк. 200–201]. Па-за аргументацыяй С. Ц. Шардыкі засталіся шматлікія факты крымінальнага пераследу па «самагонным» артыкуле добрых працаўнікоў, некаторыя з якіх з'яўлялся ўдарнікамі камуністычнай працы. Высокі чыноўнік таксама не мог адкрыта сказаць, што сяляне выраблялі самагон таму, што іх сямейны бюджэт не дазваляў набыць на вяселле ці хаўтуры казёную гарэлку.

Словы тых, каму на справе даводзілася праводзіць ідэі М. С. Хрушчова ў жыццё не былі пачуты – партыйнаму кіраўніцтву было патрэбна хуткае і эфектыўнае вырашэнне праблемы. 1 верасня 1959 г. В. І. Казлоў падпісаў пастанову Вярхоўнага Савета БССР «Аб узмацненні барацьбы з п'янствам і самагонаварэннем». Пастанова забараніла продаж гарэлкі ва ўсіх прадпрыемствах гандлю і грамадскага харчавання (акрамя рэстаранаў), размешчаных на вакзалах, і аэрапортах, на прывакзальных і прыстанцыйных плошчах. Не дазваляўся продаж гарэлкі ў непасрэднай блізкасці ад прамысловых прадпрыемстваў, навучальных і дзіцячых устаноў, бальніц, санаторыяў, а таксама ў месцах масавых гулянняў і адпачынку. За з'яўленне ў нецвярозым стане альбо ўжыванне алкаголю ў грамадскіх месцах пастанова прадугледжвала штраф у памеры 100 рублёў (у выпадку абцяжарваючых абставінаў ён падвойваўся). За выраб самагона спаганяўся штраф у памеры 500 рубляў (у выпадку паўторнага парушэння ён падвойваўся). За продаж самагона пагражала турэмнае зняволенне тэрмінам ад года да пяці [17, с. 2].

У прынятым у 1960 г. новым Крымінальным кодэксе БССР з'явіўся артыкул 59 «Прымусовыя меры медыцынскага характару, ужываемыя да алкаголікаў і наркаманаў». Размова ў ім ішла пра адпраўку алкаголікаў, паводле хадайніцтва таварыскага суда, калектыва альбо медыцынскай установы, на лячэнне ў «медыцынскія ўстановы са спецыяльным лячэннем і працоўным рэжымам». Акрамя таго, над тымі, хто ўласнымі дзеяннямі ставіў сям'ю ў цяжкае матэрыяльнае становішча, рашэннем суда магло быць усталявана «папячыцельства» [5, с. 29].

Былі зроблены захады па прывучэнню насельніцтва да культурнага ўжывання алкагольных напояў. У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў БССР ад 20 чэрвеня 1959 г. «Аб зніжэнні раздробных коштаў на

некаторыя тавары народнага спажывання», патаннелі вінаградныя віна – на 19,2 %, пладова-ягадныя – на 20 % [9, арк. 52].

У выніку ваканання пастановы «Аб узмацненні барацьбы з п'янствам і самагонаварэннем», паменела колькасць кропак па продажу алкаголя, але не аб'ёмы ўжываемага алкаголя. Напрыклад, у 1960 г. у сталіцы БССР штодня можна было ўбачыць групы распіваючых алкагольныя напоі мужчын у прывакзальным скверы, кафэ-аўтамаце на вуліцы Свярдлова, ларку «Піва-воды» на вуліцы Маскоўскай, прыстанцыйным скверы у раёне вуліцы Козыраўскай, гарадку будаўнікоў на вуліцы Кузнечнай, парку ў раёне 1-га цаглянага завода, таксаматорным парку на вуліцы Апанскага. Распівалі ў піўных ларках, побач з уваходамі ў віна-водачныя аддзелы. Нелегальны продаж спіртнога быў наладжаны нават ў буфеце Беларускага тэатра імя Янкі Купалы [4, с. 3]. У Мінску пачалася спекуляцыя водкай.

Не лепшыя поспехі былі ў тых, хто змагаўся з п'янствам на вёсцы. Захады «зверху», накіраваныя на аздараўленне савецкага грамадства, сяляне ўспрымалі як абсурдную акцыю, накіраваную супраць «простага народа». Месца выяўленага самагоншчыка адразу займаў новы. З іншага боку, продаж спіртнога ўвесь час павялічвалі райспажыўсаюзы, якія часта гандлявалі алкаголем у забароненых пастановай ад 1 верасня 1959 г. месцах. Напрыклад, у сярэдзіне 1960-х гг. буфет лепельскага раённага дома культуры штогод рэалізоўваў да 15 тыс. бутэлек гарэлкі [16, с. 4].

У выніку піць меней не пачалі ні гараджане, ні вяскоўцы і неўзабаве хрушчоўская кампанія па барацьбе з самагошчыкамі і п'яніцамі сама сабою спынілася. Алкагольныя ўцёкі насельніцтва ад суворай рэчаіснасці таталітарнай сістэмы, сацыяльнай апатыі і матэрыяльнай незабяспечанасці працягнуліся. З 1958 па 1964 гг. колькасць зарэгістраваных алкаголікаў у БССР павялічылася з 485 да 4 000 [14, арк. 158]. Калі ў 1960 г. міліцыя і дружыннікі падабралі на вуліцах беларускіх гарадоў і вёсак 20 700 асоб у стане востpай алкагольнай інтаксікацыі, то ў 1965 г. гэта лічба ўзрасла да 67 000 [13, арк. 1]. На лячэнне ў рэспубліканскім псіханеўралагічным дыспансэры стаяла вялікая чарга хворых на алкагалізм. Тады ж абмяркоўвалася магчымасць стварэння для алкаголікаў лячэбна-працоўных аддзяленняў у месцах зняволення [12, арк. 243–245].

Гэтая сумная статыстыка вымусіла партыйнае кіраўніцтва рэспублікі распачаць новую антыалкагольную кампанію. 9 ліпеня 1965 г. выйшла пастанова прэзідыўма ЦК КПБ «Аб незадавальняючым стане барацьбы з п'янствам і самагонаварэннем у рэспубліцы» [13, арк. 27]. Першыя вынікі кампаніі былі несуцяшальныя, што, перш за ўсё, тлумачылася яе рэпрэсіўным характарам. Так, колькасць асуджаных у БССР за першае паўгоддзе 1966 г. павялічылася ў параўнанні з тым жа перыядам 1965 г. на 31,1 %, пераважна за кошт самагоншчыкаў [13, арк. 72]. Выступаючы ў сакавіку 1966 г. на XXVI з'ездзе КПБ,

П. М. Машэраў быў вымушаны прызнаць, што кожнае другое крымінальнае злачынства ў рэспубліцы адбываецца на глебе п'янства [2, с. 4]. 23 красавіка 1966 г. паводле ініцыятывы новага беларускага лідара выйшла пастанова прэзідыўма ЦК КПБ «Аб мерах па ўзмацненні па барацьбе з п'янствам і самагонаварэннем» [13, арк. 106]. Наперадзе было падвышэнне коштаў на спіртныя напоі, абмежаванне часу іх продажу, а таксама стварэнне лячэбна-працоўных прафілакторыяў.

Бібліяграфічны спіс

1. *Вайль, П., Генис, А.* 60-е. Мир светского человека. М.: Новое литературное обозрение, 1996. – 368 с.
2. Даклад першага сакратара ЦК КПБ таварыша П. М. Машэрава XXVI з'езду КПБ // Чырвоная змена. 1966. 4 сак. № 45.
3. Из зала суда // Советская Белоруссия. 1958. 6 февр. № 31.
4. *Костылев, В.* Темный закуток // Советская Белоруссия. 1960. 7 июля. № 158.
5. Крымінальны Кодэкс Беларускай ССР. Мн.: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1961. – 212 с.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). Ф. 4п. Воп. 62. Спр. 486.
7. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 62. Спр. 488.
8. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 62. Спр. 489.
9. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 62. Спр. 506.
10. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 62. Спр. 514.
11. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 62. Спр. 517.
12. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 62. Спр. 638.
13. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 62. Спр. 689.
14. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 97. Спр. 207.
15. Прамова таварыша М. С. Хрушчова на нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі БССР 22 студзеня 1958 года // Звязда. 1958. 25 студз. № 21.
16. *Сяргеенка, Р.* І мора па калена… // Звязда. 1965. 10 кастр. № 240.
17. Указ Президиума Верховного Совета Белорусской ССР «Об усилении борьбы с пьянством и самогоноварением» // Советская Белоруссия. 1959. 2 сент. № 206.

УДК 342.413+342.728

ТРАНСФАРМАЦЫЯ КАНСТЫТУЦЫЙНАЙ МАДЭЛІ ГРАМАДСКІХ ФАРМІРАВАННЯЎ ВА ЎМОВАХ СТАНАЎЛЕННЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

А. Л. Дашкевіч

Установа адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі «Міжнародны ўніверсітэт "МІТСО"», вул. Казінца, 21/3, 220099, г. Мінск, ladminsk@mail.ru

Ва ўмовах станаўлення Рэспублікі Беларусь адбываецца трансфармацыя канстытуцыйнай мадэлі грамадскіх фарміравання ў, што прадугледжвала іх адасабленне ад дзяржавы ва ўмовах ідэалагічнага і палітычнага плюралізма, заснаванага на фармальна-юрыдычнай аб'ектывацыі прынцыпаў і катэгарыяльна-паняційнага апарата

ў межах канстытуцыйнага рэгулявання. Трансфармацыя канстытуцыйнай мадэлі грамадскіх фарміраванняў разглядаецца як абумоўлены сацыяльна-палітычным развіццём Рэспублікі Беларусь працэс пазітыўнага вызначэння зместу і спосабаў канстытуцыйнага рэгулявання функцыянавання сістэмы грамадскіх фарміраванняў.

Ключавыя словы: канстытуцыйная мадэль; трансфармацыя; грамадскія фарміраванні;канстытуцыя.

ТРАНСФОРМАЦИЯ КОНСТИТУЦИОННОЙ МОДЕЛИ ОБЩЕСТВЕННЫХ ФОРМИРОВАНИЙ В УСЛОВИЯХ СТАНОВЛЕНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

А. Л. Дашкевич

Учреждение образования Федерации профсоюзов Беларуси «Международный университет "МИТСО"», ул. Казинца, 21/3, 220099, г. Минск, ladminsk@mail.ru

В условиях становления Республики Беларусь происходит трансформация конституционной модели общественных формирований, что предусматривало их обособление от государства в условиях идеологического и политического плюрализма, основанного на формально – юридической объективации принципов и категориально-понятийного аппарата в рамках конституционного регулирования. Трансформация конституционной модели общественных формирований рассматривается как обусловленный социально-политическим развитием Республики Беларусь процесс позитивного определения содержания и способов конституционного регулирования функционирования системы общественных формирований.

Ключевые слова: конституционная модель; трансформация; общественные формирования; конституция.

TRANSFORMATION OF THE CONSTITUTIONAL MODEL OF PUBLIC FORMATIONS IN THE CONDITIONS OF THE FORMATION OF THE REPUBLIC OF BELARUS

A. L. Dashkevich

Educational Institution of the Federation of Trade Unions of Belarus "MITSO International University", Kazinets str., 21/3, 220099, Minsk, ladminsk@mail.ru

In the conditions of the formation of the Republic of Belarus, the constitutional model of public formations is being transformed, which provided for their separation from the state in the conditions of ideological and political pluralism based on the formal legal objectification of principles and the categorical and conceptual apparatus of constitutional regulation. The transformation of the constitutional model of public formations is considered as a process of positive determination of the content and methods of constitutional regulation of the functioning of the system of public formations due to the socio-political development of the Republic of Belarus.

Keywords: constitutional model; transformation; public formations; constitution.

Канстытуцыйная мадэль у агульным выглядзе вызначае асноўныя параметры канстытуцыйна-прававога рэгулявання, замацоўвае крытэрыі канстытуцыяналізацыі праватворчай і правапрымяняльнай дзейнасці. Яе характарызуе пэўны сацыяльна-палітычны падыход да аб'екта, зместу і спосабаў рэгулявання грамадскіх адносін, да выкарыстання ў гэтых мэтах тых ці іншых канстытуцыйна-прававых інстытутаў [11, с. 16].

У гэтым сэнсе можна пагадзіцца з абагульненнем А. М. Пугачова, што дадзенае паняцце нясе вялікую інфармацыйную нагрузку, бо ў абагульненым выглядзе ўключае ў сябе прававую схему арганізацыі грамадства і дзяржавы, асновы прававога статусу асобы, межы і метады дзяржаўнага рэгулявання, сацыяльны змест канстытуцыйных адносін (іх статычнасць і дынамізм), асноўныя фармальна-юрыдычныя характарыстыкі Канстытуцыі [10, с. 143].

Адначасова з такім падыходам разумення канстытуцыйнай мадэлі існуе больш вузкае выкарыстанне дадзенага паняцця, у прыватнасці, у дачыненні да канстытуцыйных параметраў асобных канстытуцыйна-прававых інстытутаў і адпаведных аб’ектаў (гл. напр.: [9]). Выкарыстанне такога падыходу патрабуе тлумачэння сукупнасці пэўных канстытуцыйных прынцыпаў і нормаў паводле іх аб’ёма і спосабаў рэалізацыі ў праватворчай і правапрымяняльнай дзейнасці.

Турыстычная галіна з'яўляецца вельмі важнай часткай сусветнай эканомікі. Пачынаючы з 2010 г. і да 2020 г. індустрыя турызму паказвала штогадовы рост колькасці турыстычных прыбыццяў. Адпавядна павялічваліся і даходы ад турычтычнай дзейнасці. Пандэмія вірусу COVID-19 карэнным чынам змяніла турыстычны рынак і турыстычныя плыні як на глабальным, так і на рэгіянальным узроўні.

Колькасць міжнародных турыстаў скарацілася з амаль 1,5 мільярда ў 2019 г. да прыкладна 380 мільёнаў у 2020 г., што дэманструе падзенне на 74 %. Гэта азначае страту выдаткаў на міжнародны турызм у памеры 1,3 трыльёна даляраў, што прыкладна ў 11 разоў перавышае страты турыстычнай галіны ад сусветнага эканамічнага крызісу 2009 г. [7]. Гэта было беспрэцэндэнтнае ўздзеянне, якое, безумоўна, паўплывала і на турыстычныя плыні ў Рэспубліцы Беларусь. Па стане на 2022 г. колькасць міжнародных турыстычных прыбыццяў так і не дасягнула ўзроўню 2019 г., хаця і азначылася ростам на 12 % (2021 г.) і на 111 % (2022 г.) да папярэдняга году [6].

Турыстычны рынак Рэспублікі Беларусь залежыць ад паказчыкаў трох турыстычных плыняў: уязных турыстаў (прыбываюць у краіну з-за мяжы), выязных турыстаў (накіроўваюцца ў падарожа за межы краіны), унутраных турыстаў (накіроўваюцца ў падарожжа ў межах краіны).

У выпадку Беларусі пандэмія вірусу COVID-19 паўплывала ўпершаю чаргу на ўязны турызм. Не гледзячы на тое, што Беларусь не ўводзіла абмежаванні на перасячэнне дзяржаўнай мяжы, колькасць турыстаў, якія ўязджаюць у краіну, значна скарацілася.

У 2019 г. Рэспубліку Беларусь у складзе арганізаваных тураў наведала 405 472 чалавекі, сярод якіх было 177 748 турыстаў і 227 724 экскурсанты. У 2020 г. нашу краіну ў складзе арганізаваных тураў наведала толькі 80 972 (19,97 % ад папярэдняга года) чалавекі, сярод якіх было 34 156 турыстаў і 46 816 экскурсантаў. Скарачэнне колькасці ўязных турыстаў працягвалася

таксама ў 2021 г. і толькі ў 2022 г. быў адзначаны рост замежных прыбыццяў, але ўзроўня 2019 г. колькасць уязных турыстаў так і не дасягнула.

Колькасць арганізаваных выязных турыстаў пасля 2019 г. скарачаецца і гэта тэндэнцыя не была пераадолена ні ў 2021, ні ў 2022 г.

У 2020 г. колькасць арганізаваных наведвальнікаў, якія накіраваліся ў туры па Рэспубліцы Беларусь склала 571 493 чалавекі (51,63 % ад папярэдняга года). Адметна тое, што скарачэнне адбылося не за кошт колькасці турыстаў, а за кошт колькасці экскурсантаў. Экскурсанты накіроўваюцца ў падарожжа рознай працягласці па часе, але якое не прадугледжвае начлегу ў гасцініцы ці іншых сродках размяшчэння. Колькасць жа ўнутраных турыстаў у 2020 г. (76 985 чал.) у параўнанні з 2019 г. (72 379 чал.) нязначна, але павялічылася. Трэнд на павілічэнне колькасці ўнутраных турыстаў працягваўся і ў 2021 г. (138 398 чал.). Гэта, хутчэй за ўсё, абумоўлена пераразмеркаваннем турыстычнай плыні. Выязныя турысты, якія не маглі здзейсніць падарожжа за межы Беларусі, накіраваліся ў арганізаваныя туры па тэрыторыі сваёй краіны.

Падобныя тэндэнцыі праявіліся і ў колькасці экскурсантаў, што накіроўваліся ў падарожжы ў межах Рэспублікі Беларусь. Іх колькасць скарацілася ў 2020 г. (494 508 чал., 47,80 % ад папярэдняга года), але ўжо ў 2021 г. (1 049 530 чал.) дасягнула дапандэмійнага ўзроўня, а ў 2022 г. (1 401 785 чал.) перавысіла яго.

Уздзеянне пандэміі вірусу COVID-19 на турыстычныя плыні ў Рэспублікі Беларусь, безумоўна, аказалася значным. У выніку скарачэння колькасці ўязной і выязной турыстычных плыняў пачала скарачацца колькасць арганізацый, што ажыццяўляюць турыстычную дзейнасць. Калі ў 2019 г. іх было 1 544, то ў 2020 г. – 1 348, у 2021 г. – 1 315, у 2022 г. – 1 203.

Для ўнутранага турызму пандэмія стала магутным штуршком да развіцця. Важна адзначыць, што гэта выявілася не толькі ў пераразмеркаванні плыняў і колькасным росце ўнутранага турызму, але і ў трансфармацыі турыстычнага прадукту. Разам з ужо класічнымі турыстычнымі прапановамі, пачалі з'яўляцца новыя, раней мала ўключаныя ў масавы турызм.

Значна ўзрасла цікавасць да экалагічнага турызму ў межах краіны. Акрамя традыцыйных для турыстычнага наведвання нацыянальных паркаў і запаведнікаў, папулярнасцю карысталіся Рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Ельня» (Міорскі раён), ландшафтнага заказнік «Альманскія балоты» (Столінскі раён), Рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Налібоцкі» (Валожынскі, Стаўбцоўскі, Іўеўскі, Навагрудскі раёны) і многія іншыя прыродныя аб'екты. Турыстычная цікавасць да прыродных аб'ектаў прывяла да значнага павелічэння турыстычнай плыні, накіраванай на г. Браслаў. Увыніку чаго ў 2022 г. па замове ДУ «Нацыянальнае агенцтва

па турызме» быў распрацаваны кантрольны тэкст і тэхналагічная карта экскурсіі «Дарогай у Браслаў» [3].

Павелічэннем колькасці ўнутраных турыстаў паступова прывяло да разумення неабходнасці і запатрабаванасці адпаведнай турыстычнай інфраструктуры. Так, у 2022 г. была абсталявана бяспечная аглядная пляцоўка на крэйдавых кар'ерах пад г. Ваўкавыскам [4]. Кар'еры доўгі час карысталіся папулярнасцю ў індывідуальных і арганізаваных турыстаў, але іх наведванне да пабудовы пляцоўкі было небяспечным і забароненым.

З'явіліся новыя экскурсійна-пазнавальныя праграмы, якія спалучаюць класічныя экскурсійныя маршруты з наведваннем аграсядзіб альбо прадпрыемстваў. Напрыклад, экскурсія ў г. Пінск спалучалася з наведваннем аграсядзібы, якая спецыялізуецца на вырошчванні лаванды [1]. Экскурсія ў г. п. Мір спалучалася з наведваннем аграсядзібы, на якой гадуюць слімакоў [2].

Уплыў пандэміі вірусу COVID-19 на міжнародны і беларускі турызм патрабуе далейшага даследавання. Увядзенне новых статыстычных дадзеных у навуковы зварот дазволіць зрабіць больш поўныя і рэпрэзентатыўныя вынікі. На дадзены момант можна канстатаваць, што пандэмія прывяла да значнага скарачэння міжнароднага турызму. Гэта выклікала скарачэнне колькасці ўязных і выязных турыстаў у Рэспубліцы Беларусь. У той жа час скарачэнне колькасці ўнутраных турыстаў у 2020 г. хутка было пераадолена. Наступныя гады (2021 г., 2022 г.) паказалі значны рост унутранай турыстычнай плыні, які нават пераўзыходзіў паказчыкі 2020 г. Важна адзначыць, што рост унутранай турыстычнай плыні прывёў да абнаўлення турыстычнага прадукту. Існуючыя турыстычныя прапановы былі абноўлены, дапоўнены новымі аб'ектамі, накірункамі, што значна падвысіла іх запатрабаванасць і прывабнасць для ўнутранага турыста.

Бібліяграфічны спіс

1. Авторская экскурсия Белорусский Прованс: в поисках лаванды [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://travelagency.by/ekskursii/belorusskiy-provans-v-poiskakh-lavandy-pinsk.html. – Дата доступа: 09.09.2023.
2. Гастрономическое приключение – дегустация улиток и меда [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://travellab.by/tours/gastronomicheskoe-priklyuchenie/. – Дата доступа: 09.09.2023.
3. Перечень экскурсий на русском, белорусском и иностранных языках [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.belarustourism.by/ekskursovodam-i-gidam/perechen-kontrolnykh-tekstov-ekskursiy-na-russkom-belorusskom-i-inostrannykh-azykakh/. – Дата доступа: 07.09.2023.
4. Смотровая площадка на белорусских Мальдивах приобретает популярность [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://zviazda.by/ru/news/20230330/1680170279-smotrovaya-ploshchadka-na-belorusskih-maldivah-priobretaet-populyarnost. – Дата доступа: 08.09.2023.

5. Численность организованных посетителей [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://dataportal.belstat.gov.by/Indicators/Preview?key=223404. – Дата доступа: 07.09.2023.

6. Global and regional tourism performance [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.unwto.org/tourism-data/global-and-regional-tourism-performance. – Date of access: 24.08.2023.

7. How COVID-19 is changing the world: a statistical perspective – Volume III. [Electronic resource]. – Mode of access: https://unstats.un.org/unsd/ccsa/documents/covid19-report-ccsa_vol3.pdf. – Date of access: 23.08.2023.

УДК 94(476)

ДА ПЫТАННЯ АБ БАРАЦЬБЕ З АНТЫСАВЕЦКІМ ПАДПОЛЛЕМ НА ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ (ВЕРАСЕНЬ 1939 – ЧЭРВЕНЬ 1941)

Г. С. Хадасевіч

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,пр. Незалежнасці,4 220030,Мінск
annahadasevich@gmail.com

Пераўтварэнні, якія праходзілі на заходнебеларускіх землях у верасні 1939 – чэрвені 1941 гг., закранулі ўсе сферы жыцця грамадства. Асаблівая спецыфіка назіралася ў палітычным жыцці. На далучаных тэрыторыях пачалі актыўна фарміравацца групы і арганізацыі па аказанні супраціву новым органам кіравання. Найбольшую актыўнасць праяўлялі польскія і украінскія падпольныя фарміраванні, якія кіраваліся распараджэннямі польскага эмігранцкага ўрада на чале з генералам У. Сікорскім. У артыкуле раскрываюцца асноўныя кірункі і формы дзейнасці, рэгіёны дыслакацыі антысавецкага падпольнага супраціву. Асаблівае месца адведзена барацьбе органаў НКУС і мясцовых органаў улады супраць падпольных антысавецкіх арганізацый.

Ключавыя словы: антысавецкае падполле; заходнебеларускія землі; Заходняя Беларусь; органы НКУС; савецкія органы ўлады.

К ВОПРОСУ О БОРЬБЕ С АНТИСОВЕТСКИМ ПОДПОЛЬЕМ НА ЗАПАДНОБЕЛОРУССКИХ ЗЕМЛЯХ (СЕНТЯБРЬ 1939 – ИЮНЬ 1941)

А. С. Хадасевич

Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, Минск,
annahadasevich@gmail.com

Преобразования, которые проходили на западнобелорусских землях в сентябре1939 – июне 1941 гг., затронули все сферы жизни общества. Особая специфика наблюдалась в политической жизни. На присоединенных территориях стали активно формироваться группы и организации по оказанию сопротивления новым органам управления. Наибольшую активность проявляли польские и украинские подпольные формирования, которые руководствовались распоряжениями польского эмигрантского

правительства во главе с генералом В. Сикорским. В статье раскрываются основные направления и формы деятельности, регионы дислокации антисоветского подпольного сопротивления. Особое место отведено борьбе органов НКВД и местных органов власти против подпольных антисоветских организаций.

Ключевые слова: антисоветское подполье; западнобелорусские земли; Западная Беларусь; органы НКВД; советские органы власти.

ON THE ISSUE OF COMBATING THE ANTI-SOVIET UNDERGROUND IN THE WESTERN BELARUSIAN LANDS (SEPTEMBER 1939 – JUNE 1941)

H. S. Khadasevich

The Belarusian State University, avenue Nezavisimosty, 4, 220030, Minsk
annahadasevich@gmail.com

The transformations that took place on the western Belarusian lands in September 1939 – June 1941 affected all the spheres of the society. Special specificity was observed in the political life. In the annexed territories resistance groups and organizations against the new administration began to form actively. The most active were the Polish and Ukrainian underground formations, which were guided by the orders of the Polish which were based on the instructions of the Polish emigrant government led by General V. Sikorskiy. The article reveals the main directions and forms of activities, regions of deployment of anti-Soviet underground resistance. A special place is devoted to the actions and struggle of the NKVD and local authorities against underground anti-Soviet organizations.

Keywords: the anti-Soviet underground; the western Belarusian lands; Western Belarus; the NKVD; Soviet authorities.

Ужо ў першыя тыдні пасля прыходу савецкай улады на заходнебеларускія землі, тут пачалі актыўна фарміравацца невялікія па сваёй колькасці групы і арганізацыі, якія сваёй мэтаю ставілі супраціў новым органам кіравання. Найбольшую актыўнасць у гэтым напрамку выяўлялі польскае і ўкраінскае падполлі. Барацьбу з імі ўзначалілі савецкія службы бяспекі, найперш НКУС–НКДБ, якія з аднаго боку імкнуліся іх фізічна ліквідаваць, а з другога – паставіць пад свой кантроль і выкарыстаць у процістаянні з гітлераўскай Германіяй. Гэтае стала магчымым па двум прычынам. Па-першае, згодна з савецка-германскім пагадненнем ад 28 верасня 1939 г., краіны абавязваліся не дапускаць на сваіх тэрыторыях ніякай дзейнасці асобных груп, накіраванай на аднаўленне Польшчы, а таксама інфармаваць адзін аднаго аб падобных выпадках. Па-другое, кіруючыя цэнтры антысавецкага падполля часта знаходзіліся ў нямецкай зоне акупацыі, што давала магчымасць супрацоўнікам НКУС засылаць туды шпіёнаў.

Яшчэ ў верасні 1939 г., калі Чырвоная Армія толькі перайшла мяжу з Польшчай, у заходнебеларускіх гарадах і мястэчках з’явіліся спецыяльныя аператыўныя чэкісцкія групы (АЧГ), якія да канца кастрычніка таго ж года

займаліся пошукам і выкрыццём «контррэвалюцыйных элементаў». Уся іх дзейнасць была таемнай і рэгулявалася дырэктывамі наркама НКУС БССР Л. Цанавы. Асноўнымі задачамі гэтых структур былі арышты супрацоўнікаў польскай дэфензівы, ахова «грамадскага парадку», канфіскацыя незаконнай зброі ў насельніцтва, а таксама радыёпрыёмнікаў, розных выбуховых рэчываў і інш. Дастаткова адзначыць, што на 7 кастрычніка 1939 г. у выніку савецкіх карных аперацый было арыштавана каля 2 708 жыхароў заходніх абласцей БССР, а праз тыдзень гэтая лічба дасягнула адзнакі ў 3 535 чалавек [5, с. 199].

Узнікненне польскага падполля ў заходніх рэгіёнах БССР адносіцца да верасня–кастрычніка 1939 г. Яно падпарадкоўвалася распараджэнням польскага эміграцыйнага ўрада на чале з генералам У. Сікорскім, якое спачатку знаходзілася ў Парыжы, а з мая 1940 г. – у Лондане. Польскі супраціў развіваў сваю дзейнасць па двум напрамкам: 1) агітацыйна-масавая работа сярод мясцовага насельніцтва Заходняй Беларусі; 2) узброеная барацьба з савецкай уладай праз здзяйсненне як адзінкавых тэрарыстычных акцый, так і маштабных партызанскіх аперацый.

Для распаўсюджання сваіх ідэй лідары польскага падполля пайшлі на стварэнне ў заходнебеларускіх гарадах цэлай сеткі невялікіх па колькасці іх членаў паўстанцкіх арганізацый, кіраўнікамі якіх была мясцовая моладзь. Так, напрыклад, як паведамляў наркам БССР Л. Цанава ў дакладной запісцы на імя сакратара ЦК КП(б)Б П. Панамарэнкі, у чэрвені 1940 г. на падставе агентурных даных была выяўлена і ліквідавана ў г. Беластоку контррэвалюцыйная маладзёвая арганізацыя, якая праводзіла свае сходы ў памяшканні майстэрні Шафранскага і якая складалася ў асноўным з былых польскіх афіцэраў і вайскоўцаў. Дадзеная група атрымоўвала загады з Львова і Ломжы і будавалася па прынцыпу дзясятак, калі кожны член арганізацыі ведае толькі удзельнікаў сваёй дзясяткі [2, арк. 5–7]. Не выключэннем былі і ўстановы адукацыі (школы, гімназіі), дзе таксама часта ўзнікалі асобныя групы, якія фарміраваліся з вучняў ці гімназістаў польскага паходжання. Так, летам 1940 г. у польскай сярэдняй школе № 11 г. Баранавічы быў выяўлены гурток польскай моладзі, якім кіраваў настаўнік і па сумяшчальніцтве паручнік рэзерву польскай арміі В. Б. Сікорскі, які меў непасрэдную сувязь з мясцовым польскім падполлем і атрымоўваў ад яго загады па вярбоўцы новых членаў з ліку вучняў гэтай школы і аб набыцці зброі. Свае нелегальныя сходы група праводзіла на кватэры былога гімназіста Л. В. Грэса [2, арк. 11].

Актыўная фаза ўзброенага супроцьстаяння з савецкім рэжымам пачалася восенню 1939 г., калі 13 лістапада, па загаду генерала У. Сікорскага, быў арганізаваны «Саюз узброенай барацьбы» (СУБ), у склад якога ў студзені 1940 г. таксама ўвайшла «Служба перамозе Польшчы» (СПП), што

стала сапраўдным рэзервуарам для аб'яднання ўсіх польскіх паўстанцкіх груп [8, с. 15].

СУБ меў значную папулярнасць сярод мясцовага польскага насельніцтва заходнебеларускага краю, а таму яго колькасны склад павялічваўся. У савецкай зоне гэтай арганізацыяй кіраваў генерал М. Карашэвіч-Такаржэўскі. У 1939–1941 гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі існавала дзве буйныя акругі адміністрацыйнай адказнасці СУБ – Віленская і Беластоцкая. Структурнай часткай Віленскай акругі з'яўляўся Браслаўска-Пастаўскі інспектарат, які складаўся з Ашмянскага, Браслаўскага, Віленскага, Дзвінскага, Маладзечанскага і Пастаўскага абводаў. Беластоцкая жа акруга ўключала ў сябе тэрыторыі Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай і Пінскай абласцей БССР [7, с. 192–193].

З-за вялікага ціску з боку савецкіх чэкістаў структурныя ячэйкі СУБ зведалі значныя страты. Органам НКУС даволі хутка ўдалося выкрыць і знішчыць боль-шасць членаў дадзенай арганізацыі, аднак шмат хто з іх здолеў пазбегнуць смяротнага пакарання або высылкі ў лагеры, бо быў завербаваны і накіраваны ў нямецкую частку Польшчы для правядзення агентурных мерапрыемстваў. Асабліва цяжкі ўдар СУБ нанеслі тры вялікія дэпартацыі 1940 г., якія сур'ёзна скарацілі яго людскі патэнцыял і колькасць прыхільнікаў. У выніку такіх дзеянняў савецкіх спецслужбаў некаторыя абводы ўвогуле былі ліквідаваны, як, напрыклад, Баранавіцкі. Улічваючы такія негатыўныя працэсы і малыя перспектывы на ажыўленне тут паўстанцкага руху, кіраўніцтва СУБ было вымушана перанесці свае цэнтральныя падраздзяленні ў паўночна-усходнія рэгіёны былой Польшчы, а менавіта на Віленшчыну, дзе на той час яшчэ існавалі ўмовы для вядзення барацьбы [1, с. 289].

Шырокамаштабную і інтэнсіўную барацьбу з польскім падполлем у Заходняй Беларусі НКУС праводзіў і апрача дэпартацый. Так, напрыклад, як паведамляў Л. Цанава ў ЦК КП(б)Б у ліпені 1940 г., у Баранавіцкай вобласці была выкрыта і поўнасцю знішчана арганізацыя «Саюз польскіх патрыётаў», якой кіравалі з падпольнага штабу, размешчанага ў г. Ліда. Гэты штаб складаўся з 4 аддзелаў, у тым ліку арганізацыйна-мабілізацыйнага (кіраўнік – М. Баркоўскі), ваеннага, агітацыйна-прапагандысцкага і аддзела ўзбраенняў. Месца работы штаба неаднаразова мянялі: у лістападзе 1939 г. – гатэль «Вільня», у снежні таго ж года – гатэль «Польская». СПП займалася вярбоўкай новых членаў, правядзеннем тэрарыстычных нападаў, зборам сведчанняў шпіёнскага характару і інш. [2, арк. 36–37]. Паралельна ў гэты ж час тут была выкрыта антысавецкая група, якая мела аператыўную назву «Кулацкая тайна». Яна складалася з кулакоў, былых членаў польскіх правых партый і памешчыкаў – усяго 9 чалавек. Дадзеная група праводзіла

свае сходы на прыватнай кватэры ў І. А. Ясюкевіча, які дабравольцам пайшоў на службу ў польскае войска. Ясюкевіч заклікаў сваіх аднадумцаў праводзіць правакацыі, распаўсюджваць чуткі [2, арк. 71–74].

Адзначым, што здараліся выпадкі, калі супрацоўнікі НКУС БССР прымушалі нават некаторых вядомых польскіх дзеячоў (напрыклад, ксяндза Я. Радзівіла, прафесара К. Бартэлю) выступаць з заклікамі ў прэсе да польскага падполля аб бесперспектыўнасці змагання з савецкім ладам, аб неабходнасці прыпыніць іх канспіратыўную дзейнасць, якая нібыта шкодзіць інтарэсам палякаў [3, с. 381].

Акрамя польскага супраціву, на тэрыторыях заходніх абласцей БССР з восені 1939 г. дзейнічалі і невялікія ўзброеныя атрады, якія прадстаўлялі ўкраінскі паўстанцкі рух. Пераважна ў паўднёвых рэгіёнах рэспублікі існавалі структуры УНА – Украінскай нацыяналістычнай арганізацыі, якая тут мела свае філіялы і некаторыя члены якой нават працавалі на карысць нямецкай разведкі. Так, у кастрычніку 1939 г., як паведамлялася ў дакладной запісцы на імя П. Панамарэнкі, у г. Беластоку быў затрыманы рэзідэнт нямецкай разведкі і член УНА І. І. Маняк, які разам з польскімі бежанцамі апынуўся ў савецкай зоне адказнасці. Маняк павінен быў займацца зборам даных аб мотамеханізаваных частках Чырвонай Арміі, тыпах танкаў, іх колькасці і інш. Гэтую інфармацыю яму патрэбна было перадаць шпіёнам, якія чакалі яго на адной з чыгуначных станцый горада [6, с. 16–17]. Буйны філіял УНА знаходзіўся ў Івацэвічах, у задачы якога, паводле слоў вязня А. С. Грэчаноўскага, ўваходзіла распаўсюджванне прапагандысцкіх лістовак, а таксама падрыхтоўка і правядзенне народных паўстанняў [1, арк. 18].

Існавалі таксама і невялікія гурткі літоўскага падполля, што разгарнулі сваю дзейнасць у асноўным у памежных з Літвой раёнах Беларусі. Найбольшую актыўнасць у правядзенні антысавецкай агітацыі сярод мясцовага насельніцтва праяўляла рэлігійная арганізацыя «Святы Казімір», кіруючы цэнтр якой знаходзіўся ў Вільні. Гэтая група, хаваючы сваю афіцыйную ідэалогію за рэлігійнымі вучэннямі, сярод жыхароў літоўскага паходжання праводзіла агітацыю і збор подпісаў аб далучэнні да Літвы дадатковых раёнаў Заходняй Беларусі. Арганізацыя «Святы Казімір» была ліквідавана ў красавіку 1940 г.: было арыштавана 17 чалавек, у якіх было выяўлена 5 стрэльбаў, каля 200 патронаў, 5 гранат і інш. Непасрэдным кіраўніцтвам дадзенай арганізацыяй тут займаўся М. К. Грыгас [4, с. 106–107].

Акрамя барацьбы з антысавецкім падполлем, савецкая ўлада адразу ж пра-дэманстравала сваё негатыўнае стаўленне да рэлігійных канфесій, бо яна бачыла ў іх сваіх супернікаў, якія перашкаджалі замацаванню атэістычнай ідэалогіі на новых тэрыторыях, выражала палітычны недавер.

У больш складаным становішчы на заходнебеларускіх землях пасля верасня 1939 г. знаходзілася каталіцкае святарства. Каталіцкая царква канчаткова страціла статус адзінай дзяржаўнай рэлігіі, які раней забяспечваў ёй польскі ўрад, і па сутнасці аказалася па-за законам. Ксяндзы першапачаткова трапілі пад агентурны нагляд збоку НКУС, бо лічыліся інфарматарамі для польскага антысавецкага падполля (і не беспадстаўна) і агентамі нямецкай разведкі.

У адносінах да каталіцкіх святароў і вернікаў савецкае кіраўніцтва прымала як адміністрацыйныя захады, так і выкарыстоўвала рэпрэсіі і палітычны пераслед. Адміністрацыйныя меры ў дадзеным выпадку абмяжоўваліся, напрыклад, ліквідацыяй як фактычнай, так і юрыдычнай, рэлігійных школ, канфіскацыяй царкоўнай маёмасці, зямельных надзелаў і інш. Арышты ж ксяндзоў адбываліся даволі часта. Яны абвінавачваліся ў сувязях з польскімі паліцэйскімі структурамі, шпіянажы на карысць замежных спецслужбаў. Служыцелі рэлігійных культаў тут называліся не інакш, як «варожым, патрыятычна настроеным контррэвалюцыйным элементам», якія распаўсюджвалі ілжывыя чуткі сярод мясцовага насельніцтва і праводзілі антысавецкую агітацыю [9, с. 59].

Такім чынам, неабходна канстатаваць, што ў 1939–1941 гг. антысавецкая дзейнасць у Заходняй Беларусі не здолела дасягнуць значных памераў, сфарміраваць сур'ёзны супраціў савецкай уладзе. Подпольны паўстацкі рух атрымаў паразу, бо савецкім органам бяспекі ўдалося пераламіць сітуацыю, узяць яе пад поўны кантроль. Па сутнасці, да пачатку Вялікай Айчыннай вайны антысавецкія групы ў заходнебеларускім рэгіёне былі ліквідаваны або перайшлі да такой тактыкі дзеянняў, якія ўжо не маглі прынесці шкоду савецкаму кіраванню ў краі на карысць замежных дзяржаў. Можна адзначыць, што ў прынцыпе, пад пагрозай арышту ці затрымання аказаліся ўсе тыя асобы, якія да восені 1939 г. удзельнічалі ў грамадска-палітычным жыцці міжваеннай Польшчы і не выказвалі адкрыта падтрымку камуністычнай ідэалогіі.

Бібліяграфічны спіс

1. *Бракель, А.* Пад чырвонай зоркай і свастыкай: Баранавіччына ў 1939–1944 гг. / А. Бракель; пераклад з ням. мовы У. Папковіча; нав. рэд. М. Кароль. – Смаленск: Інбелкульт, 2018. – 486 с.

2. Докладные записки и спецсообщения НКВД БССР о раскрытии и ликвидации контрреволюционных националистических организаций в западных областях БССР, итогах работы электростанций № 1 и № 2 г. Минска за 1-е полуг. 1940 г., нарушении торговли хлебом в БССР и др.: 28 июня – 30 октября 1940 г. // НАРБ. – Ф. 4п. – Воп. 1. – Спр. 16932. – Арк. 1–358.

3. Западная Белоруссия и Западная Украина в 1939–1941 гг.: люди, события, документы: сб. науч. статей / под ред. О. В. Петровской, Е. Ю. Борисенок. – Спб.: Алетейя, 2011. – 424 с.

4. *Иоффе, Э. Г.* Лаврентий Цанава: его называли «Белорусский Берия» / Э. Г. Иоффе. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2016. – 520 с.

5. *Касцюк, М. П.* Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі / М. П. Касцюк. – Мінск: Экаперспектыва, 2000. – 307 с.

6. ОУН – УПА в Беларуси. 1939–1953 гг.: документы и материалы / сост.: В. И. Адамушко [и др.]; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск: Вышэйшая школа, 2012. – 528 с.

7. Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы міжнар. навук.-тэарэт. канф., 17–18 верас. 1999 г., Мінск / адк. рэд.: П. І. Брыгадзін, У. Ф. Ладысеў. – Мінск: БДУ, 2000. – 333 с.

8. *Снапкоўскі, У. Е.* Шлях скрозь стагоддзе: беларуска-польскія адносіны 1918–2017 гг. / У. Е. Снапкоўскі. – Мінск: БДУ, 2017. – 287 с.

9. *Ярмусик, Э. С.* Католический Костёл в Белоруссии в годы второй мировой войны (1939–1945): монография / Э. С. Ярмусик. – Гродно: ГрГУ, 2002. – 240 с.

УДК 94(476):347.6"1917/1927"

РАСПРАЦОЎКА І ПРЫНЯЦЦЕ КОДЭКСА ЗАКОНАЎ АБ ШЛЮБЕ, СЯМ'І І АПЕЦЫ БССР У 1927 ГОДЗЕ: ДА ПЫТАННЯ ПРАВАВОЙ МАДЭРНІЗАЦЫІ САВЕЦКІХ ШЛЮБНА-СЯМЕЙНЫХ АДНОСІН

В. Ю. Юркевіч

ДУ «Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь», пр-т Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск, Беларусь, yurkevichoy@gmail.com

У артыкуле праведзена гісторыка-прававое даследаванне ўплыву савецкіх прававых інстытутаў на мадэрнізацыйныя працэсы ў шлюбна-сямейных адносінах беларускага грамадства у 1920-я гады. Асаблівая ўвага надаецца распрацоўцы і прыняццю Кодэкса законаў аб шлюбе, сям'і і апецы БССР у 1927 годзе, якое выклікала актыўнае абмеркаванне пытання аб сутнасці, сацыяльным і юрыдычным значэнні шлюбу ў горадзе і вёсцы.

Ключавыя словы: Кодэкс законаў аб шлюбе, сям'і і апецы БССР; інстытут усынаўлення; мадэрнізацыя; сямейная палітыка; шлюбна-сямейныя адносіны.

РАЗРАБОТКА И ПРИНЯТИЕ КОДЕКСА ЗАКОНОВ О БРАКЕ, СЕМЬЕ И ОПЕКЕ БССР В 1927 ГОДУ: К ВОПРОСУ О ПРАВОВОЙ МОДЕРНИЗАЦИИ СОВЕТСКИХ БРАЧНО-СЕМЕЙНЫХ ОТНОШЕНИЙ

О. Ю. Юркевич

ГУ «Национальный архив Республики Беларусь», 220114, г. Минск, проспект Независимости, 116, yurkevichoy@gmail.com

В статье проводится историко-правовое исследование влияния советских правовых институтов на модернизационные процессы в брачно-семейных отношениях в белорусском обществе в 1920-е годы. Особое внимание уделено разработке и принятию

Кодекса законов о браке, семье и опеке БССР в 1927 году, которое вызвало активное обсуждение вопроса о сущности, социальном и правовом значении брака в городе и деревне.

Ключевые слова: Кодекс законов о браке, семье и опеке БССР; институт усыновления; модернизация; семейная политика; брачно-семейные отношения.

ENACTMENT OF THE CODE OF LAWS ON MARRIAGE, FAMILY AND GUARDIANESS OF THE BSSR IN 1927: ON THE ISSUE OF LEGAL MODERNIZATION OF SOVIET MARRIAGE AND FAMILY RELATIONS

V. Yurkevich

State Institution "National Archives of the Republic of Belarus", 116, Niezalieznasci Avenue, Minsk 220114, Belarus, yurkevichoy@gmail.com

The article provides a historical and legal study of the influence of Soviet legal institutions on modernization processes in marriage and family relations in Belarusian society in the 1920s. Particular attention is paid to the enactment of the Code of Laws on Marriage, Family and Guardianship of the BSSR in 1927, which caused active discussion of the issue of the essence, social and legal significance of marriage in in urban and rural areas.

Keywords: Code of Laws on Marriage, Family and Guardianship of the BSSR; adoption institute; modernization; family policy; marriage and family relations.

Вывучэнне пытанняў мадэрнізацыі і працэсаў сацыяльнай трансфармацыі ў Беларусі ў 1920-я гады займае важнае месца ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі. У вызначаны перыяд мадэрнізацыйныя пераўтварэнні закранулі ўсе бакі жыцця беларускага грамадства: яго гаспадарча-эканамічны ўклад, сацыяльную структуру, адукацыю, сістэму каштоўнасных арыентыраў, паводзіны чалавека ў працоўным калектыве, сям'і і г. д. Асобныя пытанні вывучэння мадэрнізацыйных працэсаў у 1920-гадах знайшлі адлюстраванне ў даследаваннях В. Л. Насевіча [1], С. М. Токця [2], С. М. Ходзіна [3] і інш. Разам з тым уяўляецца неабходным вызначыць таксама і тое, як паўплывала станаўленне і развіццё савецкіх прававых інстытутаў на мадэрнізацыйныя працэсы ў шлюбна-сямейных адносінах насельніцтва БССР.

Каштоўныя звесткі, якія могуць дапамагчы ў даследаванні гэтага пытання, захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Пастановы, пратаколы пасяджэнняў, цыркуляры, інструкцыі, дакладныя запіскі, перапіска і інш. дакументальныя матэрыялы партыйных і дзяржаўных устаноў адлюстроўваюць розныя тэндэнцыі развіцця савецкай сям'і як грамадскага інстытута.

Вынікам Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года з'явілася карэнная змена ўсіх бакоў жыцця краіны і грамадства. Маштабныя сацыяльна-культурныя

пераўтварэнні ў перыяд станаўлення савецкай улады прывялі да змены структуры сям'і, сістэмы сацыяльных гарантый, ролі жанчын і мужчын у грамадскай і ў прыватнай сферах. З-за імклівых сацыяльных змен пошукі новай мадэлі шлюбна-сямейных адносін праводзіліся ў вельмі складаных і супярэчлівых умовах.

У снежні 1917 года палажэннямі дэкрэтаў Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Савета Народных Камісараў (СНК) РСФСР «Аб грамадзянскім шлюбе, аб дзецях і аб вядзенні кніг актаў стану», а таксама «Аб скасаванні шлюбу» прызнавалася сапраўдным толькі грамадзянскае, свецкае афармленне сямейных адносін; устанаўлівалася безумоўнае, нічым не абмежаванае права разводу, як са згоды абодвух супругаў, так і па волі аднаго з іх; надаваліся аднолькавыя правы пазашлюбным дзецям і дзецям, народжаным у шлюбе; вядзенне кніг рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану перадавалася да органаў савецкай улады [4; 5].

З 1918 года рэгуляванне дадзеных праваадносін ажыццяўлялася Кодэксам законаў аб актах грамадзянскага стану, шлюбным, сямейным і апякунскім праве РСФСР [6], які ў нашай краіне быў уведзены праз судовую практыку, без спецыяльнай пастановы ўраду БССР [7, арк. 66]. Улічваючы, што Кодэкс законаў аб актах грамадзянскага стану, шлюбным, сямейным і апякунскім праве стаў першым савецкім кодэксам, можна адзначыць, што сфера шлюбу і сям'і аказалася менавіта той вобласцю грамадскіх адносін, на якую новая ўлада звяртала вялікую ўвагу [8, с. 8]. Выбудоўваючы новую мадэль прававога рэгулявання сямейна-шлюбных адносін, заканадаўцы зыходзілі з таго, што інстытут сям'і як аснову грамадства і дзяржавы варта захаваць, нягледзячы на тое, што выказвалася і супрацьлеглае меркаванне. У аснову новага прававога канструкта сям'і былі пакладзены наступныя асноўныя прынцыпы: заключэнне шлюбу не спараджала агульнасці маёмасці мужа і жонкі; максімальны шлюбны ўзрост адмяняўся; шлюб не накладаў на мужа і жонку абавязкі мяняць грамадзянства або месца жыхарства; усынаўленне і ўдачарэнне забараняліся і інш.

Разам з тым у сярэдзіне 1920-х гадоў станавілася відавочна, што дзейны Кодэкс не мог цалкам ахапіць усіх юрыдычных адносін, якія ўзнікалі ў выніку шлюбу. Асаблівая ўвага звярталася на нормы, якія рэгулявалі маёмасныя адносіны мужа і жонкі, бо, як адзначае А. А. Гужалоўскі, норма аб раздзельным валоданні маёмасцю прыводзіла да таго, што ў выпадку разводу цярпела беспрацоўная жанчына з дзецьмі, якая не мела правоў на маёмасць мужа, у тым ліку і набытую ім у шлюбе [9, с. 49]. Акрамя таго, шырокае распраўсюджанне атрымалі незарэгістраваныя, так званыя фактычныя шлюбы, у якіх статус жанчыны і мужчыны быў юрыдычна

няпэўным. Таксама змяніўся і погляд на дапушчальнасць інстытута ўсынаўлення, нездавальняючым прызнавалася заканадаўства аб апецы і папячыцельстве і інш.

У БССР праект уласнага Кодэкса законаў аб шлюбе, сям'і і апецы выклікаў шмат прынцыповых спрэчак. Асабліва дыскусійным аказалася пытанне аб магчымасці прызнання юрыдычнай сілы за фактычнымі шлюбамі. Да пачатку сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта (ЦВК) БССР, на якой павінна было разглядацца дадзенае пытанне, Камісія заканадаўчых прапаноў пры СНК БССР і Народны камісарыят юстыцыі (Наркамюста) БССР прадставілі ўласныя праекты Кодэкса. У абодвух праектах інстытут шлюбу разглядаўся як добраахвотны саюз дзвюх асоб рознага полу, які мае на мэце стварэнне сям'і і гаспадарчай адзінкі, пры поўнай свабодзе разводу па згодзе мужа і жонкі або патрабаванню аднаго з іх. Акрамя таго, правазнаўцы з Камісіі заканадаўчых прапаноў і Наркамюста згаджаліся ў тым, што неабходна ўсталяваць больш дакладныя нормы ў пытаннях прававых наступстваў шлюбу ў галіне маёмасных узаемаадносін, і выступалі за прызнанне ў якасці агульнай той маёмасці, якая была нажыта мужам і жонкай падчас шлюбу. Аднак Камісія заканадаўчых прапаноў у якасці асноўнага палажэння вылучыла прынцып неабавязковасці рэгістрацыі шлюбу, згодна з якім незарэгістраваны шлюб устанаўліваў б такія ж узаемаадносіны паміж мужчынай і жанчынай, як і зарэгістраваны. У сваю чаргу Наркамюст выступаў за тое, каб прававыя наступствы шлюбу маглі ажыццяўляцца выключна з моманту яго рэгістрацыі [7, арк. 67–68].

Стэнаграма пасяджэнняў 3-й сесіі ЦВК БССР VII склікання паказвае, што і сярод сябраў ЦВК не было адзінай думкі аб юрыдычных наступствах незарэгістраванага шлюбу. У прыватнасці, Дз. Ф. Жылуновіч лічыў, што фактычны шлюб «немного далек от закона», але адзначаў несур'ёзнае стаўленне некаторых грамадзян да зарэгістраванага шлюбу [7, арк. 269]. У ходзе абмеркавання выступоўцы звярталі ўвагу і на розныя адносіны да незарэгістраванага шлюбу сярод гарадскога і сельскага насельніцтва. Так, дэпутат Калінін прапанаваў наступнае рашэнне гэтага пытання: «мы сейчас в таком положении, что город действительно нуждается в фактическом браке … и было бы хорошо, если бы сессия поставила примечанием: для города фактический брак, а для деревни юридический» [7, арк. 245].

Не прыйшоўшы да адзінай высновы, Прэзідыум ЦВК БССР прыняў рашэнне вынесці праект Кодэкса на шырокае абмеркаванне сярод служачых, рабочых і сялян [10, арк. 1]. Згодна дакладу народнага камісара юстыцыі М. А. Сягаля, у Бабруйскай, Барысаўскай, Магілёўскай, Мінскай, Полацкай і Слуцкай акругах 24 гарадскія сходы выказаліся за абавязковую рэгістрацыю шлюбу, 34 сходы – за тое, каб і фактычны шлюб меў юрыдычныя наступствы. У гэтых жа акругах 398 сельскіх сходаў выказаліся за

абавязковую рэгістрацыю, 47 – за ўраўнанне фактычнага шлюбу з зарэгістраваным. Такім чынам, у вёсцы значная колькасць насельніцтва патрабавала рэгістрацыі шлюбных адносін, але была і пэўная колькасць тых, хто не лічыў рэгістрацыю шлюба абавязковай [11, с. 2; 12, с. 4].

У выніку новы Кодэкс законаў аб шлюбе, сям'і і апецы БССР быў прыняты ЦВК БССР 27 студзеня 1927 года і ўведзены ў дзеянне на тэрыторыі рэспублікі з 1 сакавіка 1927 года [13]. Кодэкс 1927 года засноўваўся на прынцыпах аднашлюбнасці, добраахвотнасці заключэння шлюбу, раўнапраўя мужа і жонкі, аховы мацярынства і дзяцінства, замацаваных яшчэ ў 1917–1918 гадах. Але ў адрозненне ад папярэдняга заканадаўства была прызнана юрыдычная сіла за шлюбамі, незарэгістраванымі ў органах загса. Адпаведна, асобы, якія знаходзіліся ў такіх незарэгістраваных адносінах, набывалі такія ж правы, як і грамадзяне, якія зарэгістравалі шлюб у органах загса. Тым не менш, дзяржава аддавала прыярытэт менавіта зарэгістраванаму шлюбу, бо ва ўсіх астатніх выпадках факт шлюбных адносін патрабавалася даказаць у судовым парадку. Акрамя таго, у Кодэксе 1927 года большае значэнне было нададзена маёмасным адносінам у сям'і: установлена супольнасць маёмасці супругаў, нажытай падчас шлюбу; пашыраны выпадкі выдачы ўтрымання супругу; рэарганізаваны інстытут апекі і больш дэтальна распрацаваны абавязкі апекуна ў адносінах да маёмасці падапечнага; падрабязна рэгламентавана пытанне аб утрыманні дзяцей і інш. Трансфармацыя сямейнага заканадаўства адбілася і на інстытуце ўсынаўлення: у арт. 72 Кодэкса законаў аб сям'і, шлюбе і апецы 1927 года ўстанаўлівалася, што ўсынаўленне дапускаецца ў адносінах да непаўналетніх дзяцей.

Асаблівы інтарэс заканадаўцаў і прававедаў да сямейна-шлюбных адносін сярод сялянскага насельніцтва меў сваім вынікам і тое, што ў Кодэксе 1927 г. было вылучана некалькі артыкулаў, якія датычыліся непасрэдна сялянскай сям'і. Гэта былі артыкулы 70 і 71 аб аліментах з сялянскага двара, увага 2 да арт. 21 аб маёмасных адносінах супругаў-працоўных землекарыстальнікаў і ўвага да арт. 72 аб усынаўленні. Такі падыход быў цалкам натуральны, бо для сучаснікаў нормы сямейнага права ў сельскай мясцовасці павінны былі адпавядаць патрэбам гаспадаркі і побытавым ўмовам таго часу. Трэба адзначыць, што пры абмеркаванні праекта Кодэкса беларускія прававеды звярталі ўвагу на тое, што маёмасныя правы членаў сялянскага двара рэгламентуюцца, перш за ўсё, адпаведнымі артыкуламі Зямельнага кодэкса БССР 1925 г.

Разам з тым у канцы 1920-х гадоў імклівыя змены ў гаспадарчым жыцці прывялі да ўзнікнення новых пытанняў, якія не былі адлюстраваны ў заканадаўчых актах і патрабавалі ўжо іншых падыходаў да разумення сямейных стасункаў.

Такім чынам, для разумення савецкай мадэрнізацыі беларускага грамадства неабходна улічваць уплыў прававых інстытутаў на пошукі новых форм сям'і як грамадскай з'явы. Савецкая мадэрнізацыя шлюбна-сямейных адносін у 1920-я гады не з'яўлялася аднароднай. Прыняцце Кодэкса законаў аб шлюбе, сям'і і апецы БССР ў 1927 годзе выклікала актыўнае абмеркаванне пытання аб сутнасці, сацыяльным і юрыдычным значэнні шлюбу ў горадзе і вёсцы. Кодэкс 1927 года насіў кампрамісны характар, бо разам з прызнаннем за фактычным шлюбам усіх юрыдычных наступстваў, утрымліваў нормы, якія рэгламентавалі інстытут дзяржаўнай рэгістрацыі шлюбных адносін. Тыя пытанні, якія заставаліся адкрытымі ў Кодэксе 1918 года, пасля прыняцця новага Кодэкса ў 1927 годзе сталі дакладна рэгуляваць дзяржавай і нормамі права.

Бібліяграфічны спіс

1. *Носевич, В. Л.* Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе. Минск : Тэхналогія, 2004. 350 с.

2. *Токць, С. М.* Беларуская вёска ў эпоху зьменаў: другая палова XIX – першая траціна XX ст. Мінск : Тэхналогія, 2007. 308 с.

3. *Ходзін, С. М.* Беларуская вёска ў міжваенны час: шляхі і формы савецкай мадэрнізацыі (1921–1939). Мінск : БДУ, 2014. 240 с.

4. О расторжении брака [Электронный ресурс] : Декрет ВЦИК и СНК РСФСР, 16 дек. 1917 г. / Электронная библиотека исторических документов. Режим доступа : http://docs.historyrussia.org/ru/nodes/348056. Дата доступа : 30.09.2023.

5. О гражданском браке, о детях и о ведении книг актов гражданского состояния [Электронный ресурс] : Декрет ВЦИК и СНК РСФСР, 18 дек. 1917 г. / Электронная библиотека исторических документов. Режим доступа : http://docs.historyrussia.org/ru/nodes/73247-dekret-vtsik-i-snk-locale-nil-o-grazhdanskom-brake-o-detyah-i-o-vedenii-knig-aktov-sostoyaniya-locale-nil-18-dekabrya-1917-g. Дата доступа : 30.09.2023.

6. Кодекс законов об актах гражданского состояния, брачном, семейном и опекунском праве [Электронный ресурс]: принят ВЦИК, 16 сент. 1918 г. / Национальная библиотека Беларуси. Режим доступа : https://vcpi.nlb.by/static/pdf/kodexy-BSSR/st_818_kodeks_zakonov_brach_cem_opekun_prave.pdf. Дата доступа : 30.09.2023.

7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 99. Воп. 2. Спр. 536.

8. *Пашенцев, Д. А.* Кодификация как инструмент конструирования системы законодательства в начальный период советского государства // Журнал российского права. 2018. № 11. С. 6–13.

9. *Гужалоўскі, А. А.* Сэксуальная рэвалюцыя ў Савецкай Беларусі ў 1920-я гг. Мінск : А. М. Янушкевіч, 2017. 257 с.

10. НАРБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 1104.

11. 4-я сессия ЦИКа БССР. Новый закон о семье и браке. Доклад наркомюста т. Сегаля // Звезда. 1927. № 21. С. 2.

12. Аб шлюбным кодэксе, сем'і і апецы. Даклад т. Сэгаля // Савецкая Беларусь. 1928. № 22. С. 4–5.

13. Кодекс законов о браке, семье и опеке [Электронный ресурс]: принят ЦИК БССР, 27 янв. 1927 г. // Национальная библиотека Беларуси. Режим доступа : https://vcpi.nlb.by/static/pdf/kodexy-BSSR/kodex-zakonov-o-brake-semje-opeke-1927.pdf. Дата доступа : 30.09.2023.

ПАДЫХОДЫ, НАПРАМКІ, МЕТАДЫ Ў ДАСЛЕДАВАННІ І ВЫКЛАДАННІ АЙЧЫННАЙ ГІСТОРЫІ НОВАГА І НАВЕЙШАГА ЧАСУ

УДК 947.6:614.84

СТАНОВЛЕНИЕ И РАЗВИТИЕ НАЦИОНАЛЬНОЙ ШКОЛЫ ПОДГОТОВКИ СПАСАТЕЛЕЙ-ПОЖАРНЫХ БЕЛАРУСИ

А. Б. Богданович[1)], **В. Н. Сергеев**[2)], **Ю. В. Каркин**[3)]

[1), 2), 3)] *Университет гражданской защиты, ул.Машиностроителей, 25, 220118, г. Минск, gumanitar@ucp.by*

В данной публикации обозначены основные этапы развития пожарно-технического образования на территории Беларуси, раскрыты некоторые характерные особенности отдельных из них. Заявленная проблематика рассматривается с опорой на системный, историко-генетический и сравнительный подходы. Проведено комплексное исследование репрезентативных источников по проблеме развития пожарно-технического образования.

Ключевые слова: подготовка пожарных-спасателей; пожарные курсы; пожарно-техническая школа; школа сержантского состава; учебный отряд; пожарно-техническое училище; командно-инженерный институт; университет гражданской защиты.

FORMATION AND DEVELOPMENT OF THE NATIONAL SCHOOL OF TRAINING FOR RESCUE FIREFIGHTERS OF BELARUS

A. B. Bogdanovich[1)], **V. N. Sergeev**[2)], **Y. V. Karkin**[3)]

[1), 2), 3)] *University of Civil Protection, 25, Mashinostroiteley street, Minsk, 220118, Belarus, gumanitar@ucp.by*

This publication outlines the main stages in the development of fire-technical education on the territory of Belarus, and reveals some of the characteristic features of individual of them. The stated problems are considered based on systemic, historical-genetic and comparative approaches. A comprehensive study of representative sources on the problem of development of fire-technical education was carried out.

Keywords: preparation of firefighters-rescuers, fire courses, fire and technical school, school of sergeants, training detachment, fire technical school, institute for command engineers, university of civil protection.

27 сентября 1933 г. на базе 2-й пожарной команды г. Минска, по ул. Аранская, 1, была открыта Пожарно-техническая школа по подготовке командного состава пожарной охраны со сроком обучения один год. Численность переменного состава составляла 30 человек. Начальником школы был назначен А. З. Козаченко [2, с. 301]. Учебное заведение готовило командный состав для пожарной охраны.

До начала Великой Отечественной войны в учебном заведении состоялось 7 выпусков. Профессиональную подготовку прошли 212 человек [1, с. 103]. В 1941 г. очередной выпуск не состоялся в связи с трагическими событиями – началом войны.

При подходе немецко-фашистских войск к г. Минску со всей пожарной техникой отступала и 7-я пожарно-техническая команда, которую в то время возглавлял Андрей Данилович Алешкевич – первый выпускник Пожарно-технической школы. Из выпускников и работников школы в г. Москве был сформирован сводный белорусский отряд пожарной охраны, в рядах которого доблестно сражались: Е. С. Алейников, М. С. Грищенко, М. И. Плешанова, Л. К. Врублевская, В. И. Езерский, С. А. Рунец, Н. П. Логовик и многие другие.

Подготовка младшего начальствующего состава пожарной охраны для БССР, Смоленской и Калининградской областей РСФСР возобновилась после освобождения г. Минска. Комплектование школы осуществлял майор А. З. Козаченко, занимавший тогда должность начальника Управления пожарной охраны НКВД БССР (УПО). Приказом НКВД БССР от 21 сентября 1944 г. № 0792 начальником школы был назначен старший техник-лейтенант А. Д. Алешкевич. Уже в следующем году была проведена очередная реорганизация Пожарно-технической школы.

Школа сержантского состава военизированной пожарной охраны НКВД/МВД БССР (1945–1948). В документах национального архива Республики Беларусь хранятся материалы, в которых приводится принцип подготовки работников для пожарной охраны: «Кадры пожарной охраны БССР формировались по двум основным каналам. Первый канал – это широкое развертывание подготовки пожарных специалистов из рабочих и крестьян в специальных средних учебных заведениях. Второй канал – это выдвижение практиков. Практики не имели специального образования, но обладали хорошими организаторскими способностями и в последствии направлялись для прохождения подготовки в пожарных школах» [5, л. 113].

В 1946 г. срок обучения был продлен до одиннадцати месяцев, а количество переменного состава увеличено до 100 человек. Школа была подчинена ОПО НКВД Минской области. На вооружении команды школы находилась одна автоцистерна ПМЗ-2 и два автонасоса ПМЗ-1.

В период с 1944 по 1948 г. Школой сержантского состава военизированной пожарной охраны НКВД/МВД БССР подготовлены 295 человек на должности командиров отделений.

Учебный отряд военизированной пожарной охраны МВД БССР (1948–1974). Школа сержантского состава военизированной пожарной охраны НКВД/МВД БССР в 1948 г. была переименована в Учебный отряд ВПО

МВД БССР. В это же время начальником Учебного отряда назначен старший техник-лейтенант А. Н. Шахворостов. Штатная численность командно-преподавательского состава и персонала составляла 82 человека.

Несмотря на активную работу МВД и правительства БССР по принятию нормативных правовых актов в области организации противопожарной защиты (за 10 лет было принято более десятка правительственных постановлений, еще больше актов приняли министерства и ведомства), должного эффекта они не давали. С позиции исследователей, основная причина заключалась в слабом ресурсном обеспечении принимаемых решений [3], в т. ч. значительной степени недоукомплектованности пожарных подразделений [6].

Подобная ситуация не могла не коснуться и деятельности Учебного отряда, переменный состав которого включался в части по охране городов и объектов [6, л. 15].

В целом же особенности функционирования Учебного отряда ВПО МВД БССР в конце 1940-х гг. можно проиллюстрировать при помощи результатов проверки сержантских школ и учебных отрядов в 1949 г.

Помимо упорядочивания деятельности Учебного отряда значительное внимание уделялось практической направленности образовательного процесса. Так, в 1950-е годы, например, комплексная учебная практика переменного состава по пожаротушению и службе включала в себя: в должности бойца – 10–12 дежурств каждым номером боевого расчета, командиром отделения – 8 дежурств (командное отделение) и по два дежурства в профотделении и помощником дежурного офицера. По службе на объекте курсанты командного отделения проходили практику в 9 отдельных военизированных пожарных командах при автозаводе. В роли постового и дозорного – по 20 дежурств, помощника инструктора по профилактике – 4 дежурства [7, л. 6–7].

С марта 1965 г. на базе Учебного отряда организована переподготовка 100 человек офицерского и сержантского состава, приписанного к спецформированиям пожарной охраны МВД БССР на случай военного времени [2, с. 305].

Разумеется, в учебном заведении уделялось внимание не только образовательному процессу, но и организации воспитательной и культурно-массовой работы. В 1950 г. на базе спортивного городка Учебного отряда были проведены первые республиканские соревнования по пожарно-прикладному спорту.

Школа подготовки младшего и среднего начальствующего состава пожарной охраны МВД БССР (1974–1984) была учреждена приказом МВД БССР от 16 декабря 1974 г. В связи с большим потоком обучающихся старое помещение, расположенное на улице Аранской, уже не могло вместить не-

